**ДУ «МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А. С. ПУШКІНА»**

# *БІБЛІЯТЭКІ МІНШЧЫНЫ*
# *Ў 2020 ГОДЗЕ:*
# *АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ*

**МІНСК**
**2021**

УДК 02
ББК 78.3(4Беі)

Бібліятэкі Міншчыны ў 2020 годзе : агляд дзейнасці / ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”. – Мінск, 2021. – 129 с.

# Змест:

**Лазарава І. П.** Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва…………………………… 4

**Анацка В. Л., Барахоўская М. В., Вярхоўская К. Д.** Змест і арганізацыя работы з чытачамі ……………….. 5

**Гіль В. М.** Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду …………………………………………… 108

**Усцінаў П.А.** Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне ……………………………………….. 110

**Несцярэнка А. Г.** Метадычная дзейнасць ……………. 124

# Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва

На 31.12.2020 г. сетку публічных бібліятэк Мінскай вобласці складаюць 442 бібліятэкі: абласная бібліятэка, 22 цэнтральныя раённыя і 1 гарадская, 418 бібліятэк-філіялаў, з іх – 41 гарадскі, 21 гарпасялковы, 356 сельскіх.

На працягу 2020 г. сетка скарацілася на 3 адзінкі. Сваю дзейнасць спынілі Рассветаўская сельская бібліятэка Клецкага раёна, Атрадненская і Пластокская сельскія бібліятэкі Любанскага раёна (рэарганізаваны ў клубы-бібліятэкі).

Інтэграцыя публічных бібліятэк ажыццяўляецца з улікам сацыякультурнай і дэмаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне. На 31.12.2020 г. на тэрыторыі Мінскай вобласці дзейнічаюць 155 інтэграваных бібліятэк, 147 з якіх знаходзяцца ў ведамаснай падпарадкаванасці Міністэрства культуры, 8 – Міністэрства адукацыі.

На 31.12.2019 г. у Мінскай вобласці налічваецца 42 бібліятэкі-клубы.

З мэтай поўнага ахопу бібліятэчным абслугоўваннем насельніцтва маланаселеных і аддаленых вёсак пры публічных бібліятэках дзейнічаюць 307 бібліятэчных пунктаў, а таксама 18 біблібусаў, якія абслугоўваюць 436 аддаленых населеных пунктаў.

У 2020 г. карыстальнікамі бібліятэк вобласці з'яўляліся 406,1 тыс. чытачоў (з улікам чытачоў абласной бібліятэкі). У бібліятэках вобласці ў цэлым назіраецца тэндэнцыя да памяншэння колькасці чытачоў: у параўнанні з 2019 г. іх колькасць паменьшылась на 32,2 тыс. чал. Працэнт ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем складае 27,6 %. Колькасць наведванняў склала па вобласці 3 940,5 тыс., што на 383,5 тыс. менш, чым ў папярэднім годзе, і на 9,6% болей у параўнанні з 2015 годам.

Кнігавыдача па вобласці склала 7 102,1 тыс. экз. дакументаў (з улікам абласной бібліятэкі), што на 829,1 тыс. экз. менш, чым у 2019 г.

У Мінскай вобласці камп'ютарызавана 442 бібліятэкі – 100 % ад агульнай колькасці. Зараз сукупная колькасць камп'ютараў складае 1 081 (з улікам абласной бібліятэкі), з якіх у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна – 109, у цэнтральных бібліятэках – 479, гарадскіх філіялах – 77, гарпасялковых – 26,

сельскіх – 390, у бібліятэках аграгарадкоў – 296. З 2018 года ўсе цэнтральныя бібліятэкі цалкам або часткова ў тэставым рэжыме перайшлі на праграмнае забеспячэнне ALISWeb.

Усяго па вобласці выхад у глабальную сетку і электронную пошту маюць 442 бібліятэкі – 100% ад агульнай колькасці.

Уласныя сайты маюць 35 бібліятэк Мінскай вобласці: абласная бібліятэка, цэнтральныя – 23, дзіцячыя – 3, гарпасялковыя – 1, сельскія – 7.

У мінулым годзе публічныя бібліятэкі вобласці працягвалі дзейнасць па аказанні дадатковых платных паслуг насельніцтву. У сярэднім па вобласці аказваецца каля 30 відаў паслуг. Самымі запатрабаванымі платнымі паслугамі застаюцца выдача дакументаў з камерцыйнага фонду і чытальнай залы, ксеракапіраванне, раздрукоўка і сканіраванне.

# Змест і арганізацыя работы з чытачамі

## Прававое выхаванне

На працягу года бібліятэкі вобласці праводзілі мэтанакіраваную работу сярод сваіх карыстальнікаў у дапамогу прававому выхаванню. Бібліятэкі прадастаўлялі доступ да прававой і сацыяльна-значнай інфармацыі насельніцтву, распаўсюджвалі прававыя веды.

У Барысаўскім раёне працавалі над рэалізацыяй праекта па фарміраванні прававой культуры насельніцтва “Библиотека. Общество. Право”.

У Нясвіжскам раёне былі арганізаваны і праведзены мерапрыемствы рознай накіраванасці, а таксама разгорнутыя кніжныя і інфармацыйныя выставы і тэматычныя паліцы ў рамках праекта “Защити себя сам”. Праца праекта раскрывалася праз такія пытанні, як правы і абавязкі непаўналетніх, веданне сімволікі і Канстытуцыі РБ, выбары прэзідэнта РБ, святочныя даты, тэма падлеткавага суіцыду, ільготы для розных катэгорый грамадзян, прававая адказнасць.

У Салігорскім раёне дзейнічае праект “Молодежь. Закон. Право”. Мэта праекта – фарміраванне прававой культуры маладога пакалення, выхаванне інфармацыйна-прававой культуры асобы, можа пра гэта ведаць свае правы і абавязкі.

З дапамогай выставы-прэзентацыі “Права семьи – забота государства” наведвальнікі Фаніпальскай гарадской бібліятэкі Дзяржынскага раёна пазнаёміліся з прававой абаронай сям’і і шлюбу, аховай мацярынства, бацькоўства і дзяцінства ў Рэспубліцы Беларусь, абароны ад псіхалагічнага і фізічнага насілля ў сям’і, атрымалі інфармацыю аб магчымасцях нашай праваахоўнай сістэмы ў вырашэнні праблем, якія ўзнікаюць у сям’і, і аб нарматыўна-прававых актах, якія рэгулююць сямейныя адносіны. У рамках мерапрыемства дэманстраваліся сацыяльныя ролікі.

Падчас інфарміны “Лепш ведаць, чым дагадвацца” ў Сямкоўскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна школьнікі даведаліся пра “Канвенцыю аб правах дзіцяці” і закон Рэспублікі Беларусь “Аб правах дзіцяці”. На прыкладах казачных герояў пазнаёміліся з галоўнымі артыкуламі прадстаўленых дакументаў, кнігамі А.Усачова, Ф.Махава, удзельнічалі ў віктарыне “Правы літаратурных герояў”.

Бібліятэкары ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” арганізавалі і правялі раённы інтэрнэт-конкурс “ВО!круг детского права”, мэтай якога было фарміраванне высокай правасвядомасці і прававой культуры ў дзяцей і падлеткаў праз развіццё асабістых навыкаў сродкамі творчых здольнасцяў. Конкурс праводзіўся ў наступных намінацыях: конкурс малюнкаў “В мире твоих прав” для дзяцей з 9 да 16 гадоў і конкурс сямейных работ “За право всей семьёй” на лепшы агіт-постэр. Для падвядзення вынікаў у фае бібліятэкі прайшла выстава творчых работ усіх удзельнікаў. Кампетэнтнае журы выбрала пераможцаў, якія атрымалі каштоўныя прызы і падарункі.

У сельскай бібліятэцы в. Краснае Маладзечанскага раёна прайшла пазнавальная праграма “Свои права хотим мы знать”. Прысутныя пазнаёміліся з дзіцячымі мастацкімі кнігамі ў якіх разглядаюцца прававыя сітуацыі. Затым на мерапрыемства завітала натарыус з Натарыяльная кантора Маладзечанскага раёну № 3. Т.А. Сцефаненка і правяла гутарку аб правах дзіцяці. Вучні старэйшых класаў Аляхновіцкай школы прынялі актыўны ўдзел у мерапрыемстве “Права ребенка в современной Беларуси”, падрыхтаваным сельскай бібліятэкай аг. Аляхновічы Маладзечанская раёна. Дзеці выконвалі самыя розныя заданні па прававой тэме: разгадвалі крыжаванкі, рэбусы, раглядвалі прыклады

са школьнага жыцця. Да мерапрыемства была аформлена выстава “Подросток и закон”.

Крупіцкая інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна запрасіла на размову “Государство на защите прав ребенка”, якая была падрыхтавана да Сусветнага дня правоў дзіцяці. Бібліятэкар расказала чытачам сярэдняга ўзросту аб тым, як іх правы абараняюцца ў нашай краіне. Пaглядзелі ўрыўкі з літаратурных твораў, дзе расказваецца аб правах дзяцей і цікавыя мультфільмы па гэтай тэматыцы.

Для рэалізацыі даступнасці бясплатнага юрыдычнага кансультавання грамадзян ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы” прадставіла дыстанцыйнае кансультаванне пры дапамозе спецыяльнай рубрыкі “Правовой меридиан”, якая дзейнічае ў рамках праекта “Защити себя сам”. Яна ўключае ў сябе супрацоўніцтва бібліятэкі, рэдакцыі раённай газеты “Нясвіжскія навіны”, юрыдычнай кансультацыі Нясвіжскага раёна, суда Нясвіжскага раёна і натарыяльнай канторы Нясвіжскага раёна. На абанементах установы размешчаны пункты збору пытанняў, якія паступаюць ад чытачоў і падаюцца на разгляд удзельнікам праекта. Азнаёміцца з адказамі на пытанні можна ў раённай газеце “Нясвіжскія навіны” ў спецыяльнай рубрыцы “Правовой меридиан” і таксама на афіцыйным сайце газеты.

Таксама былі праведзены: вечар пытанняў і адказаў “Прававы багаж пенсіянера”, выхаваўчая гадзіна “Я грамадзянін Рэспублікі Беларусь” (Валожынскі раён); электронная прэзентацыя “Писатели против коррупции” (Капыльскі раён); круглы стол “Падлетак. Правапарушэнні. Адказнасць”, інфармацыйна-прававая гадзіна “Працоўнае права і непаўналетнія” (Крупскі раён); відэапрэзентацыя “Падарожжа па краіне Правазнаўства”, азбука права “Пра правы і свабоды цікава і проста”, віртуальная выстава “Безумие – путь к преступлению” (Лагойскі раён); гадзіна прававых ведаў “Права сказочных героев”, тыдзень прававых ведаў “З правам па жыцці” (Любанскі раён); квэст-гульня “Путешествие в страну правовых знаний”, інфармацыйная гадзіна “Всемирный день книги и авторского права”, прававая гульня “Маленьким человечкам большие права”, гадзіна праблемных пытанняў “Уроки права – уроки жизни”, інфармацыйная гадзіна “Право – доступное для всех” (Маладзечанскі раён); урок прававых ведаў “Мы жывём пад аховай закона”, прававы мерыдыян “Ведай свае права – будзь абароненым”

(Мядзельскі раён); юрыдычны дыялог "Правовые проблемы, прававы брэйн-рынг "Магистры юстиции", аўкцыён знаўцаў права "Все ли ты знаешь о своих правах", інтэрактыўны занятак "Профилактика подросткового булинга", прававая гадзіна "Правила личной безопасности", гадзіна зносін "За что ставят на учет в милицию", прафілактычная гутарка "От безответственности до преступления один шаг" (Старадарожскі раён) і інш.

У Дзень правоў чалавека ў Лясноўскай сельскай бібліятэцы Капыльскага раёна адбыўся агляд літаратуры па прававому выхаванню "Прававы калейдаскоп", падчас якога прысутныя пазнаёміліся з прававой літаратурай з фонду бібліятэкі і электроннай інфармацыйна-пошукавай сістэмай "Эталон" НЦПІ Рэспублікі Беларусь.

З мэтай павышэння прававой культуры насельніцтва бібліятэкары Лагойскай дзіцячай бібліятэкі арганізавалі відэапрэзентацыю "Прававы лікбез", у ходзе якой паведамілі школьнікам пра правы чалавека, пазнаёмілі з артыкуламі "Усеагульнай Дэкларацыі праў чалавека".

3 сакавіка ў Алесінскай сельскай бібліятэцы Смалявіцкага раёна прайшла прававая гадзіна на тэму "Правы і абавязкі непаўналетніх". У ходзе заняткаў дзеці пазнаёміліся з асноўнымі артыкуламі "Канвенцыі аб правах дзіцяці", замацавалі матэрыял гульнёй "Адгадай казачнага персанажа, які парушыў правы казачных герояў". Таксама, падчас мерапрыемства, было разгледжана пытанне аб абавязках, што дало магчымасць дзецям зразумець тое неабходнае правіла – "Правы трэба ведаць, а абавязкі выконваць".

Былі праведзены таксама: прававая гульня "Кто придумал права человека?", актуальная размова "Знаете ли вы свои права?" (Клецкі раён); інфармацыйна-пазнавальная гадзіна "Ведай свае правы", прававая гадзіна "Свае правы павінен ведаць кожны" (Крупскі раён); гадзіна прававой асветы "Правы свае ведай, абавязкі не забывай", прававая інфарміна "Азбука маіх правоў", гадзіна прававой пісьменнасці "З пункту гледжання закона" (Лагойскі раён); гадзіна прававых ведаў "Школьнікам аб правах чалавека", гадзіна роздуму "Ад праблем да мэты" (Мядзельскі раён); прававая хвілінка "Мы і нашы правы", інфармацыйная хвілінка "Кожны чалавек мае права", агляд літаратуры "Ведай свае правы і абавязкі", кансультацыя "Пытанні абароны правоў чалавека" (Пухавіцкі раён); юрыдычны занятак "Вашы правы і абавязкі", прававы лікбез "Выбірай

ПРАВАсвядомы шлях”, час прававых ведаў “Пра правы і свабоды цікава і проста” (Слуцкі раён) і інш.

Бібліятэкі прымалі актыўны ўдзел ў міжведамаснай прафілактычнай акцыя “Дружим с законом!” у рамках комплекснага плана мерапрыемстваў па прафілактыцы безнагляднасці, правапарушэнняў непаўналетніх, абароне правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх. Пад асаблівай увагай бібліятэкараў дзеці з так званай “групы рызыкі”. У рамках маніторына па рабоце з непаўналетнімі, якія стаяць на розных відах уліку, рабіўся аналіз банка данных занятасці непаўналетніх у вольны час.

Падчас акцыі і на працягу года ў Капыльскай дзіцячай бібліятэцы прайшоў шэраг мерапрыемстваў, на якіх былі абазначаны не толькі правы, якія маюць дзеці і падлеткі, але і іх абавязкі. Літаратурны парад “Закон о правах ребёнка в сказках” прайшоў для выхаванцаў ДУА “СПЦ Капыльскага раёна”, падчас якога дзеці актыўна працавалі з выставай, якая складалася з двух частак. У першай частцы “Твои права – твои обязанности” галоўнай дзеючай асобай быў бібліятэкар. А вось другую частку выставы пад назвай “В сказках тонкий есть намёк – поищи, друг, между строк” афармлялі самі дзеці, тымі казкамі, якія, на іх погляд, адпавядалі тым ці іншым іх правам ці абавязкам.

Заастравецкая сельская бібліятэка Клецкага раёна запрасіла дзяцей на хвіліну бяспечнасці “У цэнтры ўвагі – дзеці!”. Участковы інспектар капітан міліцыі Андрэй Аляксандравіч Мацейка, які прысутнічаў на сустрэчы, нагадаў дзецям правілы паводзін на дарозе, пра абавязковае нашэнне святлоадбівальных элементаў, правілы паводзін у грамадскіх месцах, выкарыстанне ненарматыўнай лексікі, паважлівыя адносіны да старэйшых, а таксама пра зберагание чысціні вуліц.

У сельскай інтэграванай бібліятэцы аг. Гранічы Маладзечанскага раёна прайшла сустрэча з участковым інспектарам міліцыі, накіраваная на прафілактыку і папярэджанне правапарушэнняў сярод непаўналетніх “Правонарушения. Правила общения”. А. Дз. Трайковіч распавёў не толькі пра законы, але і прыводзіў прыклады таго, якое пакаранне прысуджаецца за ўчыненыя правапарушэнні. У гутарцы асвятляліся пытанні аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці непаўналетніх. Падлеткам было растлумачана, з якога ўзросту наступае крымінальная адказнасць і якія пакаранні прымяняюцца за ўчыненне

злачынстваў. Таксама ўчастковы закрануў пытанні паводзін дзяцей у грамадскіх месцах, паважлівага і карэктнага стаўлення да настаўнікаў, дарослых і аднагодкаў. Сустрэча атрымалася не толькі пазнавальнай, але і вельмі карыснай.

Актуальны дыялог “Формула тваёй бяспекі” праведзены аддзелам па рабоце з дзецьмі ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы” з удзелам начальніка інспекцыі па справах непаўналетніх У. В Іванісеней. Уладзімір Віктаравіч распавёў вучням аб правапарушэннях сярод непаўналетніх у раёне, аб мерах пакарання, якое прадугледжвае правапарушэнне, адказаў на пытанні па дадзенай тэме, замацавалі веды аб асноўных пытаннях адказнасці непаўналетніх за правапарушэнні і злачынствы. Сустрэча суправаджалася дэманстрацыяй відэаролікаў, сюжэтаў, накіраваных на фарміраванне прававой культуры навучэнцаў, на засваенне правіл паводзін у грамадскіх месцах, на прафілактыку п'янства, ужывання псіхатропных рэчываў, прывіццю духоўных і маральных каштоўнасцяў.

У Блонскай сельскай бібліятэцы Пухавіцкага раёна рэгулярна праводзіліся гутаркі “Прафілактыка правапарушэнняў непаўналетніх”, падчас якіх бібліятэкар расказвала пра тое, якія правапарушэнні звычайна здзяйсняюць непаўналетнія і якія наступствы яны могуць пацягнуць за сабой, распавядала бацькам як папярэдзіць трапленне падлетка пад уплыў экстрэмісцкай групы. Пасля гутарак наведвальнікі атрымлівалі памяткі па прафілактыцы правапарушэнняў і экстрэмізму сярод падлеткаў.

У вобласці ў рамках акцыя “Дружим с законом!” прайшлі: гадзіна прававой асветы “Культура безопасности”, гульнявая праграма “Правила дорожного движения” (Барысаўскі раён); гульнёвая праграма “Хто з законам сябруе – жыве, не бядуе”, трыбуна правамерных паводзінаў “На варце – закон”, агіт-кампанія “Не ўкрадзі!”, урок маралі “Чужое ўзяў – сваё зламаў” (Бярэзінскі раён); гутарка з участковым інспектарам “Падлетак і закон” (Валожынскі раён); прававая інтэлектуальная гульня “Закон и ты”, інтэлектуальная гульня “На страже потребителя”, гутарка-дыялог “Па лабірынтах права”, гадзіна роздуму “Жестокость и насилие” (Вілейскі раён); інфармацыйная гадзіна “Закон на абароне вашых правоў”, тэматычная дыскатэка “Ведаць закон, адказваць перад законам”, гадзіна праблемнай размовы “Сённяшнія праблемы маладых (Крупскі раён); інфармацыйная гадзіна “Падлетак і закон”

(Лагойскі раён); гадзіна абмеркавання “Дарослае жыццё – дарослая адказнасць”, круглы стол “Аб адказнасці непаўналетніх”, прававая гадзіна “Закон обо мне и мне о законе”, дыспут “Мараль і закон” (Мінскі раён); відэапрагляд “Дзецям аб мэтах устойлівага развіцця”, прававы мерыдыян “Ведай свае правы – будзь абаронены” (Мядзельскі раён); дыялогавая пляцоўка “Тебе дано право выбора”, сустрэча з участковым інспектарам па справах непаўналетніх “Я в ответе за свои поступки” (Салігорскі раён); прававая гадзіна “Подросток и закон: изучать, знать, соблюдать”, турнір знаўцаў права “Знаете ли вы Закон?”, прафілактычная гутарка “Подросток. Правонарушение и ответственность”, гадзіна права “Счастье твоё Закон бережёт” (Старадарожскі раён); урок-медыяпрагляд “Права на жыццё”, гадзіна прававой інфармацыі “Мир прав”, гадзіна права “Мы в ответе за свои поступки” (Узденскі раён).

Штогод у другую нядзелю мая ў нашай краіне адзначаецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. З нагоды свята супрацоўнікі ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” у чытальнай зале правялі інфармацыйную гадзіну “Наша сімволіка”. У праграме мерапрыемства: мультымедыйная прэзентацыя аб гісторыі ўзнікнення сімвалаў Рэспублікі Беларусь, кніжная выстава і агляд каля выставы “Дзяржаўныя сімвалы краіны”.

Для вучняў старэйшых класаў у Гасцілавіцкай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна быў арганізаваны патрыятычны калейдаскоп “Герб і Сцяг беларускай дзяржавы – сімвалы годнасці і славы”. Мэтай мерапрыемтва стала: садзейнічанне засваенню школьнікамі асноўных ведаў аб Дзяржаўным сцягу і гербе Рэспублікі Беларусь; спрыянне выхаванню паважлівага станаўлення да сваёй дзяржавы; фарміраванне актыўнай пазіцыі падрастаючага пакалення да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь.

Прайшлі таксама, наступныя мерапрыемствы: пазнавальны дыялог “Символы моей страны”, адкрыты прагляд кніг “Государственная символика Республики Беларусь” (Барысаўскі раён); гутарка “Спасцігаючы сімвалы”, гадзіна сімволікі “Нязгасныя сімвалы”, урок пазнання “У гэтых сімвалах гонар і слава”, пазнавальная інфарміна “Мой Герб, мой Сцяг, мая Беларусь” (Лагойскі раён); гутарка-віктарына “Ці ведаеш ты сімвалы нашай дзяржавы?”, гадзіна радзімазнаўства “Гісторыя краіны – гісторыя сімвалаў”, бліц-інфармацыя “Тры сімвалы Беларусі”, урок

радзімазнаўства "Герб і сцяг маёй краіны", віктарына "Сімвалы Радзімы", інфармацыйная гадзіна "Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь" (Любанскі раён); інфармацыйная гадзіна "Сімволіка Дзяржавы – сімволіка народа", відэаэкскурсія "Пад знакам слаўным Беларускай дзяржавы", гадзіна грамадзянскай культуры "Символы моего государства", гістарычны экскурс "Сімвалы Беларусі – вехі гісторыі" (Мінскі раён); інтэлектуальная гутарка "Сімвалы краіны маёй" (Мядзельскі раён); інфарміна "Галоўныя сімвалы свабоды", пазнавальна-гульнёвая праграма "З чаго пачынаецца Радзіма" (Пухавіцкі раён); віртуальная гістарычная гадзіна "Наш герб и наш флаг – это символы свободы", гадзіна патрыятызма "Символы надежды и добра", гістарычная гадзіна "Флаг государства – символ славы", інфармацыйная гадзіна "Символы мира, надежды и добра", інфарміна "Символика Республики Беларусь – герб, флаг, гимн" (Старадарожскі раён) і інш.

Асноўнаму Закону грамадства і дзяржавы – Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у 2020 годзе споўнілася 26 гадоў. Гэтай значнай даты ў бібліятэках Міншчыны былі прысвечаны многія мерапрыемствы.

У гарадской бібліятэцы № 1 г. Барысава прайшоў прававы эрудыт "Конституция – гарант белорусской государственности". Навучэнцы УА "Барысаўскі дзяржаўны каледж" пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення і развіцця канстытуцыйнага права ў нашай краіне, са структурай Канстытуцыі. Хлопцы абмеркавалі значэнне Канстытуцыі для дзяржавы ў цэлым і для кожнага грамадзяніна ў прыватнасці, а таксама прынялі ўдзел у прававой віктарыне "Я и моя Конституция", падчас якой пашырылі свае веды аб канстытуцыйных правах і абавязках грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Была падрыхтавана інфарміна "Конституция – символ эпохи". На мерапрыемства былі запрошаны вучні 7 класа ДУА "Сярэдняя школа №1 г. Валожына". Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання чытачоў і інфармацыі ДУ "Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка" расказалі гісторыю стварэння Канстытуцыі, яе структуру і назву раздзелаў. Пасля гутаркі з дзецьмі была праведзена віктарына "Знаешь ли ты Конституцию?", якая дапамагла замацаваць новыя веды юнакам.

Гатаўская сельская бібліятэка-клуб Мінскага раёна запрасіла сваіх чытачоў на грамадзянскі форум "Слова за слова". Падлеткам расказалі пра гісторыю стварэння Канстытуцыі, пазнаёмілі

з яе структурай. Ад бібліятэкараў школьнікі даведаліся, якія правы і свабоды чалавека і грамадзяніна гарантаваны Канстытуцыяй, якія існуюць абавязкі.

На працягу года ў бібліятэках для розных катэгорый карыстальнікаў праведзена мноства мерапрыемстваў: гутарка-дыялог “Конституция – гарант белорусской государственности”, кніжная выстава “Закон, по которому мы живём”, кніжная выстава “Главный закон жизни нашей страны” (Барысаўскі раён); выстава “Я чалавек, па-гэтаму – права маю” (Валожынскі раён); урок грамадзяніна “Закон для ўсіх і кожнага”, інфарміна “Познакомьтесь: закон законов!”, урок грамадзянскасці “Сверяем жизнь по Конституции”, гадзіна прававой інфармацыі “Закон, па якому жыве краіна”, экспрэс-віктарына “Галоўны закон нашага жыцця” (Вілейскі раён); інфармацыйны дайжэст “Сверяем жизнь по Конституции”, выстава-прагляд “15 марта – День Конституции Республики Беларусь”, выстава-агляд “История Конституции – история страны” (Дзяржынскі раён); круглы стол “Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь –аснова дынамічнага развіцця”(Крупскі раён); інфармацыйная гадзіна “Канстытуцыя – гарант беларускай дзяржаўнасці”, гутарка-дыялог “Вандроўка ў краіну законаў”(Лагойскі раён); бібліятэчны мультыпраект “Канстытуцыя год за годам”, інфарміна “Канстытуцыя – аснова прававой сістэмы”, прававы лікбез “Звернемся да Канстытуцыі”, круглы стол “Канстытуцыя. Чалавек. Дзяржава” (Любанскі раён); гадзіна прававых ведаў “Конституция и государственная символика Республики Беларусь”, урок ведаў “Аб тым, што важна: да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь” , інфармацыйная гадзіна “Канстытуцыя – прававая аснова беларускай дзяржавы” (Маладзечанскі раён); гульня-знаёмства “Конституция моей страны”, гадзіна прававых ведаў “Канстытуцыя-асноўны закон” (Мінскі раён); інфармацыйная гадзіна “Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь: стабільнасць, згода, прагрэс”, гадзіна інфармацыі “Вывучаючы асноўны закон нашай краіны” (Мядзельскі раён); інфармацыйная гадзіна “Наш свет – нашы правы”, прававы прастор “Звернемся да Канстытуцыі”, дзень прававой інфармацыі “Закон на абароне нашых правоў” (Пухавіцкі раён); інфармацыйная гадзіна “Закон по которому нам жить”, гадзіна права “Фундамент стабильности”, прававы турнір “Што вы ведаеце аб Канстытуцыі”, прававая гульня

“В библиотеку за правом”, інфарміна “Конституция – основа развития общества и государства” (Старадарожскі раён).

У жніўні ў Рэспубліцы Беларусь прайшла важная палітычная падзея – выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Бібліятэкі Міншчыны актыўна ўключыліся ў інфармацыйную падтрымку выбарчай кампаніі.

У жніўні, напярэдадні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” прайшоў адкрыты дыялог пакаленняў “За Беларусь”, на якім былі абмеркаваны актуальныя пытанні, што хвалююць маладое пакаленне беларусаў. Асноўнымі тэмамі абмеркавання сталі: моладзь на сяле, сучасныя інтэрнэт-рэсурсы для моладзі і выбарчая кампанія. У мерапрыемстве прынялі ўдзел першы сакратар Мінскага абласнога камітэта БРСМ Кірыл Шык, намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Яўген Скарабагаты, старшыня Дзяржынскага раённага савета ветэранаў Віктар Феактыстаў і тыя, хто не абыякавы да будучыні сваёй краіны. На адкрытым дыялозе можна было падыскутаваць па розных праблемных пытаннях і паспрабаваць знайсці шляхі іх вырашэння, прапанаваць свае новыя ідэі.

У ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” і Заслаўскай гарадской бібліятэцы Мінскага раёна прайшла прававая гульня пад назвай “Школа маладога выбаршчыка”. Удзельнікамі мерапрыемства сталі будучыя выбаршчыкі, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту.

У Свірскай пасялковай бібліятэцы Мядзельскага раёна была аформлена кніжная выстава “Выбары прэзідэнта: крок за крокам”, якая дзейнічала з мая па жнівень 2020 г. уключна да Дня Выбараў. На працягу гэтага часу кніжная выстава папаўнялася матэрыяламі выбарчай кампаніі з перыёдыкі і з сайта Мядзельскага раённага выканаўчага камітэта.

У ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” сумесна з Салігорскай раённай грамадскай арганізацыяй Рэспубліканскага аб'яднання “Белая Русь” адбыўся круглы стол “Выборы-2020” з удзелам дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Струнеўскім Андрэем Мікалаевічам.

Таксама былі арганізаваны: цыкл кніжных выстаў “Беларусь выбирает” (Барысаўскі раён); агіт-акцыя сярод маладых

выбаршчыкаў “За гонар лічы – прыйсці на выбары!”, ушанаванне галасуючых упершыню “З Днём нараджэння, выбаршчык” (Бярэзінскі раён); святочная праграма “Беларусь – мая Радзіма”, тэматычная паліца “Насустрач выбарам” (Валожынскі раён); практыкум для галасуючых упершыню “Молодежь выбирает будущее”, размова для моладзі “Галасуем упершыню”, пазнавальная гадзіна “Да ўвагі выбаршчыкаў” (Вілейскі раён); выстаўка-прэзентацыя “Квітней, Беларусь!”, гадзіна прававой інфармацыі “Азбука права”, турнір знаўцаў права “Избирательный всеобуч” (Клецкі раён); дзелавая гульня для маладых выбаршчыкаў “Выбаршчык новага стагоддзя” (Лагойскі раён); актуальныя дыялогі “Наш выбар – наш лёс”, інфармацыйнае бюро “Перадвыбарчы марафон”, прававы трэнінг “Твой голос важен”, гадзіна інфармацыі “Выбары – справа ўсеагульная”, экспрэс-інфармацыя “Выбары на старонках прэсы”, круглы стол “Будучыня дзяржавы за выбарам моладзі” (Любанскі раён); школа маладога выбаршчыка “Выборы Президента – стабильное развитие Беларуси”, гутарка-экскурс “Зачем молодежи выборы”, гадзіна прававой інфармацыі “Молодежь эпохи выборов, или Кто делает историю Беларуси?”, інфарміна “Мы выбираем будущее своей страны”, інфармацыйная гадзіна “Твоя жизнь – твой выбор” (Мінскі раён) і інш.

## Экалагічнае выхаванне

Экалагічная асвета і адукацыя – неад’емная частка маральнага выхавання асобы з ранняга дзяцінства і на працягу ўсяго жыцця. Таму бібліятэкі Міншчыны праводзяць цікавую і мэтанакіраваную работу па экалагічнай асвеце разнастайных катэгорый наведвальнікаў бібліяэк.

У ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” на працягу справаздачнага года вяла працу па экалагічнай інфармацыі і адукацыі насельніцтва. Работа праводзілася ў рамках мэтавай праграмы “Бібліятэка і экалогія”. Вялася праца па фарміраванні ў насельніцтва экалагічнай свядомасці, выхаванні і прывіцці беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя, пачуцця адказнасці за лёс прыроды. З гэтай мэтай праводзілася работа па камплектаванні фонда па экалогіі, у тым ліку медыярэсурсамі, падпіскай на перыядычныя выданні экалагічнай тэматыкі, правядзеннем разнастайных мерапрыемстваў і выстаў.

Бібліятэкі Вілейскага раёна вядуць пленную працу па папулярызацыі кніг аб прыродзе і ахове навакольнага асяроддзя з мэтай фарміравання экалагічнай свядомасці насельніцтва, выхавання экалагічнай культуры ў рамках праграмы “Захаваем наваколле разам”. Сэнсам і зместам яго стала раскрыццё важнасці экалагічных праблем, якія датычацца кожнага з нас. Асаблівая ўвага ў бібліятэках раёна надаецца раскрыццю кніжнага фонду, дакументаў і матэрыялаў экалагічнай накіраванасці. Кнігі і перыядычныя выданні прыродазнаўчай тэматыкі былі прадстаўлены на кніжна-ілюстрацыйнай выставах.

ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” зладзіла інфармацыйны інтэрнэт-праект “Экономия – забота каждого”, у відэаматэрыялах якога расказвалася аб энергаэфектыўных тэхналогіях, аб спосабах энергазберажэння дома, у грамадскіх месцах, на працы, аб узнаўляемых крыніцах энергіі. Праект дзейнічае на бібліятэчным сайце бібліятэкі (http://villib.by/index.php/2020/09/08/dni-energii20201-iyunya-15-sentyabrya/).

Крупская сельская бібліотека Крупскага раёна працуе па рэалізацыі доўгатэрміновай мэтавай рэгіянальнай праграмы “Любіць і аберагаць непаўторнае хараство”, афармлены экалагічны куток пад аналагічнай назвай. У рамках экалагічнай праграмы праводзіліся акцыі, экскурсіі, віктарыны, экалагічныя падарожжы.

Інфармацыйнае забеспячэнне экалагічнай асветы з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці бібліятэк. Бібліятэкі Мінскага раёна праводзяць цікавую работу па фарміраванні ў насельніцтва экалагічнай свядомасці, выхаванні і прывіцці беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя. Паслядоўны характар экалагічнай адукацыі забяспечвае доўгатэрміновая рэгіянальная мэтавая праграма “Экалогія. Бібліятэка. Чалавек”.

У мэтах фарміравання ў падрастаючага пакалення экалагічнай культуры, беражлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя Мядзельская раённая дзіцячая бібліятэка працавала ў рамках мэтавай праграмы “Наш экадом – Мядзельшчына” (2016-2020 гг.). У ходзе яе рэалізацыі дзеці маглі папоўніць свае веды, пазнаёміцца з сучаснымі з’явамі пра шматграннасць жывой прыроды, пашырыць веды пра жывёльны і раслінны свет. Рэалізацыя экалагічнай праграмы садзейнічала пошуку новых форм работы, якія

ўзмацняюць эмацыйнае ўздзеянне, паколькі спалучаюць у сабе праблемы аховы прыроды, мастацтва і кнігу.

У 2020 годзе працягвалася работа ў рамках шырокамаштабнага праекта “Пухавіцкі край, адходы раздзяляй”, афармляліся экалагічныя куткі, ладзіліся гутаркі: “Сартуючы адходы, захоўваем прыроду”, “Мар’іна Горка – чысты горад”, “Давязі да кантэйнера” і інш.

Бібліятэкі Старадарожскага раёна праводзяць цікавую работу па фарміраванні ў насельніцтва экалагічнай свядомасці, выхаванні і прывіцці беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя. Сістэматычнасць працы ў гэтым накірунку забяспечваюць мэтавыя праграмы: “Жить в согласии с природой” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Открой для себя мир природы” (Старадарожская раённая дзіцячая бібліятэка), “Мир вокруг нас” (Горкаўская сельская бібліятэка).

Вішнявецкая сельская бібліятэка Стаўбцоўскага раёна працуе па мэтавай праграме па экалагічнаму выхаванню насельніцтва “Прырода – наш дом”. У межах гэтай праграмы для дзяцей было праведзена завочнае падарожжа “Блакітныя вочы Радзімы”, мэтай якога было даць уяўленне пра прыгажосць рэк Беларусі, якія тысячамі блакітных ніцей перацінаюць нашу Беларусь, ажыццяўляюць і аздабляюць воблік беларускага краю.

У бібліятэках Міншчыны првводзяць шмат мерапрыестваў экалагічнай тэматыкі.

У Івянецкай гарпасялковай бібліятэцы Валожынскага раёна прайшло інфармацыйнае рэфю “Наша планета – наша здароўе”. Удзельнікі разгледзелі праблему смецця з гістарычнага боку, прааналізавалі становішча “смеццевай праблемы” ў свеце на сучным этапе, шляхі барацьбы з ёй. Потым пагаварылі аб становішчы гэтай экалагічнай праблемы ў Беларусі і нашай мясцовасці. Удзельнікі выказалі свае меркаванні, што могуць зрабіць менавіта яны і іншыя жыхары пасёлка каб наша жыццё стала больш чыстым.

Дзень экалогіі “Жизнь на земле в руках живущих”, які прайшоў у Фаніпальскай гарадской бібліятэцы Дзяржынскага раёна адкрыў дзверы ў свет раслін. Бібліятэкары паведамілі пра тое, як з глыбокай старажытнасці людзі ведалі пра гаючыя ўласцівасці раслін, спасцігалі іх і перадавалі назапашаныя веды з пакалення ў пакаленне. Госці даведаліся шмат новага пра лекавыя расліны, якія растуць не толькі ў лесе, на палях і лугах нашай краіны, але і нават каля свайго двара можна знайсці вельмі шмат карысных раслін.

У канцы мерапрыемства госці пазнаёміліся з выставай “Расліны, якія нас лечаць”. На выставе была прадстаўлена літаратура аб лекавых раслінах, аб фітатэрапіі (травалячэнні). Пра тое, калі лепш за ўсё збіраць Іван-чай крапіву і трыпутнік, сушыць лісце парэчкі і маліны, а гэтак жа, як з дапамогай гэтых і іншых траў паправіць сваё здароўе, падоўжыць прыгажосць і маладосць, чытачы бібліятэкі маглі даведацца, скарыстаўшыся прадстаўленымі на выставе даведнікамі, энцыклапедыямі, кнігамі, брашурамі і часопісамі.

У рамках акцыі “Бібліяноч – 2020” у памяшканні Маладзечанскага гарадскога філіяла № 1прайшоў квэст “У лабірынтах легенд і паданняў”. Памяшканне бібліятэкі ператварылася ў запаведнае балота, чароўны лес і зачараванае возера з натуральным пахам сапраўднага моху, сасновых і яловых шышак, восеньскай лістоты і камышу. Удзельнікаў квэсту чакалі міфічныя і казачныя персанажы, каверзныя конкурсы і выпрабаванні, у якіх яны павінны былі праявіць свае веды аб прыродзе.

У Мачулішчанскай пасялковай бібліятэцы Мінскага раёна прайшла размова “Эканомім святло, цяпло і ваду – мы захоўваем прыроду”. Падчас размовы дзеці даведаліся, што такое энергія і энергазберажэнне, якія віды энергіі існуюць на зямлі, для чаго неабходна энергія, як беражліва расходаваць энергію і яшчэ шмат цікавага і займальнага. Дзеці дружна і актыўна разгадвалі электракрыжаванку, адказвалі на пытанні віктарыны і тэстаў. Бібліятэкары расказалі, як трэба ставіцца да электраэнергіі і далі некалькі парад па энергазберажэнню.

Гарадзейская гарпасялковая бібліятэка Несвіжскага раёна правяла сярод юных чытачоў літаратурныя баі да Сусветнага дня эколага “У природы есть друзья – это ты и это я!”. На працягу мерапрыемства дзве каманды школьнікаў знаёміліся з кнігамі і часопісамі па ахове прыроды. З твораў вядомых пісьменнікаў абагульнялі ўяўленне аб стане навакольнага свету ў наш час, паўтаралі правілы сяброў прыроды, удзельнічалі ў конкурсе загадак, у віктарыне “замарочкі з бочкі”. У заканчэнні мерапрыемства быў падведзены вынік: сябар прыроды – гэта той чалавек, які любіць і захапляецца прыроднай прыгажосцю. Сябар павінен быць добрым да жывёл, абаронцам ўсяго жывога, беражліва адносіцца да прыродных рэсурсаў. Да мерапрыемства была падрыхтавана выстава “Помоги природе, человек!”, мэтай якой было прыцягненне ўвагі школьнікаў да праблем захавання навакольнага асяроддзя

Прыгажосці і разнастайнасці прыроды быў прысвечаны сеткавы фотаконкурс "Флора" запрашае ў сетку", арганізаваны старшынёй клуба "Флора" Кацярынай Вавілавай ДУК "Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка". Конкурс стаў сапраўды міжнародным, удзел у ім прынялі кветкаводы з Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, Швецыі, Балгарыі, Украіны. Да 95-годдзя выхаду часопіса "Хозяин" удзельнікі клуба правялі онлайн-сустрэчу і асвоілі новы спосаб камунікацыі – клубны вайбер-чат "Флора-online".

Прапагандзе экалагічных ведаў дапамагаюць наступныя мерапрыемствы: экалагічная гульня-віктарына "Я и мир вокруг" (Барысаўскі раён); відэапрэзентацыя "Экалагічная культура. Што гэта?", экалагічны ўрок "Пазнаць, любіць і ахоўваць", экалагічная віктарына "Беражыце зямлю, беражыце!", дзень экалогіі "Мы не госці на планеце" (Капыльскі раён); відэакруіз "Чалавек і прырода", аукцыён экалагічных ведаў "Усё аб экалогіі" (Клецкі раён); фота-выстава "І дрэва, і трава, і ягада, і кветка"; гульня – віктарына "Парушана гармонія ў прыродзе: дапамажы прыродзе чалавек"; акцыя "Ачысцім планету ад смецця", вечар-рэквіем "Чалавек. Прырода. Жыццё", час экалогіі "Прыроды мудрыя парады", літаратурная вандроўка "Знаёмы і незнаёмы свет прыроды", экалагічны час "Наш агульны дом – прырода", гульнёвая праграмма "Эка-падыход да жыцця" і слайд – падарожжа "Экалагічная кругасветка", экалагічны час "Прырода просіць дапамогі" (Крупскі раён); інфарміна "З тысячы планет, Зямлі выдатней няма" (Лагойскі раён); размова "Браты нашы меншыя. Зімоўе", пазнавальная гадзіна "Мы ў адказе за тых, каго прыручылі", выстава-разважанне "Как все взаимосвязано в природе" (Мінскі раён); экалагічны турнір "У прыроды ў гасцях", эстафета экалагічных ведаў "Лагічна жыць экалагічна" і інтэлектуальная гульня "Скажи мне кто твой друг?" (Мядзельскі раён); гадзіна экалагічных ведаў "Экология – предмет. Интересно или нет?", экалагічная трыбуна "Калі вам па душы прыгажосць Зямлі", час экалогіі "Мусор – дело серьезное" (Старадарожскі раён); экалагічны вернісаж "Кветкі ўпрыгожаць наша жыццё" экалагічны урок "Быць сябрам прыроды – што гэта азначае" (Чэрвеньскі раён).

Гутарка ля экалагічнай паліцы "Спастись и выжить" да Сусветнага дня навакольнага асяроддзя дапамагла чытачам Негарэльскай сельскай бібліятэкі Дзяржынскага раёна даведацца аб праблемах экалогіі, узаемадзеянні раслін і жывёл, іх карысці для

чалавека; пра тое, як ўжываюцца жывёлы і расліны на гэтай вялікай планеце. На паліцы былі прадстаўлены кнігі па экалогіі, жывёльнаму і раслінnаму свету, а таксама Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь.

У чытальнай зале Пухавіцкай раённай дзіцячай бібліятэкі ў межах рэкламнай акцыі “Даведайся пра навакольны свет” была арганізована выстава “Свет прыроды”. Каб пашырыць уяўленне чытачоў аб навакольным свеце, выхаваць уважлівае стаўленне да прыроды ўдзельнікам аматарскіх аб’яднанняў бібліятэкі “Чароўны куфэрак”, “Вясёлая карусель”, “Непаседа” прапаноўваліся літаратурна-пазнавальныя гадзіны “Лясное падарожжа з Мікалаем Сладковым”, “Мяккія лапкі, а на лапках царапкі”, экалагічнае падарожжа “Па лясных сцяжынках з Эдуардам Шымам”, слайд-віктарына “Добрыя казкі Генадзя Цыферава”. Дзеці прымалі актыўны ўдзел у конкурсах на кемлівасць і ў гульнях, якія для іх падрыхтавалі бібліятэкары.

У гарадской бібліятэцы-філіял №1 г. Слуцка быў падрыхтаваны марафон цікавых фактаў “Дзіўны свет кітоў і дэльфінаў”. У ходзе мерапрыемства юныя ўдзельнікі пазнаёміліся з кнігамі з серыі “Я познаю мир”, з энцыклапедыямі “Хочешь знать почему?”, “Обо всём на свете”, “Энциклопедия эрудита”, з казкай Рэд'ярда Кіплінга “Откуда у кита такая глотка”, вершамі Барыса Захадэра, апавяданнямі з кніг Святаслава Сахарнова і Мікалая Сладкова пра жыхароў воднай стыхіі. Прысутныя адказалі на пытанні віктарыны “Загадкавы свет кітоў і дэльфінаў”. Мерапрыемства суправаджалася дакументальным фільмам пра падводнае жыццё дэльфінаў і кітоў.

Тэма аховы навакольнага асяроддзя разглядалася на наступных мерапрыемствах: экалагічны круіз “Дапамажы прыродзе, чалавек!” (Капыльскі раён); урок ведаў у свеце лекавых раслін “Травінка-вітамінка”, экалагічны рэпартаж “На сонечнай поляночке”, экалагічны калаж “Абаронім навакольнае асяроддзе!”, прагляд літаратуры “Дзіўныя і загадкавыя” (Лагойскі раён); гадзіна цікавых паведамленняў “Прырода – дом, у якім мы жывём”, пазнавальная гульня “Які выдатны гэты свет, паглядзі”, цікавыя паведамленні “Гэта зямля твая і мая”, конкурс загадак “Загадки о природе”, экавіктарына “Цветочная полянка”, урок экалагічнай этыкі “У госці да лета. Як паводзіць сябе на прыродзе”, эка-віктарына “Сохраним природу!”, экалагічны дэсант “Чыстая вёска” (Любанскі раён); экалагічная размова “Если не ты, то кто же”, экалагічная экспедыцыя “Беларуская прырода – вядомая, нечаканая і неверагодная” (Мінскі

раён); эка-турнір “Я чалавек і я за ўсё адказны”, экалагічнае падарожжа “Я з кнігай адкрываю цэлы свет”, экалагічная гадзіна “Жыві у згодзе з прыродай”, гадзіна цікавага паведамлення “Кветкавы калейдаскоп” (Пухавіцкі раён).

Штогод у свеце адзначаецца Міжнародны Дзень Зямлі. У сувязі з гэтай падзеяй, з мэтай пазнаёміць з экалагічнымі праблемамі, выхаваць пачуццё адказнасці за лёс жывой прыроды, у бібліятэках праводзяцца розныя мерапрыемствы. Бібліятэкар Гасцілавіцкай сельскай бібліятэкі Лагойскага раёна цікава арганізавала і правяла гадзіну экалогіі “Зямлянам – чыстую планету”, на якой дзеці даведаліся пра гісторыю ўзнікнення свята – Міжнароднага Дня Зямлі, пра жывёл і расліны, якія насяляюць нашу зямлю.

У Соснаўскай сельскай бібліятэцы, ф. №38 Любанскага раёна з дзецьмі была праведзена экалагічная віктарына “Беражыце Зямлю, беражыце!”. Пад час мерапрыемства бібліятэкар расказала дзецям пра прыгажосць нашай планеты, пра праблемы, якія стаяць перад людзьмі, як захаваць прыроду, а значыць і сваё жыццё на Зямлі.

У Грыцкевіцкай інтэграванай сельскай бібліятэцы Нясвіжскага раёна была праведзена экалагічная пазнавальная гульня “Разноцветная земля Беларуси”. Удзельнікі гульні правялі віртуальнае падарожжа па адметных мясцінах Беларусі, уразіліся непаўторнай прыгажосцю роднага краю. Для вучняў сярэдніх класаў быў праведзены брэйнстромінг (мазгавая атака) “Экологическая грамматика”. Удзельнікі мерапрыемства пашырылі свае веды аб навакольным свеце, аб разнастайнасці і карысці раслін, а таксама аб неабходнасці аховы жывёльнага свету нашай Радзімы

Дню Зямлі таксама былі прысвечаны: эрудыт-круіз “День Земли – именины планеты”, інфарміна “Ад чыстай вёскі – да зялёнай планеты” (Вілейскі раён); працоўны дэсант “Посади дерево”, экалагічная выстава-калаж “Мир природы в литературе”, эка-выстава-кліч “Сохраним землю голубой и зелёной” (Капыльскі раён); экалагічная замалёўка “Сіні колер Зямлі”, кніжная выстава “Літаратурная сцяжынка ў свет дзіўнай прыроды” (Лагойскі раён); WEB-экскурсія “Прыгажосць беларускіх краявідаў”, экавіктарына “На ўсіх адна планета па імені Зямля”, экалагічны ўрок “Без шкоды для прыроды”, гадзіна экалагічных ведаў “Тайны роднай прыроды” (Любанскі раён); агляд літаратуры “Беражыце зямлю”, гутарка-папераджанне “Час збіраць... смецце”, гадзіна Зямлі па кнізе У. Ягоўдзіка “І быў на небе знак” (Пухавіцкі раён).

У гарадской бібліятэцы № 1 г. Барысава прайшла сустрэча-інтэрв'ю “Леса – лёгкие нашей планеты”. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел вучні 10 класа ДУА “Сярэдняя школа №9 г. Барысава” і госць сустрэчы, інжынер па ахове і абароне лесу Барысаўскага доследнага лясгаса Валасач Іван Мікалаевіч. Спецыяліст распавёў аб самым вялікім нацыянальным багацці Беларусі, пра тое, што лес нас корміць, апранае, саграевае і лечыць, але лес мае патрэбу ў абароне, ахове і аднаўленні. Падлеткі даведаліся аб экалагічных праблемах лесу, прыродаахоўных мерапрыемствах і абмеркавалі правілы бяспечных паводзін у лесе. Бібліятэкар Наталля Шабека правяла агляд літаратуры, прадстаўленай на кніжнай выставе “Спатканне з лесам”. На заканчэнне сустрэчы хлопцы пазнаёміліся з паветраным назіральнікам лясной гаспадаркі – матылём і задачамі, якія ён выконвае. Усе прысутныя ахвотна згадзіліся прыняць удзел у акцыі “Чысты лес”.

Да Дня працаўнікоў лясной гаспадаркі ў парку каля Камунараўскай сельскай бібліятэкі Любанскага раёна прайшла пазнавальная гульня-віктарына “Деревья Беларуси”. Атрымаўшы фотаздымкі дрэў з іх апісаннем, дзеці рыхтаваліся і адказвалі на пытанні бібліятэкара. Шмат цікавага пачулі ўдзельнікі пра дрэвы нашых лясоў, яны слухалі лясныя легенды, знаёміліся з лекавымі ўласцівасцямі дрэў, адгадвалі загадкі.

Таксама прайшлі наступнымя мерапрыемсты: экалагічны турнір “Загадки в лесу на каждом шагу” (Барысаўскі раён); інфарм-дайджэст “Дрэвы беларускіх лясоў” (Бярэзінскі раён); літаратурны конкурс “Лес – наша багацце” (Клецкі раён); дыспут “Чалавек у лесе: сябр ці вораг?”, экалагічная прагулка “Я іду па лесу” (Крупскі раён); вусны часопіс “Лясы нашай Радзімы”, ролевая гульня “Как звери лес спасали”, тэматычная гутарка “Лес – узор гармоніі суіснавання”, дыялог-загадка “Вялікія і малыя лясныя жыхары”, завочнае падарожжа “І дрэва, і трава, і ягада, і кветка” (Любанскі раён); экалагічная вандроўка “Лес – наряд нашей планеты” (Нясвіжскі раён).

Для навучэнцаў ДУА “Маладзечанская санаторная школа-інтэрнат” і УА “Маладзечанскі гандлёва-эканамічны каледж” супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” правялі мерапрыемствы пад назвай “Запаведны

куточак зямлі”, прысвечаны найстарэйшаму запаведніку ў Еўропе – Белавежскай пушчы.

Да Сусветнага дня запаведнікаў і нацыянальных паркаў праведзены: завочнае падарожжа “Заповедный край-Беловежская пуща”, завочнае падарожжа “В краю нетронутой природы”, экалагічнае падарожжа “Волшебство нетронутой природы”, пазнавальны гадзіну “Запаведнымі сцяжынкамі беларускай прырода”, віртуальнае падарожжа “Заповедные места Беларуси”, віртуальны экалагічны ваяж “Тайны заповедного леса” (Барысаўскі раён); тэматычны вечар “Запаведны свет прыроды” (Крупскі раён); інфармацыйная гадзіна “Национальные парки и заповедники Беларуси” (Салігорскі раён); экалагічная гадзіна “Заповедной тропой Миншчины”, экалагічны рэпартаж “Заповедники – жемчужины природы” (Смалявіцкі раён).

30 студзеня ДПУ “Бярэзінскі біясферны запаведнік2 адзначыў 95 гадовы юбілей. Юбілей запаведніка не застаўся па-за ўвагай супрацоўнікаў бібліятэк.

У агульнай чытальнай зале ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” прайшла слайд-гутарка “Мир заповедной природы”. У ходзе сустрэчы бібліятэкар залы распавяла грамадзянам аддзялення дзённага знаходжання ТЦСАН аб вядомых нацыянальных парках і запаведніках, пра мэты іх стварэння і звязаных з імі цікавых фактах. Завяршылася мерапрыемства праглядам фільмаў “Нацыянальныя паркі свету” і “Чарнобыль. Запаведнік будучыні”.

У Навасвержанскай сельскай бібліятэцы Стаўбцоўскага раёна да 95 – годдзя з дня стварэння Бярэзінскага біясфернага запаведніка прайшла інтэлектуальна-пазнавальная гульня “Свет птушак”, у ходзе якой дзеці пазнаёміліся з разнастайнымі відамі птушак, з іх рэдкімі відамі.

Гатаўская сельская бібліятэка Мінскага раёна запрасіла сваіх чытачоў прыняць ўдзел у экалагічнай эстафеце дабра “Покормите птиц зимой, подарите им тепло”. Пачалося мерапрыемства з маляўнічага відэаролiка, які дапамог дзецям не толькі даведацца, але і ўбачыць, хто з жывёл і як зімуе, якія запасы на зіму падрыхтаваў. Якія птушкі зімуюць на радзіме, школьнікі ўзгадвалі ў гульнях “Звонкія загадкі” і “Даведайся птушку”. Чым можна і чым нельга карміць нашых птушак сяброў і як зрабіць кармушкі сваімі рукамі дапамагла разабрацца гульня “Птушыная сталовая”.

Мерапрыемства прайшло весела, цікава, пашырыла пазнання дзяцей пра жывёл і птушак.

Нарацкая пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна ў рамках праекта “Выхаваць кнігалюба” запрасіла выхаванцаў дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці на экалагічны экскурс “Крылатая дружына”. Дзеці даведаліся з эцыклапедычных выданняў пра птушку года – глушца, а таксама лебедзя-шыпуна. Атрымалі карысную інфармацыю пра паводзіны птушак, пачулі беларускія легенды і паданні пра пярнатых, падзяліліся сваім вопытам, як яны дапамагаюць птушкам перазімаваць, майструюць для іх кармушкі, падкармліваюць у зімнюю пару года. Асабліва зацікавіла дзяцей і настаўнікаў экалагічная замалёўка “Лебедзь белакрылы”. Бібліятэкар расказала прысутным пра навукова-папулярнае выданне “Дзіцячы атлас Беларусі. Птушкі”. На старонках кнігі можна знайсці шмат цікавай інфармацыі пра паходжанне птушак, таксама ёсць звесткі пра лебедзя-шыпуна. Мясцовы аматар-краявед С.У.Чапурко правёў майстар-клас “Распраў лебедзю крылы”.

Кожны год грамадская арганізацыя “Ахова птушак Бацькаўшчыны” выбірае птушку года, каб прыцягнуць увагу людзей да дзікіх птушак Беларусі, іх праблемаў і неабходнасці захавання тых месцаў, дзе яны жывуць. У 2020 годзе птушкай года стаў глушэц. Для наведвальнікаў Пухавіцкай раённай дзіцячай бібліятэкі прайшла пазнавальная гадзіна “Птушка-дамасед”. У ходзе мерапрыемства бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з яго звычкамі. Юныя чытачы даведаліся шмат цікавага пра гэтую птушку.

Да Сусветнага дня птушак былі праведзены: мультымедыйная прэзентацыя “Пернатые самоцветы” (Валожынскі раён); экалагічны дэсант “Мир пернатых и зверей ждёт поддержки от друзей”, віктарына “Пернатый народец”, гутаркі “Птушкі – нашы сябры” (Капыльскі раён); паэтычная гадзіна “Птиц поздравляем, стихи читаем” (Клецкі раён); экалагічны конкурс “Хто лепш за ўсіх выводзіць трэлі”, экалагічная хвіліна “Птушкам хлеба дробку, ды любові трошкі” (Лагойскі раён); экалагічная акцыя “У госці да пярнатых сяброў”, экалагічная акцыя “Дапаможам птушкам”, інфармгадзіна “Чароўны свет птушак”, пазнавальна-забаўляльны ўрок “Пернатые друзья, гульня-віктарына “Птушыныя сакрэты”, пазнавальна-гульнёвая праграма “Птушыныя галасы” (Любанскі раён); конкурсна-гульнёвая праграма “Прекрасный мир птиц”, віктарына “Крылатый почтальон и пернатый чемпион”

(Маладзечанскі раён); пазнавальная размова “Встречай любовью стаи птичьи” (Нясвіжскі раён); віктарына “Свет птушак”, віктарына “У госці да сяброў птушак”, экалагічная гадзіна “З песняй птушынай ажывае неба”, поле цудаў “Птушыныя галасы”, экалагічны турнір “Птичьему пенью внимаем с волненьем”, пазнавальная гадзіна “Адкрыем для сябе дзіўны свет птушак” (Пухавіцкі раён).

З нагоды Сусветнага дня водна-балотных абшараў у Сямкоўскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна прайшла экспрэс-інфарміна “Скарбы балотнага царства”. Падчас мерапрыемства вядучыя расказалі дзецям аб утварэнні балот, іх гаспадарчай і навуковай каштоўнасці і неабходнасці іх аховы.

Блонскай сельскай бібліятэцы Пухавіцкага раёна для школьнікаў была арганізавана інфармхвілінка “Таямнічы свет балот”, прысвечаная Сусветнаму дню водна-балотных абшараў. На мерапрыемстве распавядалася пра роль балот у жыцці планеты; адзначаліся віды балот, якія сустракаюцца на тэрыторыі нашай краіны. Акрамя гэтага прысутнныя даведаліся пра раслінны і жывельны свет балот. Таксама былі прадэманстравана літаратура з фонду бібліятэкі, у якой змяшчаецца інфармацыя пра флору і фауну балот.

Да Сусветнага дня водна-балотных абшараў і Сусветнага дня водных рэсурсаў быў падрыхтаваны: экалагічны дайджэст “Беларускія балоты – багацце нашай краіны”, экаінфармацыя “Вода чудесный дар природный” (Бярэзінскі раён); экаінфарміна “Сінявокія жамчужыны Беларусі” (Валожынскі раён); бібліяквэст “Прыгоды на балоце”, экалагічнае падарожжа “Беларускія балоты – багацце нашай краіны”, эколага-пазнавальная гульня “Какой прок от болот?” (Клецкі раён); інфарм-дасье “Дзіўны свет балот”, пазнавальная гадзіна “Яе Вялікасць вада”, інфармацыйная гадзіна “Вада ў нашым жыцці”, віктарына “Знаўцам рэк” (Лагойскі раён); пазнавальная экалагічная гадзіна “Беларускія балоты – багацце нашай краіны”, час краязнаўства “Балота. Забалаць балот…”, інфармацыйная гадзіна “Вода, вода – кругом вода!”, завочнае падарожжа “Беларускі водны шлях”, пазнавальна-экалагічная гадзіна “Беларускія балоты – лёгкія Еўропы” (Любанскі раён); свята вады “Вада ў жыцці чалавека” (Маладзечанскі раён); вусны часопіс “В капле воды отражается мир” (Мядзельскі раён); пазнавальна-экалагічная гадзіна “Балоты – багацце нашага краю”, відэападарожжа “Беларусь мая сінявокая”, віктарына “Цудоўны свет

вады”, экалагічная гутарка “Вада... ты ёсць жыццё”, гадзіна цікавых паведамленняў “Зберажом ваду – захаваем жыццё” (Пухавіцкі раён).

“Жыццё пасля Чарнобыля” – пад такой назвай прайшло мерапрыемства ў Багданаўскай сельскай бібліятэцы Валожынскага раёна, прысвечанае 34-й гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Бібліятэкар распавяла вучням аб катастрофе на Чарнобыльскай АЭС, аб сучасным стане зоны адчужэння і людзях, якія знаходзяцца там сёння, аб Палескім дзяржаўным радыяцыйна-экалагічным запаведніку.

У дзень Чарнобыльскай трагедыі ў Заслаўскай гарадской бібліятэцы Мінскага раёна з удзелам вучняў старэйшых класаў СШ № 2 адбылася прэзентацыя “Воспоминания о Чернобыльской катастрофе”. Мэта мерапрыемства: захаванне памяці і культурнай спадчыны жыхароў Беларусі, пацярпелых ад катастроф на ЧАЭС. Да мерапрыемства была аформлена выстава “Чарнобыльская трагедыя”, якая прапанавала дзецям фотаздымкі першых герояў-пажарных, загінуўшых пры ліквідацыі пажара на ЧАЭС, кнігі і часопісы.

Тэме Чарнобыльскай АЭС былі прысвечаны: гадзіна смутку “Чарнобыль – наш боль”, гутарка-агляд “Чарнобыль – боль маёй краіны” (Валожынскі раён); экалагічны урок “Боль застанецца назаўсёды”; бібліятэчная гадзіна “Звон жалобны над краем” (Вілейскі раён); урок смутку “Чарнобыльская малітва. Хроніка будучыні”, гадзіна-рэквіем “Была та боль и правду чёрной”, урок памяці “Чарнобыльскую вясну не забудзем ніколі” (Дзяржынскі раён); літаратурны набат “Трагедыя Чарнобыля” (Капыльскі раён); вусны журнал “Вечное эхо Чернобыля”, літаратурная хвіліна “Чарнобыль у беларускай паэзіі”, тэматычны вечар “Чарнобыльскае рэха”, віртуальная выстава “Чарнобыль – колакал бяды” (Крупскі раён); прэсс-агляд “Чарнобыль сёння – турызм, радыяцыя, людзі”, віртуальная выстава “Чарнобыль – наша памяць і боль”, інфармацыйная гадзіна “Трагедыя без тэрміну даўнасці. Чарнобыль”, дзень памяці Чарнобыльскай трагедыі “Чарнобыль – вечны неспакой”, час памяці “Урокі Чарнобыля”, літаратурная гадзіна “Чарнобыль у памяці нашай” (Лагойскі раён); урок-рэквіем “Цень крыла Чарнобыльскай бяды”, экаінфарміна “Зямля, параненая Чарнобылем”, экспрэс-інфармацыя “Чарнобыль – боль, які спальвае сэрца”, гадзіна смутку “Чарнобыль – чорны боль”, урок смутку “Чарнобыль – хроніка трагедыі”, слайд-прэзентацыя “Чарнобыль –

рана на сэрцы Еўропы” (Любанскі раён); экалагічная гадзіна “Чарнобыль: трагедыя, подзвіг, папярэджанне”, экалагічная інфарміна “Чарнобыля спрадвечны лёс”, рэпартаж-агляд “Чарнобыль у нашай памяці” (Маладзечанскі раён); дзень памяці “Пад попелам Чарнобыля”, дзень памяці і перасцярогі “Колокола времен”, гадзіна смутку “Чарнобыль – боль які спальвае сэрца” гадзіна развагі “Вечнае рэха Чарнобыля” (Мінскі раён); літаратурная вечарына “Пакуль Чарнобыль у душу глядзіць”, гадзіна смутку “Чарнобыль у нашай памяці”, гадзіна памяці “Чарнобыльскія шрамы на сэрцы Беларусі” (Мядзельскі раён); відэасалон “Чарнобыльскія джунглі. Прырода без чалавека”, літаратурны час “Чернобыль. Боль, которая сжигает сердце”, час адкрытага дыялогу “Боль Чарнобыля” (Пухавіцкі раён); відэаўрок “Чернобыль: как это было”, слайд-прэзентацыя “Чернобыль: легенда, быль, событие” (Жодзіна).

Клубная дзейнасць адзін з важных напрамкаў дзейнасі бібліятэк. Экалагічнае выхаванне – прыярытэтны кірунак дзейнасці Багушэвіцкай бібліятэкі-клуба Бярэзінскага раёна. Пры бібліятэцы працуе экалагічны клуб “Беразавічок”. На працягу справаздачнага года практыкаваліся прэзентацыі эка-экспазіцыі “Ахоўваць прыроду – значыць любіць радзіму” з рубрыкамі “Чароўны свет прыроды”, “Прырода дорыць здароўе”, “Вось дык птушка”, “Гэтыя забаўныя жывёлы”, “Жывая вада”, “7 цудаў Бярэзіншчыны” і прыкніжнымі карткамі цікавай інфармацыі . Сфарміраваны дасье “Праблемы экалогіі ў перыядычным друку”, “Экалагічны пашпарт раёна”.

Асноўныя формы работы Лясноўскай сельскай бібліятэкі Капыльскага раёна: эка-ўрокі, эка-гадзіны, выставы, гульнявыя праграмы, вандроўкі і экалагічныя экскурсіі, відэа-прэзентацыі, а таксама масава-відовішчныя мерапрыемствы экалагічнай тэматыкі. Асноўная выхаваўчая і асветніцкая праца бібліятэкі па экалогіі праводзіцца ў рамках экалагічнага клуба “Лесавічок” і клуба дапытлівых “Почемучки”. Так як бібліятэка па экалагічнай асвеце насельніцтва імкнулася ахапіць ўсе ўзроставыя групы: дзеці, падлеткі, моладзь, дарослыя чытачы, то адкрыццё пры бібліятэцы фітабара, стала добрым падспор’ем у рабоце бібліятэкі па экалагічнаму накірунку.

Цімкавіцкая сельская бібліятэка Капыльскага раёна таксама рыхтуе і праводзіць мерапрыемствы па прапагандзе экалагічнага выхавання ў рамках клуба “Бярозка”.

Працягвалі сваю творчую дзейнасць аматарскія аб'яднанні экалагічнай тэматыкі Клецкага раёна: літаратурна-экалагічны клуб "Фларыда" (Заастравецкая сельская бібліятэка) і клуб "Лесавічок" (Сякерыцкая сельская бібліятэка). Тэмы і формы пасяджэнняў клуба самыя разнастайныя. Галоўнае, што аматары прыроды з вялікім энтузіязмам прымаюць удзел у іх падрыхтоўцы і правядзенні. Яны ўмеюць паспрачацца, актыўна паўдзельнічаць у конкурсах, віктарынах, майстар-класах.

Пры Крупскай сельскай бібліятэка Крупскага раёна сумесна са школай і лясгасам працуе гурток "Лесавічок".

Працягваў сваю дзейнасць аматарскі клуб экалагічнага напрамку "Жаўраначак" пры Гасцілавіцкай сельская бібліятэкі Лагойскага раёна. Другі год пры Лагойскай дзіцячай бібліятэцы паспяхова працуе дзіцячы літаратурна-экалагічны клуб "Геалёнак".

У бібліятэках Мінскага раёна працуюць клубы аматараў прыроды, сярод іх: "Крынічка" ДУ "Мінская раённая цэнтральная бібліятэка", "Аука" сельскай бібліятэкі а/г Лясны, "Росинка" Ратамская сельская бібліятэка, "Раслінка" Вішнёўская інтэграваная сельская бібліятэка, "Пчелка" Юзуфоўская інтэграваная сельская бібліятэка.

На працягу года прывіваць дзецям экалагічную культуру дапамагалі клубы аматараў прыроды, якія дзейнічаюць пры бібліятэках Мядзельскага раёна. У форме пазнавальных гадзін, урокаў-падарожжаў, пазнавальных віктарын, паходаў, гульняў праходзяць пасяджэнні клуба "Лесавічок" пры Пузыроўскай сельскай бібліятэцы-доме вольнага часу. Баярская сельская бібліятэка-дом вольнага часу запрашае ўсіх аматараў-кветкаводаў, агароднікаў і садаводаў на пасяджэнні клуба "Флора". Працягвае работу ў гэтым напрамку клуб аматараў-кветкаводаў "Лотас" у Свірскай пасялковай бібліятэцы.

У рамках экалагічнага клуба "Росинка" Сноўскай сельскай бібліятэкі Нясвіжскага раёна на працягу года былі праведзены наступныя мерапрыемствы: экалагічны урок "Здравствуй, удивительный мир", гульня-падарожжа "Маленькие чудеса большой природы", гульнявая экалагічная праграма "Мир прекрасный, мир живой".

"Школа экалагічных ведаў" і "Клуб аматараў прыроды" на працягу многіх гадоў працуюць пры Рудзенскай дзіцячай бібліятэцы Пухавіцкага раёна.

У Салігорскім раёне дзейнічаюць наступныя клубы экалагічнай тэматыкі: клуб кветкаводаў “Флора” (ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”); “Лесавічок” (Раённая дзіцячая бібліятэка), “Светлячок” (Чырвонаслабодскага гарпасялковая экалагічная бібліятэка); “Муравейник” (Далгоўская сельская экалагічная бібліятэка).

Пры Горкаўскай сельскай бібліятэцы Старадарожскага раёна паспяхова працуе гурток па экалагічным выхаванні “Пралеска”, у рамках якога прайшлі цікавыя мерапрыемствы: экалагічны ваяж “Гэта зямля твая і мая”, экалагічная гадзіна “Чудеса на лесной тропинке”, лясная гасцеўня “Целительная сила растений”, слайд – шоу “Экологические катастрофы мира”, конкурс малюнкаў “Звери, птицы, лес и я – вместе дружная Земля”, экскурсія ў лес “Как вести себя в гостях у природы”. У ходзе мерапрыемства ўдзельнікі гуртка змаглі папоўніць свае веды, пазнаёміцца з сучаснымі ўяўленнямі пра шматграннасць жывой прыроды, пашырыць веды пра жывёльны і раслінны свет.

У бібліятэках Уздзенскага раёна працуюць шэсць аматарскіх аб’яднанняў экалагічнага напрамку: “Экоша” (Камянкоўская сельская бібліятэка), “Мурашык” (Хатлянская сельская бібліятэка), “Буслянятка” (Зенькавіцкая сельская бібліятэка), “Дом под крышей голубой” (Нёманская сельская бібліятэка), “Родничок” (Ліцвянская сельская бібліятэка), “Ромашка” (Дзешчанская сельская бібліятэка), мэтай якіх і з’яўляецца выхаванне беражлівых адносінаў да ўсяго жывога на зямлі і да самой зямлі.

## Сацыяльна неабароненыя катэгорыі насельніцтва

У бібліятэках Міншчыны створаны базы дадзеных аб пражываючых у зонах абслугоўвання бібліятэк ветэранах вайны і працы, адзінокіх састарэлых, інвалідах і ўсіх тых, хто патрабуе сацыяльнай апекі і абароны. Кожны год бібліятэкары воблацсі праводзяць маніторынг сваёй зоны абслугоўвання, па выніках якога маюць звесткі аб колькасці пажылых людзей і інвалідаў, і складаюць планы работы з гэтымі групамі насельніцтва. Сёння кожны жыхар Міншчыны, які па медыцынскіх прычынах не мае магчымасці наведваць бібліятэку, можа звярнуцца па дапамогу і для яго будзе арганізавана дастаўка кніг і часопісаў на дом. Галоўная задача бібліятэк у гэтым напрамку – далучэнне такіх людзей да кнігі, а галоўная мэта – зрабіць бібліятэку даступнай. З гэтай мэтай

бібліятэкары актыўна выкарыстоўваюць у абслугоўванні пазастацыянарныя формы, індывідуальнае абслугоўванне на даму. У гэтым напрамку бібліятэкі працуюць ў цесным кантакце з установамі і арганізацыямі, якія ствараюць сістэму падтрымкі пажылых людзей і інвалідаў: органы мясцовай улады, службы сацыяльнай абароны, аховы здароўя, установы культуры, асветы, грамадскія арганізацыі.

У ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева" з 2019 года рэалізуецца рэгіянальны сацыяльна-асветніцкі праект "Инклюзия. Библиотека без границ", мэта якога – стварэнне безбар'ернага культурнага асяроддзя, забеспячэнне даступнасці сацыякультурнай інфармацыі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, арганізацыя іх вольнага часу. У рамках праекта ў справаздачным годзе супрацоўнікі цэнтральнай, гарадскіх і сельскіх бібліятэк актыўна працавалі з чытачамі з праблемамі зроку гарадской спецыялізаванай бібліятэкі №5, з дзецьмі з аўтызмам і іх бацькамі, з падапечнымі аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў і аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту ГУ "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Барысаўскага раёна". Упершыню ў гэтым годзе ўстанова наведалі выхаванцы аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў ДУ "Жодзінскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва".

У 2020 годзе заключаны дагавор аб супрацоўніцтве з дабрачынным грамадскім аб'яднаннем "Другое детство". Новай катэгорыяй карыстальнікаў бібліятэкі сталі дзеці з аўтызмам і іх бацькі. Для дзяцей з аўтызмам супрацоўнікі дзіцячага аддзела, залы літаратуры на замежных мовах, партнёрскага цэнтру "Borisov InfoUSA" і духоўна-асветніцкага цэнтра ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева" арганізавалі і правялі шэраг адаптаваных асветніцкіх мерапрыемстваў: лялечныя спектаклі, агляды рэсурсаў партнёрскага цэнтра "Borisov InfoUSA", агляды незвычайнай калекцыі дзіцячых кніг, экскурсіі па літаратурна-этнаграфічнай экспазіцыі "Бабуліна спадчына", мерапрыемствы да Дня маці, экскурсіі па дзеючых мастацкіх выставах цэнтральнай бібліятэкі. На афіцыйным сайце ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева" створаны раздзел "Все об аутизме" (https://www.borlib.by/chitatelyam/vsjo-ob-autizme), у якім прадстаўлены інфармацыйныя рэсурсы:

кнігі, гульні, тэсты, сайты для бацькоў , супольнасці для людзей, якія сутыкнуліся з праблемай засмучэнні аутычнага спектру і шмат іншага.

Гарадская спецыялізаваная бібліятэка № 5 г. Барысава з 2009 года абслугоўвае невідушчых і слабавідушчых чытачоў. З 2016 года ва ўстанове рэалізуецца праект па працы з невідушчымі і са слабым зрокам людзьмі “Библиотека равных возможностей”, мэта якога – садзейнічанне сацыяльнай рэабілітацыі і адаптацыі інвалідаў па зроку. У рамках праекта бібліятэка цесна супрацоўнічае з Барысаўскай раённай арганізацыяй ГА “БелТІЗ” і Барысаўскім філіялам УП “Святлопрыбор” ГА “БелТІЗ”.

Пашыраліся творчыя напрацоўкі бібліятэк Бярэзіншчыны па рэалізацыі абласной праграмы “Міласэрнасць”. Прыярытэтнымі кірункамі заставаліся індывідуальнае абслугоўванне на даму і арганізацыя вольнага часу людзей з фізічнымі абмежаваннямі. На працягу года ў бібліятэках традыцыйна праводзіліся Дні добрых паслуг – абслугоўванн на даму з дастаўкай бібліятэчных выданняў людзям пенсійнага ўзросту і інвалідам, якія па стане здароўя не могуць самастойна наведваць бібліятэку.

Абслугоўванне сацыяльна-неабароненых слаёў насельніцтва ў Капыльскім раёне праводзіцца ў рамках мэтавай праграмы бібліятэчнага абслугоўвання пажылых, састарэлых, адзінокіх людзей і інвалідаў “Вы не адны, пакуль мы з Вамі”. Працягвалася супрацоўніцтва паміж ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі” і Капыльскім тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, на базе якога працуюць аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў. Вялася работа ў рамках праектаў “Кніжны свет”, сумесна с інвалідамі цэнтра і “Старонкі жыцця”, сумесна з ветэранамі ТЦСАН.

На працягу года бібліятэкі Лагойскага раёна праводзілі дні абслугоўвання на даму пенсіянераў і інвалідаў, якія па стану здароўя не могуць самастойна наведваць бібліятэку. Плешчаніцкая гарпасялковая бібліятэка працягвала дзейнасць у межах мэтавай праграмы “Бібліятэка – за міласэрнасць”. Па прычыне распаўсюджвання каронавіруснай інфекцыі COVID-19 наведванне на даму пажылых людзей было абмежавана.

Бібліятэкары Любанскага раёна на працягу года працавалі у рамках мэтавай сацыяльнай праграмы “Душу исцелит добро”.

У Маладзечанскім раёне рэалізуюцца: “Жыццё патрабуе міласэрнасці” – сумесны праект бібліятэкі сямейнага чытання “Верасок” з аддзяленнем дзённага знаходжання інвалідаў і пажылых грамадзян Маладзечанскага РТЦСАН і ЦКРНіР, накіраваны на адаптацыю ў грамадстве людзей з абмежаванымі магчымасцямі; “Серебряная нить” – праект па рабоце з пажылымі людзьмі (ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”).

Асаблівая ўвага надаецца абслугоўванню сацыяльна неабароненый катэгорый насельніцтва ў Мінскім раёне. Адным з праяўленняў гэтага стала работа па рэалізацыі мэтавай рэгіянальнай праграмы “Бібліятэка без межаў”.

На працягу года бібліятэкі Салігорскага раёна праводзілі працу па інфармацыйным абслугоўванні сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва ў рамках праекта “Согреть своей заботой”. Супрацоўнікі Салігорскай раённай дзіцячай бібліятэкі асаблівую ўвагу і клопат надаюць дзецям з абмежаваннямі ў жыццядзейнасці і дзецям-сіротам, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, дапамагаюць ім атрымаць навыкі культуры зносін з аднагодкамі, праявіць свае творчыя здольнасці. Бібліятэкары супрацоўнічаюць у гэтым напрамку з Цэнтрам карэкцыйнага развіцця, навучання і рэабілітацыі (ЦКРНіР) і ДУА “Сацыяльна-педагагічны цэнтр Салігорскага раёна”. У дзіцячай бібліятэцы з гэтай мэтай рэалізуецца праграма “Дом, где согреваются сердца”.

Бібліятэкі Слуцкага раёна ў 2020 годзе вялі змястоўную працу з сацыяльна неабароненымі групамі насельніцтва ў рамках сацыяльнай праграмы “Вера. Надзея. Любоў”. Асноўныя адрасаты праграмы: адзінокія, састарэлыя, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянеры, мнагадзетныя сем’і; інваліды рознага ўзросту. Мэта праграмы – стварэнне безбар’ернага бібліятэчнага асяроддзя для дадзеных катэгорый грамадзян. Галоўныя напрамкі праграмы накіраваныя на задавальненне індывідуальных інтарэсаў дадзенай катэгорыі карыстальнікаў, змястоўную арганізацыю вольнага часу, магчымасць самарэалізацыі і пошуку новай сацыяльнай ролі. Работа па праграме плануецца і вядзецца сумесна з грамадскімі арганізацыямі і дзяржаўнымі ўстановамі горада і раёна: ДУ “Слуцкі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва”, Слуцкім аддзяленнем ГА “Дзеці ў бядзе”, цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі дзяцей і падлеткаў.

Усе мерапрыемствы ў Старадарожскім раёне праводзяцца ў рамках раённай праграмы “Праз кнігу да міласэрнасці”. Пашыраецца дабрачынная і гуманітарная дзейнасць бібліятэк: арганізоўваюцца дні добрых паслуг, акцыі міласэрнасці, рэйды міласэрнасці.

Супрацоўнікамі Бібліятэкі сямейнага чытання г. Жодзіна быў распрацаваны і рэалізаваны доўгатэрміновы праект “Мобильная библиотека”. У рамках гэтага праекта бібліятэкары наведвалі на даму пенсіянераў і інвалідаў, папярэдне абтэлефанаваўшы і удакладніўшы, якія кнігі яны хочуць чытаць.

Стаць прасунутым карыстальнікам камп’ютэра – мара многіх пажылых людзей. На працягу 2020 года ў ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” працавалі адукацыйныя курсы “Основы компьютерной грамотности”, слухачамі якіх сталі 3 чалавекі. Індывідуальныя заняткі з пажылымі людзьмі праводзіў метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу П. С. Алейнік. Пасля заканчэння курса навучання слухачы навучыліся ствараць і рэдагаваць тэксты ў тэкставых рэдактарах, выкарыстоўваць і рэдагаваць графічныя даныя, ствараць табліцы, захоўваць дадзеныя на розных носьбітах, раздрукоўваць інфармацыю на прынтэры, ствараць прэзентацыі, працаваць з электроннай поштай, у сацыяльных сетках, шукаць інфармацыю ў сетцы інтэрнэт і многае іншае.

Цёплая гасцёўня “Кожная сустрэча – гэта свята душы”, якая была арганізавана Заастравецкай сельскай бібліятэкай Клецкага раёна, мела сваёй мэтай сабраць і павіншаваць тых людзей “залатога” ўзросту, лёс якіх цесна звязаны з бібліятэкай: работнікаў культуры, якія зараз знаходзяцца на заслужаным адпачынку, самых актыўных чытачоў, майстроў, чые творчыя работы прадстаўлены на выставах бібліятэкі. На працягу ўсяго мерапрыемства ў адрас гасцей гучалі шчырыя словы віншавання і, канечне, добрыя песні.

Гадзіна карысных парад “Каб цела і душа былі маладыя” была арганізавана ў Сямкоўскай сельскай бібліятэкай Лагойскага раёна. Размова ішла пра ўздзеянне навакольнага асяроддзя на здароўе чалавека, фізічныя нагрузкі для людзей сталага ўзросту, правільнае харчаванне, самалячэнне, адпачынак. На пытанні аб захаванні здароўя, аб выкарыстанні медыцынскіх прэпаратаў пры розных захворваннях адказала фельчар Сямкоўскага ФАПа Жукоўская А. Былі распаўсюджаны буклеты “От возраста можно убежать” і “Контролируйте своё давление”. За кубкам гарбаты прысутныя,

абмяняліся вопытам правядзення вольнага часу, рэцэптамі прыгатавання розных страў. Мясцовая паэтка Р.А. Балахніна прачытала свае вершы.

Вялікі зарад энергіі, бадзёрасці атрымалі ўдзельнікі сустрэчы за самаварам "Пара залатая ў прыродзе і жыцці", арганізаванай ў Баярскай сельскай бібліятэцы-доме вольнага часу Мядзельскага раёна. Шчырая амаль хатняя атмасфера, прыгожыя вершы, гумарэскі, бяспройгрышная латарэя, інтэрв'ю "Сакрэт нашай маладосці" падаравалі прысутным добры настрой, зарад аптымізму.

На працягу года актыўна вялася работа з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва, прайшлі наступныя мерапрыемствы: акцыя "Віншавальная паштоўка", акцыя "Бібліятэкара вызывалі?" (Капыльскі раён); акцыя "Славім залаты ўзрост", акцыя "От всей души с поклоном и любовью" (Клецкі раён); гадзіна міласэрнасці "Сярод нас жывуць такіе людзі", святочнае ўшанаванне "Паважаны ўзрост", вечар пашаны "Залаты ўзрост", выстава малюнкаў "Золотая осень жизни будет золотой", вечар мудрых парад "Голова седая да душа молодая", гадзіна дабрыні "Спяшайцеся рабіць дабро", сустрэча за самаварам "Мы за чаем не скучаем", агіткватэра "Зачем считать года", вечарына шчырай размовы "А жизнь остаётся прекрасной всегда", сустрэча за круглым сталом "Тепло наших сердец – людям особой заботы" (Крупскі раён); дзень спагадлівых зносін "Мы побач з вамі", калейдаскоп ідэй "Рэцэпты актыўнага доўгажыхарства" (Лагойскі раён); гадзіна прававых ведаў "Прававое поле пенсіянера", святочная праграма "Святло жанчыны ззяе ў Сусвеце!", бібліяпаці "Библиотека в кругу друзей", конкурс-чэлендж "Паўлаўскія чытанні"(Любанскі раён); гадзіна зносін "Неугасимый огонь души", чайныя вячоркі "Души запасы золотые", вечар-сустрэча "Жизнь прекрасна в любом возрасте", тэматычны вечар "Славим возраст золотой" (Салігорскі раён).

Літаратурна – музычная кампазіцыя "Годы жизни не помеха" прайшла ў сельскай бібліятэцы №19 сямейнага чытання в. Забашавічы Барысаўскага раёна. Бібліятэкар сумесна з ДУА "Забашавіцкая сярэдняя школа Барысаўскага раёна" і Забашавіцкім СДК наведалі "ТЦСАН" Аддзяленне кругласутачнага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў д.Забашавічы павіншавалі ўсіх з Днём сталых людзей. Для пражываючых

у аддзяленні і абслугоўваючага персаналу была падрыхтавана літаратурна-музычная кампазіцыя “Гады жыцця не перашкода”.

У ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” прайшоў вечар “Душою молодые, сердцем золотые”. На мерапрыемства былі запрошаны ўдзельнікі клуба “Міласэрнасць”. Госці пачулі шмат пажаданняў у свой адрас ад вядучых мерапрыемства, атрымалі зарад бадзерасці і станоўчых эмоцый. Святочны настрой задавалі баяніст і салісты, якія з’яўляюццв актыўнымі чытачамі бібліятэкі. Мерапрыемства дало магчымасць пажылым людзям абмяняцца думкамі, падзяліцца творчымі ідэямі і захапленнямі.

З мэтай парадаваць пажылых членаў грамадства ў Фаніпальскай гарадской бібліятэцы Дзяржынскага раёна прайшоў святочны вечар-камплімент “Души запасы молодые”. Спецыяльна для іх гучалі добрыя словы і была праведзена гульня-латарэя “Шчаслівы выпадак”. Людзі старэйшага пакалення з задавальненнем і з усмешкай на тварах цягнулі латарэйныя білецікі і атрымлівалі свае прызы: салодкія пачастункі, кнігі, магчымасць узяць бясплатна кнігу з “Платнай бібліятэчкі”.

1 кастрычніка Маладзечанская гарадская бібліятэка-філіял №1 правяла штогадовую дабрачынную акцыю “Падарыце клопат і ўвагу” па зборы кніг для пажылых людзей. Бібліятэкары перадалі сабраныя з дапамогай чытачоў бібліятэкі 230 асобнікаў кніг і часопісаў у бібліятэку ГУ “Маладзечанскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў”. Гэта творы класічнай літаратуры і сучасная забаўляльная літаратура: дэтэктывы, жаночыя раманы, фантастыка. Удзельнікамі акцыі сталі людзі рознага ўзросту.

У Каладзішчанскай сельскай бібліятэцы № 1 Мінскага раёна прайшла гадзіна пытанняў і адказаў “Забеспячэнне абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян”. У арганізацыі мерапрыемства прынялі ўдзел супрацоўнікі натарыяльнай канторы № 5 Мінскага раёна Мінскай вобласці. Мэта мерапрыемства – юрыдычная кансультацыя людзей сталага ўзросту.

Да Дня пажылых людзей Камароўская сельская бібліятэка Мядзельскага раёна сумесна з Домам культуры падрыхтавалі літаратурна-музычную гасцёўню “Людзі пажылыя – сэрцам маладыя”. У гэты дзень работнікі культуры ўшаноўвалі тых, хто годна пражыў да сталага ўзросту. У цэнтры ўвагі былі пажылыя грамадзяне, якія знайшлі прытулак у Доме самастойнага

пражывання. Ён размяшчаецца ў будынку насупраць бібліятэкі. Цёплую атмасферу спаткання стварала чаяванне, якое суправаджалася сюрпрызамі, канцэртнымі нумарамі.

У гонар Дня пажылога чалавека ў бібліятэках вобласці праведзены: акцыя “Пожилым – забота, внимание и льгота”, свята на дому “Согреем ладони, разгладим морщины”, дзень мудрасці “Души запасы молодые”, чайныя вячоркі “Мудрость жизни – молодость души”, выстава вырабаў “Мир своими руками” (Барысаўскі раён); сустрэча за самаварам “Цудоўны шлях гадоў пражытых”, творчая вечарына “Ветэраны на Алімпе памяці і творчасці”, пасядзелкі “Па ўзросту – сталыя гады, а душой і сэрцам – маладыя” (Бярэзінскі раён); канцэртна-забаўляльная праграма “Жыцця восень залатая”, вечар-успамін “Душы маёй чароўны свет”, марафон дабра “Высокая мера дабрыні”, урок міласэрнасці “Усе людзі роўныя”, вечар успамін “Цяпло нашых сэрцаў вашым пражытым гадам” (Валожыснкі раён); бібліятэчная акцыя “Для вас – люди пожилые, сердцем молодые!”, вечарына добрых зносін “Жыццё цудоўнае ў любым узросце”, бібліятэчныя пасядзелкі “Web-пенсионер” (Вілейскі раён); рэйд-віншаванне “Пусть будет тёплой осень жизни”, акцыя-наведванне “День добра и уважения”, акцыя “Цяпло душы”, рэтра-вечар “Узрост залатой восені” (Дзяржынскі раён); забаўляльная праграма “Нам года не беда”, літаратурныя пасядзелкі “Не стареем душой” (Капыльскі раён); віншавальная праграма “Для вас, людзі пажылыя, сэрцам маладыя!”, святочнае віншаванне і ўшанаванне пажылых “Цяпло нашых сэрцаў – вашым пражытым гадам”, урок міласэрнасці “Чти того, кто немощен и сед, чтобы и тебя уважали на склоне лет” (Лагойскі раён); акцыя “Нам года не беда”, дзень ушанавання на даму “Души золотые запасы”, музычнае віншаванне “Агарнуць цяплом і ласкай”, святочная імпрэза “Скрозь гады – маладосць душы”, вечар сустрэч “Возраст не помеха”, літаратурная гадзіна “Пяшчотныя дні залатой восені”, круглы стол “Восень жыцця – не старасць душы” (Любанскі раён); акцыя “Як заўсёды патрэбныя і любімыя”, дабрачынная акцыя “Добрыя справы”, бабуліны пасядзелкі “Пусть будет тёплой осень жизни”, вечар адпачынку “Для пожилого человека всегда важна библиотека”, караван гісторый “Как много пройдено дорог…”, урок-роздум “В гармонии с возрастом” (Маладзечанскі раён); свята “Возраст осени чудесный”, дзень шанавання сталасці “Ёсць толькі імгненне”, музычная гадзіна “Сагрэем цяплом і душой”, вечар для сталых “Для пожилого

человека всегда важна библиотека", пасядзелкі "Днём мудрасці завецца гэты дзень", урок дабрыні "Дапамога сталым людзям – твой абавязак", акцыя дабрыні і спагады,наведванні на даму "Ад чыстага сэрца – з добрымі словамі", гутарка-разважанне "Мудрай старасці паклон", вечар- ушанаванне "Когда душа теплом согрета" (Мінскі раён); вечар-сустрэча "Восень жыцця", гадзіна карысных парадаў "Не хварэйце, не старэйце!", гутарка "Мудрасць мудрасці пакланіся", пасядзелкі "А душа застаецца маладая...", святочны агеньчык "Мае гады – маё багацце", гадзіна міласэрнасці "Людзі пажылыя – сэрцам маладыя ...", сеанс бібліятэрапіі "З дабрынёй – у кожны дом" (Пухавіцкі раён).

Галоўная мэта тыдня міласэрнасці, прымеркаванага да Дня інвалідаў – сацыялізацыя людей з абмежаванымі магчымасцямі. У рамках тыдня ў ДУК "Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка" прайшло мерапрыемства для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання для маладых інвалідаў ТЦСАН пад яднаючай назвай "Мы – разам". Прысутныя з задавальненнем паглядзелі фільмы, пагутарылі пра Новы год, расказалі пра свае навагоднія традыцыі. Сустрэча прайшла ў цёплай, сямейнай атмасферы.

Напярэдадні Дня інвалідаў у канферэнц-зале ДУ "Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка" прайшоў круглы стол "Добрым словом друг друга согрейте". Бібліятэкары пастараліся стварыць ўтульную атмасферу, за кубкам чаю пагаварылі аб тым, што хвалюе, з якімі праблемамі часта сутыкаюцца людзі з абмежаванымі магчымасцямі.На мерапремства былі запрошаны старшыня аддзела таварыства Чырвонага крыжа А. В. Трацэўская, спецыяліст ДУ "Валожынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва" А. А. Рай. Для прысутных была падрыхтавана кніжная выстава "Дабрыня збліжае сэрцы", дзе яны пазнаёміліся з кнігамі аб лекавых раслінах, гаючых травах.

Акцыя "Дабрыня запальвае зоркі" была праведзена ДУК "Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік" 27.11-06.12.2020 г. У рамках акцыі ў бібліятэках горада і раёна праходзіла знаёмства з інфармацыйнымі магчымасцямі бібліятэк па аказанні дапамогі інвалідам і іх сем'ям, праводзілася бясплатнае кансультаванне інвалідаў у сродкамі ПЦПІ.

У ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" прайшла прэзентацыя выставы творчых работ "Моё вдохновение…". На ёй былі прадстаўлены карціны, выкананыя

ў тэхніцы “вышыўка крыжыкам”, габеленавая і алмазная вышыўка, вырабы з бісеру. Аўтары работ – маладыя людзі з абмежаванымі магчымасцямі і бязмежнымі творчымі ідэямі, ажыццяўляць якія ім дапамагае сябра і настаўнік Балясава Алла Алегаўна – кіраўнік народнага аматарскага аб’яднання “Калаўрот” Дзяржынскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці. Кожная работа з прадстаўленых на выставе, унікальная і непаўторная, перадае гледачу часцінку душэўнай цеплыні і любові аўтараў.

У Заслаўі на базе ясляў-сада № 4 “Залаты ключык” дзейнічае група для дзяцей-інвалідаў ДУА “Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі Мінскага раёна”. Дзеці са сваімі выхавацелямі сталі гасцямі Заслаўскай гарадской дзіцячай бібліятэкі пад час гадзіны міласэрнасці “Трудное слово “толерантность”. Дзяўчынкі і хлопчыкі пазнаёміліся з маляўнічымі часопісамі, кнігамі і гадаванцамі жывога кутка.

Бібліятэка аграгарадка Лясны Мінскага раёна запрасіла дзяцей на гадзіну разважанняў “Гісторыі моцных духам”. Размова ішла пра тых людзей, для якіх фізічныя абмежаванні не сталі перашкодай для здзяйснення мары, аб вядомых людзях-інвалідах, якія дабіліся поспехаў у сваім жыцці.

У ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” пад патранажам ДУ “Слуцкі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва” у партнёрстве са Слуцкай пярвічнай арганізацыяй грамадскага аб'яднання “Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам” прайшоў інклюзіўны фестываль “Радуемся разам”. Прысутныя змаглі бліжэй пазнаёміцца з бібліятэкай, даведаліся, што яна з'яўляецца не толькі месцам для чытання, але і дорыць цікавыя зносіны і радасць кожнаму дзіцяці.

Актыўна працавалі з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя (інваліды) на працягу года бібліятэкары вобласці. Для дадзенай катэгорыі карыстальнікаў у бібліятэках праведзены: дзень дабра і павагі “От сердца к сердцу”, акцыя “Добро с доставкой на дом”, гадзіна дабрыні “Под открытым зонтиком добра”, гутарка “Будь оптимистом, забудь о недугах”, сустрэча ў коле сяброў “Калі лёс іншых хвалюе нас” (Барысаўскі раён); урок міласэрнасці “Ім патрэбна наша дапамога”, гутарка “Ты не адзін у гэтым свеце”, акцыя – наведванне інвалідаў “Клопат” (Валожынскі раён); дзень аказання дапамогі “Мой путь к доброте”, урок міласэрнасці

“Моцныя духам”, акцыя “От сердца к сердцу”, бібліятэчная акцыя “Книги, помогающие жить”, (Вілейскі раён); марафон міласэрнасці “Ты не один в этот трудный миг, рядом герои любимых книг”, марафон міласэрнасці “Падорым радасць і надзею людзям” (Дзяржынскі раён); інфармацыйная гадзіна “Калі лёс іншых нас хвалюе”, круглы стол “Няхай наша дабрыня сагрэе вашы душы”, гадзіна зносін “Калі душа з душою гаворыць” (Крупскі раён); гутарка “Гісторыі моцных духам”, гутарка “Прававыя дакументы для інвалідаў”, прагляд літаратуры “Адрас міласэрнасці – бібліятэка”, прагляд літаратуры “Калі чужы боль становіцца сваім” (Лагойскі раён); займальнае падарожжа ў бібліятэку “Мы – як усе”, дыялог з чытачом “Жыццё патрабуе міласэрнасці”, відэаагляд “Сильные духом”, урок дабрыні “Спешите день начать с добра”, гадзіна міласэрнасці “Сагрэць сваім клопатам”, гадзіна зносін “Жизнь дана на добрые дела”, дні добрых паслуг “З цяплом і ласкай да людзей”, акцыя міласэрнасці “Сцяжынка да сэрца”, гадзіна дабрыні “Доброта спасёт мир”, акцыя міласэрнасці “Сагрэць сваім сэрцам”, дзень добрых спраў “Дакраніся да мяне дабрынёю” (Любанскі раён); размова-роздум “Асобыя людзі не павінны жыць асобна!”, гадзіна талерантнасці “Дабрыня і аптымізм выратуюць нас”, размова-дыялог “От сердца к сердцу”, размова “Няма чужога болю”, урок дабрыні “С надеждой в сердце”, дзень добрых паслуг “Адрас міласэрнасці – бібліятэка” (Мінскі раён); урок добрых манер “Калі хвалюе нас лёс чужы”, сеанс бібліятэрапіі “Цікавая кніга – сапраўдная тэрапія”, гутарка-разважанне “Лёс іншых хвалюе нас”, дэсант дабрачыннасці “Не застацца ў баку” (Пухавіцкі раён); акцыя “С добрым сердцем к вам”, акцыя “Милосердие – отклик души”, гадзіна зносін “Мы сильные духом”, ўрок дабрыні “Передай добро по кругу”, ўрок дабрыні “Душу исцелит добро” (Салігорскі раён); дзень добрых паслуг “Милосердие – голос души”, акцыя міласэрнасці “Мы дабрынёй сагрэем вашы душы”, рэлакс-сустрэча “Дабрыня і спагада да тых, хто побач”, інфа-дайджэст “Инвалиды имеют права” (Слуцкі раён); кнігатэрапія “Вера в добрых людей”, свята зносін “Доброта спасёт мир” (Жодзіна).

Да Міжнароднага дня сляпых ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” сумесна з аддзелам рэабілітацыі прадпрыемства ГА “БелТІЗ” правяла інтэлектуальны турнір “Знаўцы УП “Энва”, дзе карыстальнікі бібліятэкі мелі магчымасць не толькі атрымаць інфармацыю, але

і праявіць ініцыятыву, усвядоміць сваю карыснасць. У турніры прымалі ўдзел 6 каманд па 5 чалавек у кожнай камандзе з дрэнным зрокам і невідушчых людзей. Кожнай камандзе, па чарзе, было зададзена па 10 пытанняў з варыянтамі адказаў. За кожны правільны адказ каманда атрымлівала 1 бал. Кола тэм, якія былі ўзятыя для турніру, вельмі шырокае: гісторыя, культура, спорт, жывапіс, пісьменнікі і кнігі, краіны і кантыненты, кіно і г.д. У перапынках паміж удзелам каманд праводзіліся музычныя паўзы.

Для невідушчых і слабавідушчых карыстальнікаў бібліятэкі ў справаздачным годзе правялі: гучныя чытання “Познай мир через книгу”, прававая гадзіна “Законы, которые нас защищают”, сустрэча ў коле сяброў “Согреем душу тёплым словом”, літаратурны каляндар па радыё “Юбилей писателя – праздник для читателя”, літаратурныя дыялогі па радыё “Через книги увиденный мир”, радыёвеснік “Беларусь литературная” (Барысаўскі раён); інтэрактыўная выстава “Мы бачым сэрцам”(Маладзечанскі раён); інфарміна “Луи Брайль и его великое шеститочие” (Слуцкі раён); агляд па радыё “Зимний сезон без лекарств, агляд па радыё “Труд украшает человека” ,агляд па радыё “Поклонимся великим тем годам”, агляд па радыё “Домашние питомцы: за и против”, агляд па радыё “Движение – это жизнь”, агляд па радыё “Иди всегда дорогою добра”, вечар“Помоги человеку с белой тростью”, выстава вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Свет убачыць душой” (Чэрвеньскі раён).

Праграма работы клубаў уключае розныя па тэматыцы і форме мерапрыемствы, якія даюць магчымасць пажылым людзям актыўна бавіць вольны час, раскрыць свой унутраны свет, спрыяюць самарэалізацыі і арганічнай адаптацыі да асяроддзя, падтрымліваюць пазітыўны настрой.У бібліятэках Міншчыны працягвалі сваю працу: клубы “Золотой возраст”, “Славянка”, “Вдохновение”, “Собеседник”, “Милосердие”, “БриЗ”, “Надежда”, “Субботея”, “Сельчанка”, “Радзімічы”, “English Family club” (Барысаўскі раён); клуб “Міласэрнасць” (Валожынскі раён); клуб для пенсіянераў “Добрыя сустрэчы” (Капыльскі раён); клуб “Те, кто молоды душой” (Шчэпіцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна); клубы “Крынічка”, “Хрызантэма”, “Были-небылицы” (Крупскі раён); аматарскае аб’яднанне “Добрыя сустрэчы”, клуб “Чытаем разам” (Любанскі раён); клуб “Задушэўная размова”, клуба для пажылых людзей “Завалінка”, клуб для пажылых “Надзея”, аматарскае аб’яднанне “Душа”, жаночы клуб “Веста”, клуб “Клуб аматараў скандынаўскай

хадзьбы" (Мядзельскі раён); клубныя аб'яднанні "Чысты чацвер" і "Клуб цікавых сустрэч", клуб "На агеньчык", клуб па інтарэсах "Душэўныя сустрэчы" (Пухавіцкі раён); клубы для людзей сталага узроста "Собеседник", "Ветеран", "Землякі", "Залаты ўзрост", "Молодушки", "Доброта", "Сяброўка" (Салігорскі раён); клуб для людзей сталага ўзросту "Дабрыня" (Селішчанская сельская бібліятэка-філіял №40 Слуцкі раён); клубы "Пасядзелкі", "Залатая восень", "Субяседніца", "Суседкі" (Старадарожскі раён); клуб "Залаты ўзрост" (Уздзенскі раён); клуб "Собеседник", клуб "Восхождение", клуб "Золотая осень" (Жодзіна).

## Здаровы лад жыцця

З 25 верасня 2019 года па 11 сакавіка 2020 года ў духоўна-асветніцкім цэнтры ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева" для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі г. Барысава працавала міжведамасная праграма "Формула здоровья". Заснавальнікі праграмы: упраўленне па адукацыі Барысаўскага райвыканкама, ДУА "Сацыяльна-педагагічны цэнтр Барысаўскага раёна", УАЗ "Барысаўская ЦРБ" і ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева". Мэта праграмы: стварэнне аптымальных умоў для захавання і ўмацавання рэпрадуктыўнага здароўя, фарміраванне здаровага ладу жыцця і каштоўнасных адносін да здароўя ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу; фарміраванне каштоўнасных арыенціраў на аснове маральнасці.

Таксама ў Барысаўскім раёне працавалі над рэалізацыяй: праект па прапагандзе ЗЛЖ і прафілактыцы шкодных звычак "За здоровую молодость", праект "Борисов в стиле "вело", праект па здаровым ладзе жыцця "По дороге со здоровьем".

У рамках прафілактычнага раённага праекта "Беразіно – здаровы горад"(2019-20гг.) Бярэзінскага раёна было рэалізавана правядзенне акцый і дзён здароўя. Пацыентам тэрапеўтычнага аддзялення раённай бальніцы, наведвальнікам аддзяленняў ТЦСАН дзённага знаходжання маладых інвалідаў і пажылых людзей супрацоўнікі раённай бібліятэкі прапанавалі сеансы кніга-смехатэрапіі, гадзіны карысных парад.

У рамках праграммы "За здаровы лад жыцця" Івянецкая гарпасялковая бібліятэка Валожынскага раёна правяла шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных прапагандзе здаровага ладу жыцця.

У справаздачным годзе аддзел абслугоўвання дзіцячага чытача ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" сумесна з ДУ "Яслі-сад №2 г. Дзяржынска" пачалі рэалізацыю праекта па здароваму ладу жыцця сярод дашкольнікаў "Вучымся быць здаровымі". Яго мэта – садзейнічаць фарміраванню свядомых адносін да здароўя, як галоўнай каштоўнасці ; павышаць цікавасць дзяцей да здаровага ладу жыцця праз новыя формы і метады работы.

Мерапрыемствы па фарміраванні здаровага ладу жыцця і непрыязнасці да шкодных звычак у Крупскім раёне праводзіліся ў рамках праекта "Да здароўя праз кнігу". Выдадзены шэраг лістовак-закладак, памятак для бацькоў: "Каб не здарылася бяда", "Не! Сэксуальнаму насіллю над дзецьмі", "ПАВ – эпідэмія 21 стагоддзя", "Не жгите душу табаком" і інш.

У 2020 годзе бібліятэкі Лагойскага раёна працягвалі працаваць у рамках раённай мэтавай праграмы "Мы – за здаровую будучыню" (2018-2020гг.). Дадзеная праграма – гэта правядзенне комплексу мерапрыемстваў, якія актыўна прапагандуюць здаровы лад жыцця, садзейнічаюць прафілактыцы шкодных звычак сярод насельніцтва. Разнастайныя бібліятэчныя мерапрыемствы праводзіліся сумесна з сем'ямі, навучальнымі і медыцынскімі ўстановамі.

Вось ужо чатыры гады на тэрыторыі г. Заслаўе Мінскага раёна дзейнічае дзяржаўны прафілактычны праект "Здаровыя гарады", які быў прапанаваны Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя ў 1986 г. Мэты праекта: стварэнне здароўезберагальнай прасторы ў горадзе; захаванне і развіццё чалавечага патэнцыялу; паляпшэнне медыка-дэмаграфічнай сітуацыі. У бібліятэках горада Заслаўя былі аформлены выставы і прайшлі мерапрыемствы, якія актыўна прапагандуюць здаровы лад жыцця.

У Нарацкай пасялковай бібліятэцы Мядзельскага раёна працягваецца работа ў рамках раённага праекта "Здаровае пакаленне XXI стагоддзя".

Свой уклад у папулярызацыю здаровага ладу жыцця ўносіць аддзел абслугоўвання і інфармацыі ДУК "Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы". Бібліятэка выкарыстоўвае розныя формы работы, такія як кніжныя выставы, акцыі, асарці і інш. Усе мерапрыемствы па тэме здаровага ладу жыцця аб'ядналіся ў адным праекце "Здоровая нация". Фарміраванне свядомай устаноўкі на здаровы лад жыцця – галоўная мэта ўсіх мерапрыемстваў праекта. Праца праекта ахоплівае тэму ЗЛЖ па

розных напрамках: правільнае харчаванне, шкода курэння, барацьба з наркаманіяй, прафілактыка СНІДу, гігіена.

У справаздачным годзе бібліятэкі Салігорскага раёна працавалі ў рамках праекта “Молодежь в формате ЗОЖ”. Мэта – папулярызацыя здаровага ладу жыцця з дапамогай інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі, фарміраванне пазітыўнага стаўлення да здаровага ладу жыцця і ўласнага здароўя, прафілактыка асацыяльных з'яў сярод падлеткаў і моладзі. Таксама на працягу года ўдзельнічалі ў рэалізацыі праектаў “Город Солигорск – здоровый город”, “Стиль жизни – здоровье”, прафілактычнай акцыі “Безопасные каникулы”.

У 2020 годзе бібліятэкі Слуцкага раёна працягвалі працу ў рамках інфармацыйна-асветніцкай праграмы “За здаровы лад жыцця”. Дадзеная праграма складаецца з пяці падпраграм: “Інфарм-кур’ер”, “Люстэрка”, “Выратаванне”, “Сямейны лабірынт”, “Бібліятэрапія”, якія фарміруюць комплекс мерапрыемстваў па фарміраванні здаровага ладу жыцця, маральным выхаванні асобы, сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі моладзі і падлеткаў, прафілактыцы шкодных звычак, псіхалагічнаму і духоўнаму камфорту сям’і, пераадоленні крызісных сітуацый з дапамогай кнігі і чытання. Партнёрства з установамі і арганізацыямі – гэта дадатковы і вельмі значны рэсурс у развіцці праграмы. Цеснае супрацоўніцтва склалася з ДУ “Слуцкі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі”, Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа ГА Слуцкая Раённая Арганізацыя, УАЗ “Слуцкая цэнтральная раённая бальніца”, Слуцкім РК ГА “БРСМ”, установамі адукацыі і інш.

У рамках інфармацыйнага праекта “Чэрвень – Здаровы горад” ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” правяла шмат разнастайных мерапрыемств.

ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” рэалізуе праект па прапагандзе здаровага лада жыцця “Сегодня быть здоровым – модно и престижно!”.

У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” афармлены інфармацыйны стэнд “Здаровы лад жыцця”, які ўтрымлівае актуальныя кантактныя звесткі раённага ўрача-нарколага і аддзялення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі аддзела ўнутраных спраў райвыканкама. Самы актыўны ўдзел раённая цэнтральная бібліятэка прымала ў Адзіных днях здароўя, рыхтуючы кніжныя выставы

і бібліяграфічныя агляды літаратуры, праводзячы прафілактычныя гутаркі.

У 2020 годзе стартаваў антыкавідны on-line праект “Время читать, а не чихать” аддзел абслугоўвання і інфармацыі ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”. Галоўная мэта праекта – праз папулярызацыю лепшых твораў сусветнай літаратуры сфарміраваць і захаваць у насельніцтва пазітыўныя адносіны да жыцця ва ўмовах пандэміі COVID-19, сфарміраваць станоўчую сямейную традыцыю сумеснага чытання ў голас і абмеркавання кніг ва ўмовах рэжыму самаізаляцыі. Кожны выпуск праекта распавядаў чытачам цікавыя факты пра гісторыю напісання таго ці іншага твора, жыццясцвярджальную, матывацыйную і пазітыўную параду ад галоўнага героя твора і відэазапіс фрагменту тэкста з гэтай парадай. У рамках праекта была прадстаўлена інфармацыя аб наступных творах: У. Караткевіч “Каласы пад сярпом тваім”, “Зямля пад белымі крыламі”; В. Быкаў “Сотнікаў”; І. Шамякін “Злая зорка”; Г. Х. Андерсен “Гадкий утенок”; Э. Портер “Полианна”; К. Паустоўскі “Желтый свет”; В. Катаев “Сын полка”; У. Жалезнікаў “Чучело”; А. Сэнт-Экзепюры “Маленький принц”, У. Ліпскі “Сонца над галавой”, М. Шолахаў “Судьба человека” і інш.

Папулярызацыі здаровага ладу жыцця сярод моладзі, свядомай адмове ад шкодных звычак была прысвечана гутарка “Добрае здароўе – мара кожнага” ў Плешчаніцкай гарпасялковай бібліятэцы Лагойскага раёна. На сустрэчы было падкрэслена, што здаровы лад жыцця – гэта канцэпцыя жыццядзейнасці чалавека, накіраваная на паляпшэнне і захаванне здароўя, гэта добры настрой і бадзёрасць духу, адпаведнае харчаванне, фізічная падрыхтоўка, маральны настрой і адмова ад шкодных звычак.

Для папулярызацыі здаровага ладу жыцця супрацоўнікі абанемента ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” арганізавалі Дзень здароўя “ЗОЖ: Заряди Организм Жизнью” для навучэнцаў УА “Маладзечанскі гандлёва-эканамічны каледж” і прысвяцілі яго міжнароднаму Дню здароўя. На пачатку мерапрыемства бібліятэкары расказалі, якую шкоду арганізму могуць нанесці дрэнныя звычкі. Вялася гутарка і пра наступствы ўжывання энергетыкаў, уздзеянне іх на малады арганізм. Удзельнікам мерапрыемства былі прапанаваны відэаролікі пра здаровы лад жыцця, віктарына і выстава.

З 22 па 31 мая ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча” праводзіла ў сацыяльных сетках акцыю “Спасибо, доктор!” – малюнкі як падзяка дзяцей медыцынскім работнікам за тое, што яны ўдзень і ўначы ратуюць жыцці людзей. У акцыі маглі паўдзельнічаць усе жадаючыя.

Сустрэча “Введение. Понятие “Здоровье” з загадчыцай аддзяленнем грамадскага здароўя Мінскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Мітрайкінай Юліяй Васільеўнай у рамках сумеснага праекта “Здоровье – основа жизни” прайшла ў Ждановіцкай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна. Здаровы лад жыцця маладога пакалення з'яўляецца закладам здароўя нацыі ў цэлым. Дзеці пазнаёміліся са значэннем слова “здароўе”, даведаліся пра тое, як яго трэба берагчы: што такое гігіена здароўя, як правільна скласці рэжым дня, што з'яўляецца асноўнай крыніцай вітамінаў і мінеральных рэчываў, чаму неабходна займацца фізкультурай і спортам.

У 2020 годзе на пачатку снежня супрацоўнікі Мар’інагорскай гарадской бібліятэкі Пухавіцкага раёна для выхаванцаў “SOS-Дзіцячая вёска” і навучэнцаў 5-8 класаў СШ №3. падрыхтавалі валеалагічны круіз “Здоровый образ жизни: PRO-движение”. Юных удзельнікаў чакала мноства цікавых прыгод. У чытальнай зале супрацоўнікі бібліятэкі выкарыстоўвалі тэхналогію “гаворачая сцяна”, прысвечаную папулярызацыі здаровага ладу жыцця. “Гаворачы” арт-аб’ект – гэта своеасаблівы жывы экран. Тут знаходзіліся тэматычныя карцінкі, кішэні, гульні.

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” у справаздачным годзе прапанаваў карыстальнікам адукацыйныя пешыя шпацыры скандынаўскаю хадою з аўдыёгідам “Адпачываючы – пазнавай”. На маршруце, які пралягае па “спальным” раёне горада – 7 прыпынкаў. Мерапрыемства прайшло цікава, займальна і з карысцю да здароўя.

У кастрычніку мінулага году на базе ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка” была арганізавана сустрэча псіхолагаў Стаўбцоўскай цэнтральнай раённай бальніцы з навучэнцамі 9 класа ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Стоўбцы”. Тэма мерапрыемства “Трывожнасць…Што гэта такое? Як з ёй змагацца?”. Да ўвагі дзяцей была падрыхтавана тэматычная кніжная выстава, метадыстам аддзела бібліятэчнага маркетынгу зроблены і раздадзены памяткі па пераадольванню асноўных праяў стрэсу

і трывожнасці перад экзаменамі, лістоўкі па бяспечнаму карыстанню інтэрнэтам.

Вялікая ўвага ў ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” надаецца прафілактыцы п'янства, алкагалізму і тытунекурэння. З мэтай больш шырокага інфармавання па тэме шкодных звычак у бібліятэцы створаны і сістэматычна папаўняюцца электронныя базы дадзеных па тэмах “Здоровый образ жизни”, “Вредные привычки”, “Алкоголизм: профилактика и лечение”, “Алкоголь и здоровье”.

На працягу года ў бібліятэках для розных катэгорый карыстальнікаў праведзена мноства мерапрыемстваў па папулярызацыі здаровага ладу жыцця: слайд-гутарка “День здоровых советов”, конкурсна-забаўляльная праграма “Спорт – это здоровье”, конкурсная праграма “Во дворе у нас игра”, гутарка-парада “Скажи здоровью “да”, інтэрактыўная гутарка “За здоровый образ жизни голосует молодёжь”, гадзіна разважанняў “Здоровая семья – здоровая страна” (Барысаўскі раён); хвілінка бяспекі “Мудрасць здаровага ладу жыцця”, інфармацыйная гадзіна “Дыспансерызацыя як метад здароўязберажэння”, эрудыт-хвілінка “30 пытанняў пра здароўе”, інфармацыйная гадзіна ў рамках літаратурна-спартыўнага марафона бібліятэчных мерапрыемстваў “Книга и спорт – движение вперед!” (Вілейскі раён); бібліятэчны квілт “Мы за здоровый образ жизни”, акцыя “Сегодня – День здорового питания” (Дзяржынскі раён); актуальны дыялог “Мы – за жыцце без наркотыкаў”, флэшбук “Библиотека за здоровье 21 века”, шоў-гульня “Волшебный квадрат здоровья” (Капыльскі раён); гадзіна добрых парад “Здароўе без лекаў”, інфармацыйны калейдаскоп “Простыя рэцэпты здароўя” (Лагойскі раён); час карыснай інфармацыі “Шануй свае здароўе”, інфамікс “Каждый должен твёрдо знать – здоровье надо сохранять”, акцыя “Я здоровье берегу – сам себе я помогу”, спрынт-гульня “Здоровье –это здорово”, гульня-конкурс “Здароўе згубіш – новае не купіш” (Любанскі раён); сустрэча з фельчарам ФАПа “Дапамажы сабе сам”, тэматычная гадзіна “Першая дапамога” (Маладзечанскі раён); гадзіна здароўя “Будь здоров! всегда здоров!”, прэс-дайджэст “Здароўе на ўсе гады”, гадзіна інфармацыі “Здароўе – гэта здорава”, інфарміна “Образ жизни – только здоровый”, пазнавальная гадзіна “Моё здоровье” (Мінскі раён); аздараўленчы занятак “Золотые правила питания”, PARTY-BOOM “Да спорту!”, літаратурна-прафілактычны квіз “Мой

выбар – здароўе”, гучныя чытанні “Быть здоровым я хочу – пусть меня научат”, палітра меркаванняў і прапаноў “Мой стиль жизни сегодня – мое здоровье и успех завтра”, запрашэнне да развагі “Здароваму ладу жыцця – да!”, тэрыторыя здароўя “Спорт – гэта сіла і здароўе”, квэст-гульня “Исцеляющая сила сказки”, час бібліятэрапіі “Да здароўя з кнігай”, панарама добрых парадаў “Здаровы лад жыцця: спытай у кнігі”, кнігатэрапія “Здаровы лад жыцця: спытай парадаў ў кніг” (Слуцкі раён).

Асабліва востра паўстала пытанне аховы здароўя ў 2020 годзе ў сувязі з успышкай глабальнай эпідэміі COVID-19. Дадзенае захворванне прымусіла ў корані перагледзець стаўленне людзей не толькі да ўласнага здароўя, але і здароўя навакольных. Вялікая праца па прафілактыцы каронавіруса была праведзена ў бібліятэках Мінскай вобласці: ва ўстановах на бачных месцах размяшчаліся інфармацыйныя матэрыялы пра дадзенае захворванне, афармляліся кніжныя выставы і тэматычныя паліцы, праводзіліся прафілактычныя гутаркі з рознаўзроставымі чытачамі.

Прафілактычная размова “Все о коронавирусе” прайшла ў сельскай бібліятэцы в. Ганцавічы Барысаўскага раёна. Бібліятэкар Алеся Янкоўская распавяла чытачам аб віруснай інфекцыі і верагодных спосабах заражэння каронавірусам, свой аповяд падмацавала інфармацыяй, прадстаўленай на афіцыйным сайце ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” у пункце меню “Узнайте больше о профилактике COVID-19” (http://www.borlib.by/chitatelyam/bezopasnost/102-bezopasnost/2603-informatsionnyj-material-po-profilaktike-rasprostraneniya-koronavirusa). На працягу года ў дадзеным раздзеле збіралася самая аператыўная і афіцыйная інфармацыя аб развіцці сітуацыі з каронавірусам ў Беларусі.

Бібліятэкары Лагойскай дзіцячай бібліятэкт арганізавалі і правялі ўрок здароўя “COVID-19: как уберечь себя”. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся пра тое, як актыўны лад жыцця ўплывае на імунітэт чалавека і чаму складана прытрымлівацца правілаў здаровага ладу жыцця. Прагучала змястоўная інфармацыя пра каронавірусную інфекцыю, а завяршылася мерапрыемства віктарынай “Я і маё здароўе”. Гутаркі па прафілактыцы каронавіруснай інфекцыі правялі ўсе бібліятэкі раёна.

Сваткаўская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна запрасіла на інфаўрок “Веды супраць страху”. Навучэнцы

атрымалі інфармацыю, дзе і калі з’явілася ўпершыню страшная хвароба COVID-19, з якой хуткасцю разпаўсюджваецца, а таксама пазнаёміліся са статыстыкай. У гэты складаны час, калі ў свеце лютуе страшны вірус, бібліятэка асаблівую ўвагу ўдзяляе мерапрыемствам па барацьбе і мерах перасцярогі. З дарослымі і дзецьмі праводзяцца гутаркі: “COVID-19: 3 спосабы абароны сябе і сваіх блізкіх”, гутаркі ля выставы “Асноўныя меры засцярогі для абароны ад COVID-19”, інфарміны “Асцярожна: каронавірус! COVID-19”, “Что нужно знать о коронавирусе сегодня”, а плакаты і лістоўкі з’яўляюцца наглядным матэрыялам.

У сувязі са складанай эпідэміялагічнай сітуацыяй, якая склалася ў краіне ў 2020 годзе, ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка” надавала вялікае значэнне тэме зароўя і здаровага ладу жыцця. У верасні на базе бібліятэкі адбыўся актуальны дыялог “Папярэджаны – значыць узброены” паміж супрацоўнікамі і спецыялістам раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, накіраваны на прафілактыку вірусных захворванняў.

У бібліятэках па прафілактыцы COVID-19 праведзены: інфармацыйная гадзіна “Что нужно знать о коронавирусе”, інфармацыйныя хвілінкі “COVID-19”, інфармацыйныя хвілінкі “Защити себя и своих близких”, раённы семінар “Приоритетные направления деятельности библиотек Борисовского региона”, электронная прэзентацыя “От чумы до…: следы эпидемии в художественной литературе”, віртуальная выстава “Вирус против человека” (Барысаўскі раён); тэматычная выстава “Каранавірус: ведаць, каб змагацца” (Валожынскі раён); гутарка “Асцярожна, вірус!”, інфармхвілінка “Асцярожна, інфекцыя”, інфармхвілінка “Социальное дистанцирование в период коронавируса”, інфармацыйная выстава “Коронавирус. Знай. Соблюдай. Выполняй” (Капыльскі раён); інфагадзіна ”Короновирус. Что надо знать!”, інфармацыйны стэнд “Увага! Увага! Увага!”, рэкамендацыйная гадзіна “Приручить проблему”, рэкамендацыйная гадзіна “Не время снимать маски”, інфармацыйная гадзіна “СТОП короновирус: всё, что нужно знать” (Мінскі раён); гутарка “Выконваем правілы рэспіраторнага этыкету”, гутарка “Сацыяльнае дыстанцыраванне ў перыяд каронавіруса”, гутарка “Парады для людзей старэйшага і пажылога ўзросту з хранічнымі захворваннямі”, гутарка “Выконваем правілы паводзін пры каронавіруснай пандэміі”, гадзіна валеалогіі “Не будзь заложнікам шкодных звычак”, гадзіна-

інфарміна “Каронавірусу скажам: “Не!” (Мядзельскі раён); дыялог з удзелам памочніка ўрача-эпідэміёлага “Наше здоровье – в наших руках” (Уздзенскі раён).

Прафілактыцы тытунекурэння ў бібліятэках Міншчыны надаецца вялікае значэнне.

Да Міжнароднага дня адмовы ад курэння: у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” прайшла ЗЛЖ-акцыя “Жизнь без сигарет”. Наведвальнікам была прадстаўлена выстава “Откажитесь от вредных привычек!”, дзе можна было пазнаёміцца з кнігамі і артыкуламі з перыядычнага друку аб негатыўным уздзеянні тытуню і курэння на арганізм чалавека, пра спосабы барацьбы з гэтай шкоднай звычкай

Бібліятэкі Капыльскага раёна прынялі ўдзел у фотаконкурсе ў падтрымку здаровага ладу жыцця ў Instagram. Размясцілі фатаграфіі хатняга адпачынку без цыгарэт з хэштэгамі “#сидим_дома_не_курим, а...”, “#ЗОЖрулит”, “#Беларусь_против_табака”.

У сценах ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” прайшла агітацыйная акцыя “Мы против курения”, у якой прынялі ўдзел шматлікія наведвальнікі і чытачы бібліятэкі. Ім было прапанавана прайсці невялікае бліц-апытанне, падзяліцца сваімі разважаннямі на гэтую з’яву сучаснасці ці рэцэптамі збаўлення ад гэтай дрэннай звычкі, а самыя актыўныя зрабілі сэлфі з постэрам.

Да Сусветнага дня без тытуню супрацоўнікамі ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” была падрыхтавана акцыя “Лета без тытуню”, якая праводзілася пад час працы летняй чытальнай залы. Жыхары горада мелі магчымасць не толькі пазнаёміцца з літаратурай па здаровым ладзе жыцця, але і праверыць свае веды па гэтай тэме, паўдзельнічаць у віктарыне-апытанні “Сустракаем лета без цыгарэты”, запісацца ў бібліятэку. Гараджане падтрымалі акцыю, большасць з іх выказвалі негатыўныя адносіны да курэння.

Нарацкая пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна правяла сумесна з Нарацкай СШ №2 круглы стол “Моладзь супраць тытуню” для вучняў 9 класаў. Бібліятэкар падрыхтавала агляд літаратуры “Жыццё без цыгарет: пагаворым адкрыта”. Вучні паглядзелі кінафільм “Глупая привычка” і абмеркавалі яго. Псіхолаг Соніч А.Я. падрыхтавала прэзентацыю “С пользой проводите свободное время”,

расказала пра гурткі і спартыўныя секцыі. Многія вучні расказалі пра свае заняткі, і што ім няма часу думаць пра алкаголь і тытунь, яны выбіраюць здаровы лад жыцця.

Сумесна з раённым цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі ў ДУК "Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка" арганізавалі сустрэчу "Папиросо. Табако. Сигаро. А стоит ли?". Падчас мерапрыемства інструктар-валеолог Святлана Васінцава распавяла вучням пра шкоду курэння, прадэманстраваўшы відэапрэзентацыю. Прысутныя даведаліся пра Дзяржаўную праграму "Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь на 2016 – 2020 гады" і дзеючы на тэрыторыі Чэрвеньскага раёна праект "Горад Чэрвень – Здаровы горад", мэтай якога з'яўляецца папулярызацыя здаровага ладу жыцця сярод насельніцтва.

Па прафілактыцы тытунекурэння ў бібліятэках вобласці прайшлі такія мерапрыемствы, як: флэшмоб "Подари себе чистые лёгкие", акцыя "Дело о сигарете", гутарка-гульня "Кто курит табак, тот сам себе враг", інфармацыйная хвілінка "Влияние табака на здоровье подростка" (Барысаўскі раён); вулічная акцыя "Выбар за вамі! Адмоўцеся ад чарговай цыгарэты! Выбірайце здароўе!", віртуальная выставы "Курыць – здароўю шкодзіць" (Бярэзінскі раён); гадзіна здароўя "Супраць нікатынавага дурману", вечар пытанняў і адказаў "Сигарета – это яд для больших и маленьких", круглы стол "Искушение ядом", размова "Курение или здоровье – выбор за вами", гадзіна здароўя "Горькие плоды сладкой жизни" (Вілейскі раён); вечар-пратэст "Сигарете – НЕТ", бібліятэчны квілт "Курение – добровольное безумие", гадзіна-спрэчка "Не кури – свежим воздухом дыши" (Дзяржынскі раён); гульня "Будьте здоровы! Поговорим о вреде курения", літаратурнае знаёмства "Жизнь без табака", інфармацыйная гутарка "Если курит человек, то коротким будет век" (Капыльскі раён); акцыя "Планета без тытунёвага дыму", інфармацыйная гадзіна "Курение – опасная привычка", прафілактычная гутарка "Не сократи свою жизнь, однажды попробовав сигарету", гадзіна пратэста "Затуши сигарету" (Клецкі раён); інфармацыйная гадзіна "Небяспечная звычка курыць", дыспут "Няшкодных цыгарэт не бывае" (Лагойскі раён); інфармацыйная акцыя "Дыши легко, живи свободно!", дыспут "Пристрастия, уносящие жизнь", ролевая гульня "Обвиняется… Вредная привычка", дзень здароўя "Дань сигарете – здоровье на ветер", акцыя "Отказаться от курения"(Любанскі раён);

літаратурны хіт-парад “Сцвярджае мудрых кніжак рад: курэнне – смерць, а тытунь – яд!”, гадзіна інфармацыі “Я не курю”, тэматычная гадзіна “Курэнне – небяспечнае захапленне”, гутарка-перасцярога “Жизнь без табака”, прагляд відэафільмаў “Дым, уносящий здоровье” (Мінскі раён); дзень інфармацыі “Цукерка ці цыгарэта”, хвіліны трывожнай інфармацыі “Дым, які забірае здароўе”, бібліятэчны квілт “Пра шкоду курэння”(Пухавіцкі раён).

Цыкл прафілактычных гутарак “Влияние вредных привычек на репродуктивное здоровье подростка” у рамках міжведамаснай праграмы “Формула здоровья” прашлі ў духоўна-асветніцкім цэнтры ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева”. Псіхолаг УАЗ “Барысаўскі радзільны дом” Кацярына Дзмітрыеўна Русанава распавядала вучням пра важнасць рэпрадуктыўнага здароўя чалавека для стварэння паўнавартаснай і здаровай сям'і, а бібліятэкар Алена Іваненка – аб негатыўным уздзеянні наркатычных ядаў на чалавечы арганізм. У канцы сустрэч арганізатары ўручылі падлеткам інфармацыйныя буклеты па прафілактыцы наркаманіі.

Па прафілактыцы наркаманіі ў ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” створаны пакет тэматычных і інфармацыйных матэрыялаў для распаўсюджвання сярод дзяцей, падлеткаў і іх бацькоў, а таксама для выкарыстання ў працэсе правядзення прафілактычных мерапрыемстваў: папка інфармацыйных матэрыялаў – памяткі, буклеты, закладкі: “Нет!” наркотикам. Я выбираю жизнь”, “Наркотики – пожизненная ломка. Не ломай себе жизнь”, “Скажи наркотикам “Нет!”. Скажи жизни “Да!”, “Правда и мифы о наркотиках”, “Сегодня модно быть успешным, активным, талантливым и здоровым!”, “Существует мир без наркотиков – открой его для себя”, “Закон против наркотиков”, “Скажи “Нет!” наркотикам”, “Что ты знаешь о наркотиках?”, “Твоя жизнь в твоих руках. Скажи “Нет!” наркотикам”; папка сцэнарных матэрыялаў (з перыядычных выданняў) па прафілактыцы наркаманіі круглы стол “Скажи наркотикам “Нет!”, занятак з элементамі псіхатрэнінгу “Шаг в пропасть”, гадзіна зносін “Человек и наркотики”, ролевая гульня “Суд над спайсом”, інфармацыйная гадзіна “Нет” наркотикам! Мой выбор – здоровый образ жизни!”; банк даных відэаматэрыялаў (43 шт.) Памерам 4,58 ГБ.

Бібліятэкар Суднікаўскай сельскай бібліятэкі Валожынскага раёна падрыхтавала гадзіну-перасцярогі “Толькі мы самі ў адказе

за свае здароўе”. Бібліятэкар распавяла прысутным аб сучаснай сітуацыі ў свеце, нашай краіне, а так сама правяла невялікі інфармацыйны агляд артыкулаў прысвечаных праблеме распаўсюджвання наркатычных рэчываў. Выснова адна – праблема наркаманіі тычыцца кожнага чалавека і кожны павінен ведаць пра тое, што такое наркотыкі і аб наступствах іх ужывання.

Цімкавіцкая сельская бібліятэка Капыльскага раёна правяла размову з вучнямі старэйшых класаў пра небяспечнасць ужывання “спайсаў”, наступствы і адказнасць з праглядам відэафільма “Паляванне за розумам” з цыкла “Журналистские расследования”, які дэманстраваў прыклады раскрыцця злачынстваў дадзенага накірунку.

На гадзіну карысных зносін “Суд над наркотыкамі” запрасіла падлеткаў Заастравецкая сельская бібліятэка Клецкага раёна. Удзел у мерапрыемстве прыняла ўрач-тэрапеўт Заастравецкай участковай бальніцы Альшэўская Ангеліна Міхайлаўна. Дзякуючы гэтай сустрэчы, рабяты яшчэ раз пераканаліся ў тым, што жыццё – гэта самая вялікая каштоўнасць чалавека, а хвілінная слабасць ці незразумелае жаданне быць модным сярод аднагодкаў (ужываючы наркатычныя сродкі) у адно імгненне могуць абарваць іх кароткае жыццё. На памяць ад урача падлеткі атрымалі буклеты “Наркаманія – праблема века” і “Наркотыкі – знак бяды”.

Пазнавальная гадзіна “У будучыню без наркотыкаў” адбылася ў Гасцілавіцкай сельскай бібліятэкі Лагойскага раён. Моцнае ўражанне атрымалі школьнікі ад відэапрэзентацыі “Права на жыццё” пра наркатычную залежнасць і наступствы пасля ўжывання наркотыкаў. У фільме гучалі рэкамендацыі для падлеткаў, якія апынуліся перад выбарам: спрабаваць наркотык ці сказаць цвёрдае “не”.

У сельскай інтэграванай бібліятэцы в. Раёўка Маладзечанскага раёна прайшоў тэматычны урок да Міжнароднага дня барацьбы з наркаманіяй “Даётся жизнь один лишь раз”. Адбылося азнаямленне прысутных з наступствамі ўжывання наркотыкаў, і навыкамі бяспечных паводзін з асобамі, якія ўжываюць наркатычныя рэчывы і якія спрабуюць прыахвоціць іншых да наркотыкаў.

У Каладзішчанскай сельскай бібліятэцы № 1 Мінскага раёна адбылася прафілактычная бяседа “Разам супраць! Разам за!”, якая была накіравана на павышэнне эфектыўнасці папярэджання і распаўсюджвання наркатычных і псіхатропных рэчываў і іх

аналагаў сярод падрастаючага пакалення. Правяла бяседу – загадчык аддзялення грамадскага здароўя "Мінскага занальнага цэнтра Цгіэ" Мітрайкіна Ю. В. разам з ўчастковым інспектарам Заяц А. А. Падчас мерапрыемства ўдзельнікі пазнаёміліся з брашурамі і літаратурай па дадзенай тэме. У арганізацыі і правядзенні мерапрыемства прынялі ўдзел непаўналетнія, якія знаходзяцца на розных відах уліку.

Для вучняў старэйшых класаў прайшло мерапрыемства "Все краски мира против наркотиков" у Сноўскай сельскай бібліятэцы Нясвіжскага раёна. Прысутным было расказана пра тое, што наркаманія з'яўляецца самай жорсткай сярод усіх шкодных звычак. Яна забівае чалавека і фізічна, і маральна. Працэс дэградацыі адбываецца вельмі хутка: на працягу літаральна некалькіх гадоў чалавек цалкам змяняецца. Быў паказаны відэафільм "Наркотики: правда и ложь".

У ДУК "Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка" адбылася дыялогавая пляцоўка "Табе дадзена права выбару". Навучэнцы 8-х класаў ДУА "Гімназія № 1 г. Салігорска" прыйшлі на сустрэчу з псіхолагам Салігорскага ПНД. Размова ішла пра небяспеку пашырэння наркаманіі ў маладзёжным асяроддзі, аб узнікненні хуткай залежнасці чалавека ад наркотыкаў.

12 лютага бібліятэкар Клянніцкай сельскай бібліятэкі Смалявіцкага раёна Лявончык С. М. сумесна з педагогам Клянніцкай школы Кнышавай М. М правялі інтэрактыўны дыялог "Будучыня без наркотыкаў". Навучэнцы 6-9 класаў адказвалі на пытанні па тэме "Што такое наркотыкі, наркаманія, прычыны і наступствы ўжывання наркотыкаў". Былі праведзены прыклады з жыцця пра тое, якімі цяжкімі наступствамі заканчваецца маладзёжнае захапленне наркотыкамі. Дапоўніў мерапрыемства прагляд сацыяльнага відэароліка "Скажы "НЕ" наркотыкам". Напрыканцы дыялогу падлеткамі была зробленая аб'ектыўная выснова – наркотыкі забіваюць надзею, радасць і волю, а галоўнае – яны пазбаўляюць чалавека жыцця.

Пад няспыннай увагай бібліятэк Міншчыны заўсёды знаходзіцца тэма наркаманіі. У 2020 годзе прайшлі: гадзіна інфармацыі "Оставайся на линии жизни", слайд-гутарка "Подумай о себе – выбери завтра", гадзіна пратэсту "Объявляем злу мы бой – наркоманию долой!", дзелавая гульня "Суд над наркотиками", гутарка "Вместе против наркотиков", гутарка "Имя беды – наркотики", гадзіна-папярэджанне "Осторожно! Наркотики!",

гадзіна карысных ведаў “Скажи “нет” наркотикам” (Барысаўскі раён); гадзіна трывожнай інфармацыі “У палоне ілюзій”, дзень адкрытых думак “Наркотык – знак бяды”, шок-інфарміна “Знесеныя гераінам” (Бярэзінскі раён); антынаркатычная акцыя “Мы выбіраем жыццё!”, гадзіна абмеркавання “Цена зависимости – жизнь”, мультымедыйная прэзентацыя “Наркаманія: ад адчаю да надзеі”, вечар-роздум “Беда по имени Наркотики” (Вілейскі раён); відэапрагляд “Наркотики между жизнью и смертью”, гадзіна развагі “Наркотики – билет в один конец”, скрыжаванне меркаванняў “Наркотики или жизнь – выбор за тобой”, урок здароўя “Наркаманія: ад адчаю да надзеі” (Дзяржынскі раён); актуальны дыялог “Мы – за жыцце без наркотыкаў”, час прафілактыкі “Цени собственную жизнь”, тэматычны час з праглядам відэароліка “Наркомания – путь в пропасть”, размова “Спайс –проблема личности, спайсы – проблема общества” (Капыльскі раён); гадзіна-развага “ Наркотыкі: падарожжа туды без назад”, гадзіна зносін “Наркотыкі – праблема асобы, наркотыкі – праблема грамадства”, гадзіна інфармацыі “Наркотыкі. Закон. Адказнасць” (Крупскі раён); гутарка-парада “Не зламі свой лёс”, гутарка “На краю пропасти”, інфармацыйная гадзіна “Наркотыкі і наступствы іх ужывання”, віртуальная выстава “Ведаць, каб не аступіцца” (Лагойскі раён); гутарка-дыялог “Наркаманія і падлетак”, гадзіна інфармацыі “Наркаманія – міфы і рэальнасць”, прафілактычная гутарка “Наркаманія: хвароба, альбо злачынства”, гадзіна перасцярогі “Отдам предпочтение жизни без наркотиков”, зоркавае шоу “Рок-звёзды против наркотиков”, экспрэс-інфармацыя “Наркаманія – знак бяды” (Любанскі раён); інфармацыйны агляд “Знать, чтобы уберечь себя”, размова-перасцярога “Не проколи себе душу”, прафілактычная размова з мед.работнікам “Вместе против наркотиков”, гутарка “В будущее без наркотиков” (Мінскі раён); інфармацыйная гадзіна “Як не стаць ахвярай наркаманіі”, гутарка “Трагедыя наркамана: першы крок або замкнёны круг” (Пухавіцкі раён); гутарка за круглым сталом “Подростки и вредные привычки”, наркастоп “Выбери независимость”, відэаэнцыклапедыя “Наркомания, личность и здоровье”, акцыя-пратэст “Мы – за жизнь без наркотиков!” (Жодзіна).

Міжнародны Дзень памяці людзей, якія памерлі ад СНІДу, традыцыйна праводзіцца ў трэцюю нядзелю мая. Да гэтага дня 17 мая ў гарадской бібліятэцы №1 г. Барысава прайшоў флэшмоб

“Остановись и подумай”. На працягу дня бібліятэкары прапаноўвалі жыхарам мікраараёна прымацаваць да свайго адзення чырвоныя стужачкі, як сімвал барацьбы са СНІДам і раздавалі памяткі “ВІЧ / СНІД: ведаць, каб жыць”. Дзень памяці – гэта яшчэ адна магчымасць паказаць рэальную блізкасць праблемы і нагадаць пра тое, што для абароны ад ВІЧ-інфекцыі неабходна выконваць нескладаныя правілы бяспечных паводзін і своечасова абследавацца на ВІЧ.

Прэс-дайджэст “#СТОПВИЧСПИД#” адбыўся ў Тучанскай сельскай бібліятэцы Клецкага раёна. Мерапрыемства было прысвечана разважанням, адказам на сур’ёзныя пытанні, якія тычацца СНІДу і ВІЧ. Пасля “мазгавога штурму” рабяты адказалі на галоўнае пытанне: “А як ты можаш абараніць сябе ад ВІЧ?”, а адказы запісалі на невялікіх сэрцайках. З мэтай прыцягнення ўвагі да праблемы СНІДу у гэты дзень усе наведвальнікі бібліятэкі таксама маглі напісаць адказы на сэрцайках, азнаёміцца з літаратурай, прадстаўленай на выставе “Ведаць, каб жыць” і ўзяць дадому буклеты-закладкі

У Маладзечанскай гарадской бібліятэцы-філіяле №1 правялі для навучэнцаў УА “Маладзечанскі дзяржаўны каледж” пазнавальную праграму “Стоп! СНІД!”. У ходзе мерапрыемства прайшла гутарка “Што вы ведаеце аб ВІЧ/СНІД?” і бліц-апытання “Што вы ведаеце пра ВІЧ-інфекцыю?” У заключэнні мерапрыемства кожны атрымаў чырвоную стужачку, як сімвал барацьбы са СНІДам, і буклет з інфармацыяй пра прафілактыку, абследаванні, лячэнне віруса імунадэфіцыту чалавека.

Да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам бібліятэкары ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка” ў СШ № 2 для вучняў старэйшых класаў падрыхтавалі і правялі мультымедыйную гадзіну “Цени жизнь! Скажи СПИДу – Нет!”. З дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі школьнікам распавялі пра ВІЧ-інфекцыю, СНІД, пра тое, як ВІЧ пераходзіць у стадыю СНІД, аб мерах прафілактыкі. Напрыканцы мерапрыемства ўсім ўдзельнікам былі раздадзены лагатыпы з чырвонай стужкай, якая сімвалізуе Міжнародную барацьбу са СНІДам.

З мэтай фарміравання ў насельніцтва ўсведамлення важнасці праблемы ВІЧ/СНІДу і асабістай адказнасці за свае паводзіны і выхавання талерантнасці ў адносінах да ВІЧ-інфіцыраваных, у бібліятэках прайшлі: ток-шоў “Нет группы риска, рискуют все”, трыбуна адкрыцьця “Зачем планету губит СПИД?”, інфармацыйныя

хвілінкі “СПИД – глобальная проблема человечества”, відэалекторыі па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі “Касается даже тех, кого не касается!”, інфармацыйная гадзіна “Чтобы жизнь не прошла мимо”(Барысаўскі раён); факт-урок “Удар ВИЧ-инфекции”, відэалекторый “СНІД не выбірае. Выбіраеш ты!”, размова з медработнікам “Праўда і міфы пра СНІД”, гутарка “СПИД – зловещая тень над миром” (Вілейскі раён); урок-перасцярога “Мішэнь СНІДу – моладзь”, паліца-парада “СПИД без грима”, выстава-прызыў “Осторожно: СПИД” (Дзяржынскі раён); гадзіна папярэджання па тэме”ВИЧ. Как себя защитить”, гадзіна здароўя “СНІД – даведайся больш”, гадзіна пытанняў і адказаў “Аб СНІДзе ад А да Я”, флэшмоб “Вместе против СПИДа” (Капыльскі раён); прафілактычная гутарка “Цвети жизнь, а не СПИД”, вечар пытанняў і адказаў “СНІД побач з намі” (Клецкі раён); пазнавальная гадзіна “СНІД – час задумацца” , акцыя “Разам супраць СНІДу” (Крупскі раён); акцыя “Разам супраць СНІДу”, інфармацыйная гадзіна “СНІД – трывога чалавецтва”, актуальны дыялог “Астанавіць СНІД” (Лагойскі раён); слайд-лекцыя “Судьбы оборванная нить”, выхаваўчая гадзіна “ВИЧ не передаётся через дружбу. Оставайтесь людьми”, актуальная гадзіна “СПИД – не вина, а беда”, актуальны дыялог “СНІД – прагноз сумны”, акцыя-пратэст “Моладзь супраць СНІДу”, гутарка “Прафілактыка ВІЧ/СНІД” (Любанскі раён); актуальная размова “Навошта планету губіць СНІД”, акцыя “Чырвоная стужка” (Мінскі раён); урок-перасцярога “СНІД. Кошт адной памылкі”, пазнавальная гутарка “Каб жыццё не прайшло міма”, тэст-самаправерка “СНІД: небяспечна не ведаць”, тэматычная дыскатэка “СНІД – ахвяры павялічваюцца”, трэнінг “Вашы веды аб ВІЧ, СНІДе”, інфармацыйная гадзіна “Пра СНІД гучна і сур'ёзна” (Пухавіцкі раён).

У рамках “Тыдня цвярозасці” Ардзянская сельская бібліятэка-клуб Клецкага раёна правяла інфарміну “Фактары рызыкі піўнога алкагалізму”. Праведзена анкетаванне, падчас якога ўдзельнікі мерапрыемства вызначалі фактары і прычыны ўзнікнення алкагалізму. Пад час мерапрыемства была дадзена інфармацыя аб становішчы алкагольнай залежнасці ў Беларусі, агучаны гістарычныя і сучасныя факты аб барацьбе з алкагалізмам, для нагляднасці работнікам былі ўручаны інфармацыйныя буклеты пра шкоду алкаголя.

У Маладзечанскай гарадской бібліятэцы-філіяле №1 прайшла акцыя-перасцярога "Пить – здоровью вредить!". Наведвальнікам прапаноўвалася інфармацыя аб гісторыі ўзнікнення алкоголю, яго "злавесным шэсці" па планеце, здаровым ладзе жыцця як альтэрнатыве пь'нству, актыўным супрацьстаянні гэтай праблеме.

На працягу года бібліятэкі Мінскай вобласці вялі рэгулярную працу па прафілактыцы алкагалізму сярод насельніцтва з дапамогай розных мерапрыемстваў прафілактычнага і папераджальнага характару. Сярод іх: інфарміна "У края пропасти", інфармацыйная гадзіна "Алкоголь путь в никуда", гадзіна інфармацыі "Глоток беды", інфармацыйна-конкурсная праграма "В трезвости сила" (Барысаўскі раён); дыскусія "Уздзеянне алкаголю на арганізм" (Валожынскі раён); сустрэча з медыцынскім работнікам "Похитители рассудка", урок здароўя "Трезво жить – век не тужить", гадзіна інфармацыі для роздуму "Горькая правда о пиве", гадзіна-роздум "Трезвый взгляд на жизнь" (Вілейскі раён); бібліятэчны квілт "Цвяроза жыць – сто год не тужыць", гадзіна роздуму "Цвярозасць – норма жыцця" (Клецкі раён); гутарка "Алкаголь – опасная ловушка", тэматычная гадзіна "Чым пагражае алкагалізм", тэст-апрос "10 вопросов о потреблении алкоголя", агляд літаратуры "Опасное увлечение", выхаваўчая гадзіна "Береги себя для жизни" (Мінскі раён); брыфінг "Пиво: мифическая польза или реальный вред", дыялог зацікаўленых асоб па праблемах алкагалізма "Храни себя от бед, пока их нет" (Уздзенскі раён); сустрэча з начальнікам па справах непаўналетніх "От вина гибнет красота", бібліятэчны квілт "Алкаголь – ілюзія свабоды"(Чэрвеньскі раён); акцыя "Мы не пьём – мы поём", псіхалагічны трэнінг "Человек и зависимость", інфармацыя + рэкамендацыя "Сказать "нет" – дать обет", бібліятэчны квілт "Алкоголь: иллюзия свободы" (Жодзіна).

Прыхільнікаў здаровага ладу жыцця збірае на свае пасяджэнні культурна-аздараўленчы клуб "Аір" (кіраўнік Войцік А.А., бібліятэкар ЦБ), які больш за 20 гадоў плённа працуе пры ДУ "Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка". Клуб ставіць сваёй мэтаю выхаванне патрэбнасці чалавека ў здаровым ладзе жыцця як спосабе дасягнення гармоніі з навакольным асяроддзем. Дэвіз клуба – "Аздараўленне праз асвету". Фіксаванага членства ў клубе няма і яго наведвальнікам можа быць любы жадаючы, але ўсё ж маецца асноўны састаў – тыя хто пастаянна дапамагае рыхтаваць пасяджэнні і актыўна прапагандуе іх. А гэта –

супрацоўнікі бібліятэкі, медыцынскія работнікі, настаўнікі і чытачы, якія цікавяцца пытаннямі здаровага ладу жыцця.

У ДУ "Мінская раённая цэнтральная бібліятэка" дзейнічае клуба здароўя "Біруза".

Асаблівую ўвагу прафілактыцы шкодных звычак надае бібліятэкар Сейлавіцкай інтэграванай сельскай бібліятэкі Нясвіжскага раёна. На базе бібліятэкі дзейнічае клуб "Крепыш" па фарміраванню здаровага ладу жыцця. Удзельнікі клуба – вучні 3-6 класаў ДУА "Сейлавіцкі НПК дзіцячы сад – сярэдняя школа", а таксама дзеці з неблаганадзейных сем'яў. У рамках рэалізацыі дадзенага кірунку былі арганізаваны разнастайныя мерапрыемствы.

Устаноўка на здаровы лад жыцця, прафілактыка негатыўных з'яў – аснова дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў для дзяцей і моладзі "Азбука здароўя" і "Оранжевый рай", створаных пры Залужскай сельскай бібліятэцы-клубе Старадарожскага раёна.

У ДУК "Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка" аддзелам абслугоўвання і інфармацыі паспяхова працуе аматарскае аб'яднанне для падлеткаў і моладзі "Молодёжный перекрёсток". Яго мэта – прапаганда здаровага ладу жыцця.

З 2002 г. у ДУК "Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна" працуе клуб "Ключ к здоровью", на занятках якога выступаюць урачы, спецыялісты і людзі, якія вядуць здаровы лад жыцця. Бібліятэкары арганізуюць кніжныя выставы-прагляды, праводзяць агляды літаратуры.

## Патрыятычнае выхаванне

Патрыятычнае выхаванне з'яўляецца адным з важнейшых напрамкаў работы бібліятэкі ў мінулым годзе. У рабоце бібліятэк па патрыятычнаму выхаванню можна вылучыць наступныя напрамкі: выхаванне беражлівых адносін да гістарычнай спадчыны, прапаганда дзяржаўных сімвалаў, выхаванне павагі да мовы і традыцый. Знакавымі ў патрыятычным выхаванні з'яўляюцца мерапрыемствы бібліятэк, прысвечаныя гістарычным датам і падзеям.

Супрацоўнікамі сектара бібліятэчнага маркетынгу ДУК "Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік" быў распрацаваны інтэрнэт-праект "У памяці кніжнай – імгненні вайны" (2019-2020 гг.), прысвечаны 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі

савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Праект прадугледжвае знаёмства карыстальнікаў з кнігамі на дадзеную тэму. Матэрыялы праекта даступныя на сайце ДУК "Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Новік" і ў сацыяльных сетках бібліятэкі. Праект налічвае каля 50 бібліяграфічных аглядаў.

У бібліятэках г. Салігорска прайшоў цыкл мерапрыемстваў "Вялікае слова – ПЕРАМОГА". Працягвалася рэалізацыя сацыякультурнага праекта "Храним подвиг. Гордимся Победой", які спрыяе выхаванню ў маладога пакалення патрыятычных пачуццяў на аснове культурна-гістарычных каштоўнасцяў, пераемнасці пакаленняў. У красавіку ў рамках моладзевага чэлендж-праекта "ПРЭС маршрут з бібліятэкай" у раённай цэнтральнай бібліятэцы стартавала social-эстафета "І зноў зацвітае бэз 45-га года". Да эстафеты падключыліся навучэнцы не толькі ўстаноў адукацыі горада, але і раёна. Супрацоўнікі бібліятэкі прапанавалі маладым людзям у гонар абаронцаў краіны пасадзіць сімвал Перамогі – бэз.

У Крупскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы работа вялася ў рамках патрыятычнага праекту "Память о войне бессмертна", у рамках якога былі праведзена акцыя "Прачытанная кніга аб вайне – наша падзяка за Вялікую Перамогу", конкурс дзіцячых малюнкаў "Вайна вачыма дзяцей", віртуальнае падарожжа "Іх імёнамі названы вуліцы горада" і яшчэ шмат цікавых мерапрыемстваў.

Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы да 75-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне рэалізуе праект "Жывыя вуліцы", з дапамогай якога знаёміць маладое пакаленне з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны праз відэаролікі. Праект накіраваны на ўсе ўзроставыя групы насельніцтва горада Нясвіжа, мэта якога – пазнаеміць жыхароў горада з гісторыяй вуліц, названых імёнамі герояў. Супрацоўнікі бібліятэкі з дапамогай навучэнцаў Нясвіжскага дзяржаўнага каледжа імя Я. Коласа запісалі 2 фільма пра герояў Вялікай Айчыннай вайны, чые імёны назаўсёды застануцца ў гісторыі Нясвіжа і Нясвіжскага раёна.

У справаздачным годзе ў ДУК "Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка" быў рэалізаваны праект па стварэнню віртуальнай галерэі "Героі Перамогі", якая ўключае 25 гераічных жыццёвых гісторый удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. На сайце ДУК "Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка" ўсе жадаючыя змаглі

пазнаёміцца з героямі праекта –вайскоўцамі, вязнямі канцлагераў, працаўнікамі тылу.

Працягваў сваю работу праект ДУК “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка” па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню падрастаючага пакалення “Память нужна нам, молодым”. У рамках праекта да 75-годдзя Вялікай Перамогі ва ўсіх бібліятэках ДУК “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка” былі аформлены кніжныя інтэрактыўныя выставы.

Бібліятэкі Капыльскага раёна ўдзельнічалі ў праекце “Вострым словам набліжалі Перамогу” з відэачытаннем вершаў паэтаў-землякоў – А. Астрэйкі, А. Русака, Ц. Гартнага. Таксама Цімкавіцкая сельская бібліятэка сумесна з Літаратурным музеем Кузьмы Чорнага, выкладчыкамі ДШМ, работнікамі сельскага Дома культуры, настаўнікамі сярэдняй школы прыняла ўдзел у велапрабегу “Памятаем, ганарымся, ушаноўваем” па месцах баявой славы.

Супрацоўнікі Уздзенскай цэнтральнай раеннай бібліятэкі імя П.Труса прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі памяці “Беларусь памятае. Памятаем кожнага”, усклаўшы кветкі і вянкі да помнікаў, брацкіх магіл і магіл невядомых салдат у в. Ракашычы, в. Бярвішчы, в. Ялоўка. Напярэдадні 75-годдзя Вялікай Перамогі была праведзена валанцёрская акцыя “Мы помним!” па добраўпарадкаванні месцаў пахавання (Хатлянская, Зенькавіцкая, Лашанская сельскія бібліятэкі, Слабадская сельская бібліятэка-клуб). Таксама ўдзел у рэспубліканскай акцыі па закладцы капсул з зямлёй з месцаў воінскіх пахаванняў і гібелі мясцовых жыхароў у крыпце Храма-Помніка ў гонар Усіх Святых прыняла Лашанская сельская бібліятэка.

На базе Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі ў рамках рэспубліканскай акцыі “Памяць пакаленняў” прайшоў круглы стол “Злачынства без тэрміну даўнасці”. Галоўная тэма сустрэчы – захаванне гістарычнай памяці аб трагедыі мірнага насельніцтва Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Да ўдзельнікаў звярнуліся дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь В. Ражанец і намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта В. Топдэмір. У дыялогу ўдзельнічалі старшакласнікі слуцкіх школ,

ветэраны, краязнаўцы, прадстаўнікі Слуцкага раённага выканаўчага камітэта, мясцовых арганізацый і ўстаноў.

У сацыяльных сетках і на сайце ДУК "Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка" прайшла патрыятычная акцыя "Салігоршчына. Сямейныя гісторыі пра вайну". Мэта акцыі – патрыятычнае выхаванне маладога пакалення салігарчан на аснове дакументальных, гістарычных ведаў пра лёсы сваіх родных – удзельніках Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945гг.

6 мая ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І.Х. Каладзеева" (дзіцячы аддзел Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя. І. Х. Каладзеева, сельская бібліятэка-клуб №8 в. В. Ухалода, сельская бібліятэка №15 в. Ганцавічы, сельская бібліятэка №19 сямейнага чытання в. Забашэвічы, сельская бібліятэка №35 в. Неманіца) прынялі ўдзел у XI міжнароднай акцыі "Чытаем дзецям пра вайну 2020", мэта якой – выхаванне патрыятычных пачуццяў у падрастаючага пакалення на прыкладзе лепшых кніг пра вайну 1941-1945 гадоў.

На працягу года ДУК "Любанская раённая цэнтральная бібліятэка" прымала ўдзел у акцыях: "Чыстыя чацвяргі каля помнікаў", "Ветэран", а таксама ў цыкле мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнай кнігі "Жывая памяць – Афганістан". Да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь былі праведзены: гульнёвая праграма "Солдатские истории" (Урэцкая гарпасялковая бібліятэка, ф. №1), медыя-прэзентацыя "Честь имею Родине служить!" (Урэцкая гарпасялковая бібліятэка, ф. №39) і інш.

Каб зберагчы памяць аб подзвігу дзядоў і прадзедаў, каб падзеі мінулага веку заўсёды знаходзілі водгук у сэрцах падлеткаў і мацнела сувязь паміж пакаленнямі, з 1 па 10 мая ДУК "Старадарожская раенная цэнтральная бібліятэка" прыняла ўдзел у героіка-патрыятычнай дэкадзе "Великой победе – 75!". Для вучняў школ горада дзіцячая бібліятэка правяла літаратурна-музычны вечар "Многое забудется, такое – никогда". На мерапрыемстве пранікнёна і душэўна гучалі вершы і песні аб Вялікай Айчыннай вайне. У чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі была аформлена выстава-інсталяцыя "Праздник – 9 мая, память – навсегда". У рамках дэкады ў бібліятэках раёна былі праведзены: гадзіна пашаны "Хай золатам ззяюць імёны герояў" (Падарэская сельская бібліятэка), акцыя "Спасибо деду за Победу" (Залужская сельская бібліятэка-клуб), літаратурны круіз "Мы помним войну" (Сінягоўская сельская

бібліятэка), літаратурна-музычная праграма “Живи, цвети, Победный май!” (Церабуцкая сельская бібліятэка) і г.д.

У 2020 годзе Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка прыняла актыўны ўдзел у патрыятычным марафоне памяці “Перамога ў сэрцы кожнага”. Бібліятэкары падрыхтавалі шэраг мерапрыемстваў для розных катэгорый карыстальнікаў. Патрэбна адзначыць ваенна-гістарычны альманах “В этом празднике – горечь разлуки, в этом празднике – горечь потерь” (гарадская б/ф №1), конкурс малюнкаў “Салют Перамога!” (Сяражская сельская інтэграваная б/ф №4), віртуальнае падарожжа па мемарыяльнаму комплексу “Хатынь” “Звоняць трывожна ў Хатыні званы” (Грэская сельская б/ф №14). Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка сумесна са Слуцкім раённым выканаўчым камітэтам і Слуцкім краязнаўчым музеем таксама прыняла актыўны ўдзел у стварэнні даведніка “Патриотический маршрут “Вспоминая героев” по объектам города Слуцка и Слуцкого района, связанным с событиями Великой Отечественной войны”. Патрыятычны маршрут прапануе пазнаёміцца з 21 аб'ектам даведніка, звязаным з трагічнымі і геранчнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны на Случчыне. Аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў у рамках відэаагляду прадставіў літаратурную спадчыну пісьменнікаў-франтавікоў Случчыны: А. Алешкі і В. Віткі, М. Жука і Я. Кохана, М. Лазарука і М. Лобана, С. Майхровіча і Р. Мурашкі, А. Новіка і В. Праневіча.

ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка” правяла вялікую работу па падрыхтоўцы і выданню друкаванага інфармацыйнага даведніка па месцах баявой славы Пухавіцкага раёна “Як сведкі памяці і славы стаяць абеліскі” і стварэнні шматлікіх электронных прэзентацый па гэтай тэме.

Да 75-годдзя Вялікай Перамогі бібліятэкары аддзела па рабоце з дзецьмі Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі прымалі ўдзел у падрыхтоўцы вулічнай інтэрактыўнай пляцоўкі “Люблю свой горад” і святочнай выставы-інсталяцыі “Победа не пришла сама, Победу принесли герои” ў дзень Вялікай Перамогі.

Таксама і ў Салігорскай раеннай центральнай библіятэцы была арганізавана новая дэманстрацыйная пляцоўка – арт-акно “Открытки вам расскажут о войне..”, якая дазволіла жыхарам горада зірнуць на ваенныя падзеі з нечаканага ракурсу. Штогод у бібліятэках праходзіць Тыдзень памяці і воінскай славы “Нам завещаны память и слава ”, у межах якога праходзяць разнастайныя мерапрыемствы.

Падчас правядзення свята горада Маладзечна ушанаваць памяць сваякоў, што ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, можна было на інтэрактыўнай карце “Нашы землякі – дарогамі вайны і лёсу”, якую падрыхтавалі супрацоўнікі ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча”. У сацыяльных сетках бібліятэкі прайшоў флэшмоб “Читаем стихи о войне” (цыкл відэаролікаў, дзе дзеці чытаюць вершы аб вайне), на сайце размешчаны буктрэйлеры па творах В. Быкава “Жураўліны крык” і “Альпійская балада”, Б. Васільева “В списках не значился” і г.д.. “След вайны (Шталаг № 342)” – пад такой назвай прайшла інфармацыйная гадзіна ў гарадской бібліятэцы-філіяле №1. Чытачы даведаліся пра размешчаны ў г.Маладзечна Шталаг № 342, які дзейнічаў да ліпеня 1944 г., калі быў вызвалены горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да Дня горада супрацоўнікамі раеннай бібліятэкі была арганізавана літаратурная пляцоўка “Мой горад – МАЛАДЫ” ў парку Перамогі.

Да Дня Перамогі Каладзішчанская сельская бібліятэка № 1 арганізавала сустрэчу-віншаванне “Дарогі вайны – дарогі Перамогі” для чытачоў сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Біруковым Паўлам Піменовічам. У цёплай, добразычлівай абстаноўцы ўсе прысутныя выказалі словы сардэчнай падзякі за перамогу і падарылі ветэрану кветкі. Таксама прайшоў раённы конкурс “Рэха вайны і памяць сэрца” на лепшы буктрэйлер да 75-годдзя Перамогі савецкага народа “Вялікая Айчынная вайна вачыма дзяцей”. У публічных бібліятэках Мінскага раёна было арганізавана правядзенне раённага онлайн-конкурсу чытальнікаў “Чытаюць дзеці праз вайну”.

На базе Валожынскай цэнтральнай раеннай бібліятэкі была арганізавана выстава-экспазіцыя “Навечна ў сэрцы народа”, прысвечаная да 75-годдзя з Дня Перамогі. На аснове артыкулаў з перыядычных выданняў, пошукова-даследчай дзейнасці бібліятэкараў у бібліятэцы аформлены альбомы, папкі, буклеты па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У рамках праекта выхаднога дня Бярэзінскай цэнтральнай раеннай бібліятэкі “Культурная субота” была прадстаўлена акцыя “Чытаем разам кнігі пра вайну” пад дэвізам “Памяць пра вайну нам кніга ажыўляе” з тэатрам аднаго акцёра “Жывое слова” па апавяданнях сучасных беларускіх аўтараў і рэквіем-тэатрам “Украдзенае вайной дзяцінства”.

ДУК “Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка” арганізавала марафон памяці “Нам не дадзена забыцца”. У рамках марафона прайшлі тэматычныя кніжныя выставы, выставы-рэквіемы: “Не померкнет летопись Победы” (Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка), “75 імгненняў вайны” (Лагойская дзіцячая бібліятэка), “Гэта трэба жывым“ (Плешчаніцкая гарпасялковая бібліятэка), “Ніколі не забудзем” (Плешчаніцкая дзіцячая бібліятэка), “Вайна – боль і памяць народа” (Акцябрская сельская бібліятэка), “Великая поступь Победы” (Завішынская сельская бібліятэка-клуб), “Не згасне памяці агонь” (Засоўеўская сельская бібліятэка-клуб), “75 –Вялікай Перамозе” (Сямкоўская сельская бібліятэка), “Не зарастае памяць забыццём” (Янушкавіцкая сельская бібліятэка) і інш.

Разам са школьнікамі бібліятэкары ДУК “Клецкая раенная цэнтральная бібліятэка” даглядалі мемарыяльныя помнікі ў сваіх вёсках. Зносіны са сведкамі вайны, воінамі-інтэрнацыяналістамі праходзілі не толькі падчас сустрэч у Дзень Памяці і Дзень Перамогі. Яны запрашаліся на разнастайныя мерапрыемствы для дзяцей і моладзі, дзе дзяліліся сваімі ўспамінамі, армейскім вопытам, апавядалі аб баявых эпізодах. Такія сустрэчы былі карыснымі і старэйшаму пакаленню, і моладзі.

Фотавыстава “Пришла весна – весна Победы” дала магчымасць чытачам Негарэльскай сельскай бібліятэкі (Дзяржынскі раён) убачыць копіі фатаграфій баявых дзеянняў, сюжэтныя фатаграфіі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, фатаграфіі, зробленыя ваеннымі карэспандэнтамі падчас сустрэчы савецкіх воінаў з грамадзянамі дружалюбных краін, вызваленых ад фашызму, кадры гістарычнага парада Перамогі, які адбыўся ў Маскве ў 1945 годзе. Каля выставы праводзілася гутарка аб перыядзе Вялікай Айчыннай вайны, перамозе над Германіяй.

Значнае месца ў працы Новаколасаўскай бібліятэкі Стаўбцоўскага раёна займае пошуковая дзейнасць. Гэта адлюстроўваецца ў афармленні альбомаў і тэматычных папак “Твои герои – мой край родной” аб ветэранах Вялікай Айчыннай вайны. Цікавы гістарычны матэрыял даступны кожнаму карыстальніку бібліятэкі, шырока выкарыстоўваецца пры падрыхтоўцы масавых мерапрыемстваў.

Не меней цікавы матэрыял пад назвай “И память в сердце говорит” быў сабраны бібліятэкарам Новаколасаўскай бібліятэкі пра воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія жывуць у зоне абслугоўвання.

Матэрыял выклікае цікавасць у школьнікаў, тым больш, што побач жывуць сведкі тых падзей. 15 лютага ветэраны ваенных дзеянняў у Афганістане былі запрошаны ў Новаколасаўскую бібліятэку на сустрэчу з непаўналетнімі, каб даць ім урок мужнасці сваім прыкладам, данесці да падрастаючага пакалення каштоўнасць чалавечага жыцця, міру на зямлі.

15 лютага воіны-інтэрнацыяналісты збіраюцца разам, каб успомніць сваю нялёгкую службу, баявых таварышаў, якія не вярнуліся з поля бою. У Палацы культуры ў Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка аформіла выставу кніг “Мы ў памяці захоўваем Афганістан”, прымеркаваную 31-й гадавіне вываду савецкіх войск з Афганістана. Для навучэнцаў старэйшых класаў бібліятэкары правялі героіка-патрыятычную кампазіцыю “Афганістан: мужнасць і памяць”, каб аддаць даніну памяці ўсім, хто мае дачыненне да гераічнай і трагічнай афганскай вайны.

У Ліцвянскай сельскай бібліятэцы (Уздзенскі раен) прайшоў Дзень памяці воіна-інтэрнацыяналіста Уладзіміра Астравуха “Афганскімі сцежкамі”. Удзельнікі мерапрыемства наведалі школьны музей, прысвечаны загінуўшаму воіну-інтэрнацыялісту, сустрэліся з воінамі-інтэрнацыялістамі і прадстаўнікамі ваенкама г. Узда, усклалі кветкі на магілу загінуўшага афіцэра.

Бібліятэкі Мінскага раена таксама далучыліся да ушанавання воінаў-інтэрнацыяналістаў. У Крупіцкай інтэграванай сельскай бібліятэцы прайшла сустрэча з воінам-інтэрнацыяналістам Г.І. Тупічкіным “Афган в моём сердце”, а ў Ждановіцкай сельскай бібліятэцы – з воінам-інтэрнацыяналістам Быкавым У. Ф. “Без срока давности”.

Да дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана ў ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка” прайшоў урок мужнасці “Афганистан в судьбе наших земляков” з удзелам воіна-інтэрнацыяліста У. Б. Дзядзела.

Да Дня Памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў у Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Анатоля Астрэйкі супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі распрацавалі сцэнарый раённага мерапрыемства, прысвечанага Дню Памяці, і правялі мітынг.

Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча арганізавала галерэю памяці “З полымя Афганістана”. У яе рамках адбыліся: урок мужнасці “Рэха афганскай вайны”,

сустрэча-дыялог з загадчыкам школьнага музея воінаў-інтэрнацыяналістаў Арабеем І. І. пад назвай “Афганістан вачыма салдат”, музычная прэзентацыя “Песні афганскай вайны”.

Бібліятэкары Лагойскай раеннай цэнтральнай бібліятэкі арганізавалі тэматычную выставу “Рэха афганскіх гор”. Для вучняў СШ №3 г. Лагойска правялі гадзіну мужнасці “Рэха афганскай вайны”. У ходзе мерапрыемства быў паказаны дакументальны фільм “Хроніка вайны ў Афганістане 1979-1989 гг.” і ўспомнілі землякоў, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнаяга абавязку.

## Духоўна-маральнае выхаванне

Бібліятэкі, як культурна-асветніцкія і інфармацыйныя ўстановы, спрыяюць працэсу духоўнага адраджэння праз фарміраванне фондаў і раскрыццё іх сваім карыстальнікам, выхоўваюць ў людзей маральнасць, гуманнасць, разуменне веры і рэлігійную цярпімасць праз мудры вопыт продкаў, векавыя хрысціянскія традыцыі народа.

У справаздачным годдзе надавалася ўвага працы па духоўна-маральнаму выхаванню карыстальнікаў бібліятэк на аснове айчынных культурна-гістарычных і рэлігійных традыцый і каштоўнасцяў.

У сваёй дзейнасці па духоўнаму адраджэнню супрацоўнікі бібліятэк выкарыстоўвалі розныя формы падачы інфармацыі.

Духоўна-маральнае выхаванне ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Пранузы складаецца з многіх момантаў. У 2020 годзе працягвае работу духоўна-асветніцкі цэнтр “Існасць”. У яго рамках дзейнічаюць клуб духоўна-маральнага выхавання падлеткаў і моладзі “Ноеў каўчэг”, сямейны клуб “Згода”, праходзяць заняткі Нядзельнай школы храма Узнясення Гасподня г. Нясвіжа. Выйшлі ў эфір 12 выпускаў духоўна-асветніцкай перадачы “Абуджэнне” як вынік сумеснага праекта бібліятэкі, раённага радыё і Нясвіжскага благачыння. Дзве рубрыкі сумеснага праекта Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Пранузы, раённага радыё і ДУА “Сярэдняя школа № 4 г.Нясвіжа” “Парады з вуснаў несвіжан” таксама былі прысвечаны пытанням духоўным. У гэтым годзе яе ўдзельнікамі сталі: настаяцель Свята-Крыжаўздзвіжанскага храма аг. Вялікая Лысіца іерэй Аляксандр Мельнікаў, настаяцель Свята-Мікалаеўскага храма аг. Юшавічы і храма Святой Праведнай Ганны аг. Аношкі іерэй Васілій Краеў, настаяцель Свята-Георгіеўскага храма горада Нясвіжа протаіерэй Яўгеній Лабынько. У рамках дзейнасці духоўна-асветніцкага цэнтра

“Існасць” адбыліся паломніцкія паездкі “Па святых мясцінах Беларусі”: у манастыр Ксеніі Пецярбургскай ў вёсцы Барань Барысаўскага раёна, крыніцу блажэннай Ксеніі Пецярбургскай, магілу блажэннай Валянціны Мінскай, Свята-Благавешчанскі манастыр у Лядах, Свята-Троіцкі храм г.п. Мір.

У справаздачным годзе ў Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Максіма Танка паспяхова працаваў духоўна-асветніцкі цэнтр “Духоўнасць. Вера. Вечнасць”. Выставы і агляды новай літаратуры тут заўсёды запатрабаваны чытачамі. У рамках Дня праваслаўнай кнігі ДУК “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка” арганізавала мерапрыемствы, прысвечаныя гэтай знамянальнай падзеі. На мерапрыемствы былі запрошаны святары мясцовых прыходаў. У Княгінінскай сельскай інтэграванай бібліятэцы прайшоў Дзень праваслаўнай кнігі "Праваслаўная кніга – шлях да духоўнасці", на якой прысутнічаў настаяцель храма Святой Жываначальнай Тройцы ў в. Княгінін іерэй Канстанцін Яроміч. Слабадская бібліятэка ў рамках свята "Божае слова –крыніца надзеі" правяла сустрэчу з настаяцелем храма ім. Аляксандра Неўскага ў в. Слабада пратаіерэем Вячаславам Шэлестам. Цікавае мерапрыемства арганізавала Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка для вучняў 11 класа гімназіі-інтэрната г. Мядзел. Дзень праваслаўнай кнігі “Праз кнігу – да вытокаў праваслаўя” пачаўся з аповяду аб гісторыі ўзнікнення свята, першых кнігадрукарах Іване Фёдаравым і Пятры Мсціслаўцы і іх ролі ў гісторыі кнігадрукавання. Затым увазе школьнікаў была прапанавана віктарына пра рускіх пісьменнікаў XIX-XX стагоддзя і іх творы духоўнай тэматыкі. Перад аўдыторыяй выступіў настаяцель храма Святой Жываначальнай Троіцы г. Мядзела пратаіерэй Ігар Шалуха, які ў сваім выступленні звярнуў асаблівую ўвагу на стаўленне сучаснай моладзі да праваслаўнай веры, царквы, выбары духоўнага светапогляду.

З 2018 года пры Языльскай сельскай бібліятэцы Уздзенскага раена пачаў працаваць клуб для дарослых “Свеча”. У 2020 годзе з удзелам святара іерэя Аляксандра Понтуса настаяцеля храма Праабражэння Гасподняга аг. Языль прайшоў вечар-сустрэча "Бацюшка Покров! Покрой избушку теплом". Мерапрыемства праходзіла ў храме аг. Языль, дзе сабраліся не толькі ўдзельнікі клуба “Свеча”, але і прыхажане храма. Па традыцыі ўдзельнікі клуба штогод прымаюць удзел ва ўпрыгожванні храма да вялікага свята

Раства Хрыстова. Рукамі ўдзельніц клуба упрыгожваюцца калядныя елкі ў храме, усталёўваюцца яслі.

У аддзеле па рабоце з дзецьмі Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі працягваецца дзейнасць клуба па духоўна-маральнаму выхаванню школьнікаў "Вытокі". Мерапрыемствы праводзіліся сумесна з настаяцелем храма свяціцеля Мікалая Цудатворца Аляксандрам Лазоўскім і рэгентам храма Наталляй Лазоўскай. Адным з першых мерапрыемстваў клуба была экскурсія ў Свята-Нікольскі храм "Церковь – корабль спасения". Бібліятэкары распрацавалі цыкл мерапрыемстваў у форме духоўна-маральных гадзін: "Добрые дела", "О благом послушании", "О милосердии". Вынікам гэтых мерапрыемстваў стала гульня "Букет добрых спраў". Літаратурнай гадзіны "Об образе и подобии Божием в человеке" распавяла пра мастацкую праваслаўную літаратуру для дзяцей, якая маецца ў фондзе бібліятэкі.

У Пятрышкаўскай сельскай бібліятэцы (Мінскі раен) была арганізавана сустрэча "Основы православной культуры" з іерэем Георгіем Прыхода Царквы Свяціцеля Феадосія Чарнігаўскага. Пазнавальная размова "Свет Вифлеемской звезды" паведаміла аб духоўнай чыстаце і святасці.

Шмат гадоў у Любанскай раеннай цэнтральнай бібліятэцы рэалізуецца мэтавая праграма "Наполним милосердием сердца", мэта якой – стварэнне безбар'ернага культурнага асяроддзя. Для аб'яднання блізкіх па ўзросту і захапленнях людзей, пераадолення іх адзіноты працуе аматарскае аб'яднанне "Добрыя сустрэчы". На паседжаннях аб'яднання праводзіліся: гадзіна прававых ведаў "Прававое поле пенсіянера", святочная праграма "Святло жанчыны ззяе ў Сусвеце!", бібліяфрэш "Феерверк цікавых кніг", паэтычная хваля "Жди меня и я вернусь…", агляд перыядычных выданняў "На скрыжаваннях перыёдыкі". Усе члены аб'яднання ўдзельнічалі ў бібліяпаці "Библиотека в кругу друзей", конкурсе-чэленджы "Паўлаўскія чытанні".

Бібліятэкары Любанскага раёна на працягу года працавалі ў рамках мэтавай сацыяльнай праграмы "Душу исцелит добро".

Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка працуе ў рамках сацыяльна-духоўнай праграмы "Благовест". Бібліятэкары праводзілі мэтанакіраваную і паслядоўную работу па папулярызацыі духоўнай літаратуры, фарміраванні ў чытачоў маральна-духоўных каштоўнасцяў. Рэалізацыя праекта заснавана на супрацоўніцтве

са Слуцкім благачыннем, рэсурсным цэнтрам па духоўна-маральным выхаванні (ДУА “Сярэдняя школа № 6 г. Слуцка”), установамі адукацыі раёна, краязнаўцамі. У цэнтральнай бібліятэцы адчынены зал праваслаўнай літаратуры “Слова”. Фонд літаратуры духоўна-маральнага зместу налічвае 2000 экз. У фондзе маецца Біблія ў скураной вокладцы, перададзеная ў дар бібліятэцы падчас візіту Праасвяшчэннейшага Антонія, епіскапа Слуцкага і Салігорскага. Сярод выданняў ёсць кнігі, падораныя ігуменам Ігнаціем, насельнікам Свята-Троіцкай Сергіевай Лаўры, у тым ліку выданні, якія прадстаўляюць бібліяграфічную каштоўнасць.

План работы ў рамках праграмы ўзгоднены з благачынным Слуцкай царкоўнай акругі. Было арганізавана больш за 115 мерапрыемстваў. Формы іх правядзення самыя розныя: сустрэчы са святам, праваслаўныя дасье, праваслаўныя бібліякомпасы, часы праваслаўнай гісторыі, сустрэчы са святарамі, краязнаўчыя экскурсы, праваслаўныя відэакампазіцыі, віртуальныя паломніцтвы, урокі духоўнасці, гадзіны праваслаўнай гісторыі і інш.

Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка ім. А. Астрэйка працуе па доўгатэрміновай мэтавай праграме “Будуем храм у душах”. Сёння асноўныя напрамкі і палажэнні мэтавай праграмы рэалізуюцца ва ўсіх бібліятэках сістэмы, а асабліва поўна і мэтанакіравана ў тых, у зону абслугоўвання якіх уваходзяць тэрыторыі з дзеючымі храмамі і цэрквамі. Царкоўнаслужыцелі з задавальненнем удзельнічаюць у гэтай працы, самі прапануюць тэмы сустрэч, каб знайсці ключ да сэрцаў дзяцей і падлеткаў. Пры Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэцы ім. А. Астрэйка створаны і працуе духоўна-асветніцкі цэнтр “Дарога да храма”. Дзейнасць цэнтра накіравана на вывучэнне і распаўсюджванне праваслаўных каштоўнасцяў і арыентавана на цеснае супрацоўніцтва ў гэтым кірунку з благачынным цэркваў Капыльскай акругі протаіерэем айцом Сергіем.

Бібліятэкі Капыльскага раёна надаюць шмат увагі пытанням духоўнага адраджэння. Актыўнай формай работы ў гэтым напрамку з’яўляецца Тыдзень праваслаўнай кнігі “Слова веры”. У рамках тыдня прайшлі мерапрыемствы для дзяцей і юнацтва. 13 сакавіка ў Далгінаўскай сельскай інтэграванай бібліятэцы прайшла гадзіна духоўнасці “Свет православия – свет души”. Мерапрыемства наведаў настаяцель храма Святой Жываначальнай Тройцы аг. Далгінава протаіерэй Іаан Ліннік. На працягу некалькіх гадоў

раённая цэнтральная бібліятэка актыўна супрацоўнічае з выдавецтвам Беларускага Экзархата, дзякуючы якому штогод папаўняецца фонд праваслаўнай літаратуры. На базе бібліятэкі таксама працуе Нядзельная школа.

У Ерхаўскай сельскай бібліятэцы (Вілейскі раен) у рамках Тыдня праваслаўнай кнігі ўжо традыцыяй сталі сустрэчы з настаяцелем царквы Сашэсця Святога Духа ў в.Рэчкі протаіерэем Валенцінам Пешко. Так, 15 лютага 2020 прайшла такая сустрэча пад назвай “Духовных книг божественная мудрость”. 14 чэрвеня ў в. Ерхі прайшоў дабрачынны канцэрт “Твори Добро”, арганізаваны супрацоўнікамі Ерхаўскай сельскай бібліятэкі і Ерхаўскага сельскага клуба. На мерапрыемстве прысутнічаў настаяцель царквы Сашэсця Святога Духа ў в.Рэчкі протаіерэй Валянцін Пешко. Усе сабраныя грошы былі адпраўлены на рамонт храма в. Рэчкі, які пацярпеў

ад пажару.

Барысаўская цэнтральная раенная бібліятэка імя І. Х. Каладзеева правяла вельмі цікавую акцыя “Под покровом Петра и Февронии”. 8 ліпеня ля ўваходу ў будынак бібліятэкі супрацоўнікі бібліятэкі запрашалі мінакоў пазнаёміцца з матэрыяламі аднайменнай кніжнай выставы, расказвалі пра гісторыю рамантычнай любові і сямейнага жыцця Пятра і Фяўроніі. У зносінах з жыхарамі горада гучалі ўзаемныя пажаданні светлай і радаснага дня. А выдатным дадаткам да свята былі падораныя букеты рамонкаў – сімвала кахання.

З 10 па 19 верасня ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева” прыняла ўдзел у абласной дэкадзе духоўна-маральнага выхавання “В кругу семьи рождается душа”. У рамках дэкады ў духоўна-асветніцкім цэнтры адбыўся міжнародны онлайн-семінар “Храм души возводим вместе: библиотека и духовное просвещение” пры ўдзеле вучэбна-метадычнага цэнтра Барысаўскага раёна, упраўлення па адукацыі Барысаўскага райвыканкама, супрацоўнікаў бібліятэк школ і каледжаў, Барысаўскай епархіі, а таксама партнёраў з Сербіі – народнай бібліятэкі "Вук Караджыч” і Таварыства суайчыннікаў і сяброў Расеі "МИР" з г. Крагуевац. Падчас відэасустрэчы бібліятэкар духоўна-асветніцкага цэнтра прадставіла ўдзельнікам новы міжнародны сацыякультурны праект “Свет души”. Клірык кафедральнага сабора Уваскрэсення Хрыстова г. Барысава Зміцер Качаноўскі распавёў аб стварэнні экспазіцыі, прысвечанай сербскай культуры, у прытворы храма ў гонар Свяціцеля Савы, першага арцыбіскупа

Сербскага, размешчанага ва ўпраўленні Барысаўскай епархіі. Шмат цікавага расказалі і сербскія партнёры. Так, бакалаўр багасloўя, кіраўнік Белградскага аддзялення Праваслаўнага таварыства “Преподобный Иустин Челийский и Враньский” Ненад Байкоў падзяліўся думкамі пра ролю бібліятэкі ў місіянерскай дзейнасці сярод моладзі. Арганізатар праграм Народнай бібліятэкі “Вук Караджич” Саня Жыўкавіч адзначыла важныя моманты з вопыту работы бібліятэкі ў духоўным кірунку. Аб супрацоўніцтве Садружнасці пісьменнікаў Сербіі з Народнай бібліятэкай “Вук Караджич” і аб Славянскім адзінстве Беларусь – Сербія распавёў у сваім дакладзе прафесар рускай мовы і літаратуры, перакладчык, член Садружнасці пісьменнікаў г. Крагуевац Радзенко Белановіч.

Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка напярэдадні Вербнай нядзелі і Пасхі падрыхтавала гадзіну духоўных зносін “Час паста, час малітвы”. Сустрэча прайшла з удзелам свяшчэннаслужыцеля сабора Святой Ганны айцом Георгіям, навучэнцамі сярэдняй школы № 2 г. Стоўбцы, супрацоўнікамі бібліятэкі. У рамках мерапрыемства была праведзена хвілінка сямейнага чытання “Духоўная кніга – крыніца мудрасці”. Прысутныя падзяліліся ўражаннямі ад прачытаных кніг, зачытвалі ўрыўкі з твораў, якія асабліва закранулі душу. Да свята праваслаўнай кнігі была падрыхтавана кніжная выстава “Свет под книжной обложкой”.

У рамках фестывалю праваслаўнай культуры “Кладзезь” і праекта “Задушевный разговор” у Крупскай раённай бібліятэцы імя Я. Купалы прайшла сустрэча-гутарка з манахіней Свята-Елісавецінскага манастыра Марыей Літвінавай. На сустрэчы ішла гутарка пра здаровы лад жыцця, а таксама аб манастырскім жыцці. У сакавіку праводзіўся Дзень праваслаўнай кнігі пад назвай “Святло і сіла духоўнага слова”, у праграму якога ўвайшлі гадзіна духоўнасці “Пагаворым пра вечнае” з пратаірэям Мікалаем, настаяцелем храма г. Крупкі, прэзентацыя кніг “Борисовская епархия” і “Дорогами Православия Крупщины”.

На рэспубліканскі конкурс "Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання” быў прадстаўлены вопыт работы Цэнтра праваслаўнай асветы Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі па духоўна-маральнаму выхаванню дзяцей і моладзі "На шляху да дабра і святла". Святар сабора Раства Хрыстова айцец Аляксандр правёў у раённай дзіцячай бібліятэцы брэйн-рынг “Дары Калядаў”.

Навучэнцы 5-х класаў сярэдніх школ №№1, 5 і нядзельнай школы павінны былі адказаць на 36 пытанняў, звязаных з гісторыяй свята, падзей, якія папярэднічалі нараджэнні Хрыста. У рамках Тыдня праваслаўнай кнігі адбылася сустрэча з беларускай пісьменніцай Ірынай Токаравой, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтарам кніг праваслаўнай тэматыкі. Пісьменніца расказала пра сваю творчасць, паказала мультымедыйную прэзентацыю па кнізе “Иерусалимские рассказы”, прэзентавала свае новыя кнігі “Царица Неба и Земли” і “Небесные Заступники земли Белорусской”.

У Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы пастаянна дзейнічае цэнтр праваслаўя “Шляхі да духоўнасці”. На працягу года арганізоўваліся выставы, прысвечаныя датам царкоўнага календара і народным святам: “Святая Таццяна – падзвіжніца набожнасці”, “И сышло на зямлю хараство... Вялікдзень”, “У нядзелю Вербную”, “Дзень Тройцы нам таямніцы адкрывае”, “Яблычны Спас сабраў сёння нас” і інш. Да Калядаў была разгорнута кніжная выстава “Чарует белой сказкой снова Святое Рождество Христово”, каля якой былі арганізаваны прагляд-прэзентацыя праваслаўнай літаратуры “Анёл нябесны веснік Раства” і калядная віктарына “Святло нябеснага цуду”. Бібліятэкары Мар’інагорскай гарадской бібліятэкі падрыхтавалі цыкл культурна-этнаграфічных мерапрыемстваў пад назвай “Адвечнае”. З мэтай пазнаёміць сваіх чытачоў са святочнай абраднасцю Каляд яны запрасілі ўсіх жадаючых да ўдзелу ў калядным фэсце “Шчасця вам, добрыя людзі!”. Пачатак фэсту паклала фальклорная забава “Каляда, каляда! Весяліся грамада!”, якая адбылася на пачатку студзеня для ўдзельніц “Клуба цікавых сустрэч”. Таксама ва ўсіх публічных бібліятэках Пухавіцкага раёна былі разгорнуты пастаянна дзеючыя кніжныя выставы, адкрытыя прагляды літаратуры, выставы-панарамы кніг рэлігійнай тэматыкі, духоўна-асветніцкія цэнтры: выставачная экспазіцыя “Духоўная кніга крыніца мудрасці”, "Праваслаўная кніга – шлях да духоўнасці", "Дарога да храма", "Праз кнігу – да міру і згоды", "Духоўны свет чытання", "Калядная лампадка", "Нязгасны агонь духоўнай паэзіі" і інш.

Супрацоўнікі залы мастацтва Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі запрасілі сваіх чытачоў на майстар-клас “Калядная паштоўка”. Майстар-клас прайшоў у рамках арт-праекта “Цудоўнае сваімі рукамі”. Працягвалася работа праваслаўных кінасеансаў “У надзеі, веры і любові”. Наведвальнікам

прапаноўваліся фільмы, у якіх разглядаліся пытанні веры, любові да Бога і бліжняга, праблемы сямейнага жыцця. Настаяцель Свята-Георгіеўскага храма айцец Віталь Мацюлька каментаваў фільмы, прыводзячы прыклады з Евангелля і біблейскія прытчы. Увазе наведвальнікаў былі прапанаваны выставы духоўнай тэматыкі і праваслаўны букросінг. Падрыхтаваны анлайн кінасеанс “Для душы і сэрца”, спасылка на які знаходзіцца на сайце бібліятэкі. Вельмі спадабалася чытачам бібліятэкі святочная вечарына “Душы кранальныя ўспаміны”, якая была арганізавана ў рамках клуба “Кніжны гурман” і прысвечана традыцыям правядзення Каляд і Новага года ў 20-м стагоддзі.

У Плешчаніцкай дзіцячай бібліятэцы (Лагойскі раен) адбыліся чытанні на Раство “Рождественский венок”. Прагучалі вершы У.Скарынкіна, М.Парахневіча, І.Буніна, А.Фета і інш. Праваслаўная гадзіна “Святая Троіца” адбылася ў Калачаўскай сельскай бібліятэцы, а гутарка “Преображение Господне” – у Каменскай сельскай бібліятэцы.

У Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раена была праведзена краязнаўчая вечарына “И сошла на Землю благодать… Пасха”, якая расказала пра традыцыі Вялікоднага свята і пра яго гісторыю. Дзеці даведаліся, як фарбавалі яйкі раней і якія гульні праводзіліся ў гэты дзень.

У 2020 годзе праваслаўныя вернікі Беларусі адзначалі знамянальныя падзеі – 550-годдзе здабыцця цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці і 500-годдзе з дня заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра. З гэтай нагоды ў розных бібліятэках адбыўся шэраг разнастайных мерапрыемстваў. Напрыклад, Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка запрашала ўсіх жадаючых наведаць выставу-прагляд "Гісторыя і святыні Жыровіцкага манастыра”, якая дзейнічала ў чытальнай зале і знаёміла наведвальнікаў бібліятэкі з цікавымі матэрыяламі аб духоўным цэнтры праваслаўя Беларусі. У Свіслацкай гарпасялковай бібліятэцы (Пухавіцкі раён) на працягу двух тыдняў праходзілі дні духоўнай культуры “Уладарка Белай Русі”. Да гісторыі галоўнай святыні Беларусі дакрануліся падлеткі падчас правядзення ў бібліятэцы старонак духоўнасці “Прасвятая Дзева Жыровіцкая”.

У Цэнтры праваслаўнай асветы Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі прайшла прэзентацыя кнігі ігуменні

Гродзенскага Свята-Раства-Багародзічнага жаночага манастыра Гаўрыілы “Всерадостное заступление Белой Руси”. Выданне прысвечана 550-годдзю з'явы Жыровіцкай іконы Божай Маці. На прэзентацыі прысутнічалі ганаровыя госці: іерэй Алег Філіповіч, настаяцель прыхода храма Свяціцеля Георгія Магілёўскага аграгарадка Чырвоная Слабада, іераманах Мікалай, клірык кафедральнага сабора Міхала Арханёла г. Слуцка, краязнаўца А.М. Папоў. Фонд бібліятэкі папоўніўся кнігамі ігуменні Гаўрыілы “Всерадостное заступление Белой Руси” і “Святая праведная София, княгиня Слуцкая. Житие. Акафист”.

ДУК “Старадарожская раенная цэнтральная бібліятэка” таксама не засталася ў староцы ад гэтай вялікай падзеі. Напрыклад, у чэрвені адбылася вечарына праваслаўнай культуры прысвечаная 500 годдзю Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра “Вопыт стагоддзяў. Гісторыя Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра”. Бібліятэкар расказала пра гісторыю цудадзейнага абраза, будаўніцтва Жыровіцкага манастыра і паказала фільм аб гэтай беларускай святыні.

Таксама да гэтай вялікай падзеі ў Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі прайшла духоўна-асветніцкая акцыя “К своей душе найти дорогу”, на якую быў запрошаны настаяцель храма свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага айцец Дзімітрый Грышчанка.

## Эстэтычнае выхаванне

Эстэтычнае выхаванне – гэта мэтанакіраваны працэс фарміравання творчай асобы, здольнай успрымаць, адчуваць, ацэньваць прыгожае і ствараць мастацкія каштоўнасці. Садзейнічаючы эстэтычнаму выхаванню насельніцтва, бібліятэкі сталі цэнтрамі папулярызацыі культуры і мастацтва, цэнтрамі адукацыі дзяцей і моладзі. У сваёй працы па эстэтычным выхаванні бібліятэкі выкарыстоўваюць розныя формы работы: конкурсы творчых работ, агляды, гутаркі, урокі і г.д.

Так, у рамках акцыі “Жаданы госць” Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса запрасіла маладых чытачоў на сустрэчы з цікавымі людзьмі. У верасні такім госцем быў мясцовы мастак Віталій Мкртчан.У праграму бібліятэчнага журфікса “Магия холста и красок” увайходзіла гутарка каля выставы работ мастака, майстар-клас. У снежні ў літаратурна-мастацкай гасцёўні

“У Паўлюка” адбылася сустрэча-знаёмства “Яркая палітра фарбаў” з мінскім мастаком Сяргеем Махначом.

Стала добрай традыцыяй штогод у бібліятэках Барысаўскага раёна арганізоўваць творчыя сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі. Літаратары з задавальненнем прыходзяць у бібліятэку, распавядаюць пра сваё жыццё і творчасць, знаёмяць чытачоў са сваімі новымі творамі. 27 лютага на абанеменце цэнтральнай бібліятэкі ў рамках культурна-дасугавага праекта “Справа жыцця” адбылася творчая сустрэча з барысаўскай паэтэссай, пісьменніцай, журналісткай А. Брыцкай, а 7 лютага ў сельскай бібліятэцы-клубе №8 в. В.Ухалода прайшла творчая сустрэча з паэтам-песеннікам У.І. Рудзікам.

Напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы г. Жодзіна адбыліся беларускамоўныя пасядзелкі. Мясцовая паэтка, член Мінскага абласнога народнага клуба паэтаў і кампазітараў “Жывіца” Лідзія Жыдко-Зянькова чытала свае вершы на беларускай мове. Музычныя паўзы ладзіў вакальны гурт “Калінушка”. Завітаў на сустрэчу і член Беларускага Саюза журналістаў, пісьменнік, гумарыст Віталь Жураўскі, які расказаў некалькі сваіх гумарэсак.

Падчас пасядзелак усіх прысутных частавалі квасам, асабліва тых, хто прымаў удзел у розных выпрабаваннях і конкурсах, прысвечаных роднай мове. Напрыклад, інтэлектуальныя гульні, дзе трэба было і расшыфроўваць беларускія фразеалагізмы і тлумачыць прадметы беларускімі словамі. Выпрабаванне “Беларуская мова як загадка” патрабавала даць вызначэнне беларускім словам і г.д.

Выдатным падарункам жыхарам г. Салігорск да Новага Году стала адкрыццё ў раённай цэнтральнай бібліятэцы пры падтрымцы Аддзялення пасольства Фінляндыі ў Рэспубліцы Беларусь выставы коміксаў сусветна вядомай фінскай пісьменніцы Туве Янсан “Мумі-троль і камета”. Госці пазнаёміліся з маляўнічай навагодняй экспазіцыяй пра краіну Ёўлупукі і Мумі-троляў – Фінляндыі, мелі магчымасць наведаць ўтульную “Мумі-чыталку”, пасядзець у крэсле Мумі-мамы і дапамагчы звязаць шалік для Мумі-таты, а ў “Мумі-кафэ” папіць сапраўднай кавы па-мумітролльскі і зрабіць цудоўны фотаздымак з героямі знакамітай кнігі. Таксама запамінальнай падзеяй года стаў вечар бальнай культуры. Кіраўнік аб'яднання па інтарэсах “Тэатральны агеньчык” ГУДА “Цэнтр тэхнічнай творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” пазнаёміў гасцей вечара

з традыцыямі рускіх баляў, з асаблівасцямі бальнай культуры і этыкету. Праграма ўключала бальныя танцы XIX-XX стагоддзяў.

У Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы была прадстаўлена выстава дыпломных работ выпускнікоў 2019-2020 гг. Слуцкай дзіцячай мастацкай школы мастацтваў пад назвай “З агеньчыкам натхнення”. Экспазіцыя ўключала 17 экзаменацыйных работ, выкананых у розных тэхніках і з выкарыстаннем разнастайных матэрыялаў. Музычна-літаратурная імпрэза “Найвялікшы геній музыкі”, прысвечаная 210-годдзю з дня нараджэння Ф. Шапена, адбылася ў аддзеле абслугоўвання і інфармацыі чытачоў раённай цэнтральнай бібліятэкі. Таксама ў 2020 годзе адбыліся XIII Віткаўскія чытанні “Вяшчун дабра і справядлівасці”, прымеркаваныя да 109-й гадавіны з дня нараджэння Васіля Віткі. Бібліятэкі запрасілі ўдзельнікаў Віткаўскіх чытанняў прыняць удзел у літаратурным занятку “Жывая педагогіка Васіля Віткі” (аддзел абслугоўвання і інфармацыі раённай цэнтральнай бібліятэкі), скласці пазнавальны пазл “Казкі дзеда Васіля” (Грэская сельская бібліятэка-філіял №14), паблукаць у паэтычным лабірынце “Сонечны чараўнік Васіль Вітка” (Замосцкая сельская бібліятэка-філіял №15), адправіцца ў казачную вандроўку “Па сцяжынках твораў Васіля Віткі” (спецыялізаваная бібліятэка-філіял №27), праявіць творчыя здольнасці ў тэатры-экспромце “Вера-вавёрка і ўсё-ўсё-усё…” (Акцябрская сельская бібліятэка-клуб-філіял №32), пачытаць услых на гучных чытаннях “Мудрэц з краіны дзяцінства” (Падлеская сельская бібліятэка-філіял №35).

Пры Старадарожскай раеннай цэнтральнай бібліятэцы працягвае сваю работу літаратурна-музычная гасцёўня “Гармонія”. Для ўдзельнікаў клуба прайшлі наступныя мерапрыемствы: гадзіна жывапісу "Встреча с прекрасным"(да 155-годдзя з дня нараджэння В.Сярова), кола гісторыі “Першадрукар Скарына”, літаратурна-музычная кампазіцыя “Падарожжа ў краіну музыкі”. Таксама спадабалася ўдзельнікам гадзіна музыкі “Музыка сэрца”, якая была прысвечана 195-годдзю Іагана Штраўса.

Для чытачоў старэйшага школьнага ўзросту з 1996 года ў Клецкай раеннай цэнтральнай бібліятэцы працуе літаратурна-музычная гасцёўня “Натхненне”, дзейнасць якой скіравана на выхаванне эстэтычнага і мастацкага густу, уменне лагічна разважаць і праяўляць артыстычныя здольнасці. Пасяджэнні гасцёўні носяць змястоўны і featureнабаковы характар. Цікава

і запамінальна прайшла ваенна-патрыятычная кампазіцыя “Годы великих испытаний”. “Мир материнской любви” – пад такой назвай да Дня маці рабяты падрыхтавалі лірычную кампазіцыю. Яны чыталі вершы пра маці, урыўкі з твораў, пазнаёміліся з аднаіменнай кніжнай выставай. Пасяджэнне “Неповторимый край родной” дазволіла рабятам падрабязна пазнаёміцца з гісторыяй роднага краю. Пасяджэнне “Как здоровье уберечь” напомніла рабятам пра тое, што здароўе трэба шанаваць з дзяцінства.

У Завішынскай сельскай бібліятэцы-клубе (Лагойскі раен) адбыўся тэматычны вечар “Таццянін дзень”. Да мерапрыемства была аформлена выстава “Кнігі ад Таццяны”, на якой былі прадстаўлены кнігі аўтараў з імем Таццяна. Да Міжнароднага дня музыкі ў Плешчаніцкай дзіцячай бібліятэцы была арганізавана мазаіка цікавых фактаў “Галасы музыкальных інструментаў”. Прагучаў цікавы аповед пра гісторыю з’яўлення музыкальных інструментаў, іх спосабы гучання, з якога матэрыялу яны вырабляюцца і якія музычныя творы можна на іх выконваць.

9 лютага ў Вілейскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Ганны Новік сабраліся і мясцовыя паэты, і чытачы бібліятэкі, каб павіншаваць пісьменніка Барыса Флоравіча Манцэвіча з выхадам новай кнігі. Творчасць Барыса Манцэвіча чытачам вядома даўно, ім напісана сем кніг. Сёмая па ліку кніга Барыса Флоравіча “Дарога ў журналістыку” адметная сваёй жыццёвай напоўненасцю, шчырасцю.

У Заслаўскай гарадской дзіцячай бібліятэцы Мінскага раёна з 2016 года працуе лялечны тэатр “Казачная скарбонка”. Штоквартальна ў бібліятэцы для арганізаваных груп праходзяць спектаклі, на якіх бывае больш за 200 гледачоў. Пры Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэцы дзейнічае клуб эстэтычнага выхавання “Зазеркалье”, а ў Чурылавіцкай інтэграванай сельскай бібліятэцы працуе лялечны гурток “Пралеска”.

У Абчугскай сельскай бібліятэцы-клубе Крупскага раёна арганізаваны творчы гурток “Веселый карандаш”, на працягу года афармляліся выставы работ удзельнікаў, якія сваімі рукамі робяць падарункі, ствараюць навагоднія ўпрыгожванні і ёлачныя цацкі. Таксама пры Абчугскай сельскай бібліятэцы-клубе пастаянна дзейнічае майстэрня вольнага наведвання “101 идея в подарок”, дзе кожны жадаючы можа рэалізаваць свае творчыя задумкі. На працягу года бібліятэкар Халопеніцкай гарпасялковай бібліятэкі арганізоўвала выставы вырабаў дзяцей кружка з мясцовага філіяла

Крупскага цэнтра творчасці, прымеркаваных да Дня маці “Мілая, родная, каханая” і “Мастерство рук и сердца”. Вельмі прыгожыя работы былі прадстаўлены на выставе “Здравствуй, Зимушка-зима” напярэдадні Новага года і Раства Хрыстова. Таксама было праведзена эстэт-шоу “Красота спасёт мир”.

На працягу года ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Пранузы экспанаваліся шматлікія тэматычныя дакументальна-ілюстрацыйныя кніжныя выставы: “Край родной, навек любимый” – да 80-годдзя Нясвіжскага раёна; “Книги о важном” – кніжная выстава ў рамках раённага этапу абласнога дабрачыннага фестываля-марафону “Крылы анёла”; “Да кніжных скарбаў дакраніся”, “Смак беларускай мовы” – выставы да Дня роднай мовы. У рамках праекта “Духоўнае слова” ўдзельнікі наведалі і выставу ікон майстра з Гарадзеі Святланы Мікалаеўны Мартас “Передать людям свою радость”, якая знаходзілася ў салоне-галерэі “Скарбніца”. У рамках праекта “ЗАчтение” праводзяцца мерапрыемствы па папулярызацыі чытання праз эстэтычнае пачуццё, фарміраванне мастацкага густу, праз знаёмства дзяцей з творчасцю лепшых мастакоў, паэтаў і пісьменнікаў, з лепшымі творамі класічнай і сучаснай літаратуры. Былі аформлены наступныя выставы: “Новый год в компании мышки”, “Литературная кофейня”, “Рыцарь светлой мечты”, “Есть храм у книг – библиотека”, “Как стать принцессой”, “Женщина – душа Вселенной”. Традыцыйна кожны год на тэрыторыі Ужанкаўскай сельскай бібліятэцы-клуба ў скверы праводзіцца Свята кветак. У 2020 годзе гэта свята адбылося пад назвай “Вальс цветов”. Да свята была аформлена выстава кветак “Украсим жизнь цветами”.

У накірунку эстэтычнае выхавання біліятэкарамі аддзела па рабоце з дзецьмі Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі была арганізавана выстава малюнкаў юных мастакоў-удзельнікаў абласнога плэнэра “Родны краявід”, прысвечаная да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.

Таксама быў падрыхтаваны цыкл эстэтычных гадзін, прысвечаных рускім і беларускім мастакам: “Беларускі пейзажны жывапіс: В.Ванькові́ч”, “В мире русского искусства: І. Левітан, Ф. Васільеў”, “Чараўнікі дзіцячых кніг: У. Суцееў”.

У рамках эстэтычнага выхавання ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” правяла шэраг мерапрыемстваў: віртуальнае падарожжа “Пойдём в музей” (Урэцкая гарпасляковая бібліятэка,

ф. №1), пяць хвілін з мастацтвам “Поэзия природы” (да 60-годдзя з дня нараджэння І. Левітана), музычная гасцёўня “Музыка на ўсе часы” (да 185-годдзя з дня нараджэння П. Чайкоўскага) (Урэцкая гарпасялковая бібліятэка, ф. №39), гульня-гутарка “Азбука этических ценностей”, этыкет-клас “Праздник вежливости и доброты” (Соснаўская сельская бібліятэка, ф. №37).

Сусветнаму дню паэзіі ў Пухавіцкай цэнтральнай раеннай бібліятэцы былі прысвечаны выставы паэтычнага настрою, паэтычныя вернісажы: “Вытанчанай лірыкі пяро”, "Свет паэзіі чароўны". Каля выстаў у бібліятэках прайшлі мерапрыемствы: літаратурная гадзіна "Паэзія – песня душы" (Голацкая сельская бібліятэка), бібліятэчная акцыя "Любімыя радкі ў дзень паэзіі”, гадзіна паэтычнага настрою "Паэзія кахання" (Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), хвілінкі паэзіі "Давайте говорить друг другу комплименты..." (Дубраўская сельская бібліятэка). Падчас правядзення мерапрыемстваў наведвальнікі пазнаёміліся з вершамі В. Паліканінай, Н. Батраковай, В. Тушновай, Л. Шчыпахінай , Я. Янішчыц і інш.

## Сямейнае выхаванне

Узаемадзеянне бібліятэкі і сям'і – эфектыўны шлях далучэння дзіцяці да чытання. Бібліятэка дапамагае бацькам і дзецям у вырашэнні праблем сямейнага выхавання, захавання сямейных традыцый, правядзення творчага і змястоўнага вольнага часу. Чытаючая сям'я з'яўляецца сувязным звяном бібліятэкі з грамадствам. З дапамогай кнігі, бібліятэкары імкнуцца даць сем'ям той аб'яднальны пачатак, які закладзены ў чытанні, падкрэсліваючы значнасць кніжнай мудрасці, дапамагаюць сям'і вырасціць дзіця ўдумлівым чытачом.

Работа з сям’ей з‘яўляецца важным напрамкам работы бібліятэк і яе асаблівасць гэта не толькі абслугоўванне пад адным дахам дарослых і дзяцей, але і правядзенне разнастайных мерапрыемстваў.

Да Міжнароднага дня сям'і ў ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” была абвешчана інтэрнэт-акцыя “Любімыя кнігі маёй сям’і”. Кожны з удзельнікаў акцыі прадставіў фота ці відэаролік пра кнігі, якія любяць чытаць у сям’і і распавёў пра лепшыя літаратурныя творы. У рамках сеткавай акцыі “Радкі аб самых любімых” бібліятэкары і чытачы прадстаўлялі відэаролікі,

дзе чыталі свае вершы, вершы вядомых паэтаў, урыўкі з мастацкіх твораў, прысвечаныя самаму дарагому чалавеку – маме.

З 2020 года пры Харастоўскай сельскай экалагічнай бібліятэцы працуе клуб сямейнага чытання “Блізкія людзі”. На адраджэнне традыцый сямейнага чытання былі накіраваны мерапрыемствы: вечар-імправізацыя “Сям'я – аснова ўсіх асноў”, паэтычны вечар “Святло мацярынскай любові”, акцыі “Любімыя кнігі маёй сям'і”, “Радкі аб самых любімых”.

У рамках праграмы “Дзеці. Сям’я. Кніга.” ДУК “Старадарожская раенная цэнтральная бібліятэка” у 2020 годзе правяла шэраг мерапрыемстваў: літаратурны гід “Островок семейного чтения”, сямейная вечарына “Счастье быть вместе” (Старадарожская сельская бібліятэка), сямейнае свята “Семья – начало всех начал” (Сінягоўская сельская бібліятэка), святочная вечарына “Береги мой друг семью – крепость главную свою” (Палажэвіцкая сельская бібліятэка) і г.д.

Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка працягвала працу па рэалізацыі праграмы “Дзеці. Сям’я. Кніга.”. Работа вялася ў рамках раённай акцыі да Дня сям’і “Чытаем разам” і раённай акцыі віншавання да Дня маці “Букет для матулі”. Афармляліся агляды кніг, прагляды літаратуры, тэматычныя агляды кніг. Да Дня святых Пятра і Фяўронні быў створаны агляд літаратуры “Семейный вопрос на страницах книг”.

З 1999 года пры Сямкоўскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раена дзейнічае аматарскі клуб па арганізацыі вольнага часу сям’і пад назвай “Святло сям’і”, на паседжаннях якога дзеці разам са сваімі бацькамі з цікавасцю і карысцю бавяць свой вольны час і ўдзельнічаюць у розных мерапрыемствах. Сустрэчы ў клубе праходзяць адзін раз у два месяцы. Гэты год быў адметны наступнымі мерапрыемствамі: вечар сямейнага адпачынку “У бібліятэку ўсёй сям’ёй”, інтэлектуальна-пазнавальная гульня “Сям’я – гэта мы”, гульнёвая праграма “Дзень аранжавага настрою”, сямейнае спаборніцтва “Сям’я і кніга – чытаем разам”. Да Міжнароднага дня сям’і былі прысвечаны разнастайныя масавыя мерапрыемствы. Цікава прайшло ў Завішынскай сельскай бібліятэцы-клубе свята “Сям’ёю квеціцца зямля”. Удзельнікі мерапрыемства прадставілі свае генеалагічныя дрэвы, расказалі аб сваіх знакамітых продках, сямейных традыцыях, любімых сямейных кнігах і прынялі ўдзел у музычным і кулінарным

конкурсах. У сценах Коранскай сельскай бібліятэцы адбылася бібліятэчная сустрэча “Сям’я – прытулак для душы”. Да мерапрыемства была падрыхтавана выстава “Па літаратурным моры ўсёй сям’ёй”. 14 кастрычніка адзначаецца значнае духоўнае свята – Пакроў Прасвятой Багародзіцы, да якога прымеркаваны Дзень маці. На чарговым паседжанні сямейнага клуба “Святло сям’і”, які дзейнічае пры Сямкоўскай сельскай бібліятэцы прайшла літаратурна-пазнавальная гульня “Усё самае цікавае”. Шэраг забаўляльна-віншавальных мерапрыемстваў прайшоў і ў іншых бібліятэках раёна: літаратурна-музычны вечар “Матуля, мама, лепшая ў свеце” (Коранская сельская бібліятэка), літаратурны парад “Казкі пра матуль” (Лагойская дзіцячая бібліятэка), літаратурнае свята “Пра тую, што дарue нам жыццё і цяплыню” (Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка) і інш.

Запатрабаванай формай арганізацыі работы ў ДУК “Клецкая раенная цэнтральная бібліятэка” застаюцца гурткі і клубы, якія аб’ядноўваюць дзяцей розных узростаў і захапленняў. З вялікім задавальненнем дзеці і іх бацькі наведваюць сямейны літаратурна-музычны клуб “Імяніннік”, які працуе пры Заастравецкай сельскай бібліятэцы. На пасяджэннях клуба заўсёды цеплая, прыязная атмасфера і абавязкова прысутнічае кніга. Такія мерапрыемствы з’яўляюцца добрай рэкламай дзейнасці бібліятэкі і садзейнічаюць змястоўнай арганізацыі вольнага часу сям’і. Дзеці і дарослыя маюць магчымасць прыняць удзел у розных гульнях, конкурсах, віктарынах, і пачаставацца салодкімі ласункамі.

З мэтай удасканалення работы па прыцягненню непаўналетніх і іх сем’яў пры ДУК “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” дзейнічаюць сямейныя клубы “ДОМ” (Мінская раённая цэнтральная бібліятэка), “Гнёздышко” (Гатаўская сельская бібліятэка-клуб), “Семейные портреты” (Ждановіцкая сельская бібліятэка), “7Я” (Заслаўская дзіцячая бібліятэка), “Семейный свет” (сельская бібліятэка а/г Лясны), “Камелія” (Ратамская сельская бібліятэка), “Вдохновение” (Каладзішчанская сельская бібліятэка № 1). У бібліятэках ДУК “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” арганізаваны тэматычныя выставы, на якіх прадстаўлены кнігі, часопісы аб маральных сямейных каштоўнасцях, праблемах выхавання: “Будзе ў сям’і лад, калі кнізе рад” (Ждановіцкая сельская бібліятэка), “Тепло семьи – источник вдохновения” (Заслаўская

гарадская бібліятэка), “Прапануем дзецям і бацькам” (бібліятэка аг. Бальшавік).

Праўдзінская сельская бібліятэка Пухавіцкага раена запрасіла чытачоў на літаратурна-музычны вечар "Прыгажуняй-княгіняй пазірае мне ў вочы вясна". На працягу мерапрыемства дзейнічалі тэматычныя пляцоўкі. На пляцоўцы “Умелые руки не ведают скуки” былі прадстаўлены вырабы чытачак, а бібліятэкар зрабіла агляд артыкулаў перыядычных выданняў аб рукадзеллі. На літаратурнай пляцоўцы “Любові ўсе ўзросты пакорлівыя” гучалі вершы прысвечаныя жанчыне. На тэатральнай пляцоўцы “Я ўсё ўмею, я ўсё змагу” была прадстаўлена гумарыстычная сцэнка “Пара на дачу”. Ролі выконвалі карыстальнікі бібліятэкі. На музычнай пляцоўцы “Ах, какая жанчына!” прагучалі песні аб жанчыне, маме, вясне, каханні.

Пры Семежаўскай сельскай бібліятэцы (Капыльскі раен) працуе сямейны клуб “Пяшчота”, у межах якога праходзяць мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня сям’і, Дня маці, Дня жанчын. Да гэтых свят былі прымеркаваны: агляд літаратуры і перыядычных выданняў, конкурс на самае арыгінальнае віншаванне “Сделай – это красиво” (да Дня св. Валянціна), гульнёва-забаўляльная праграма “Я і ўся мая сям’я”, кніжная панарама забытых кніг “Кнігі мінулага стагоддзя”, “Дзень мудрасці і павагі” (да Міжнароднага дня пажылых людзей).

Тыдзень мерапрыемстваў і кніжных выстаў да Міжнароднага дня жанчын прайшоў пад назвай “Дарагое сэрцу слова — МАМА” у Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэцы У рамках гэтага тыдня прайлі: святочная праграма “Святло жанчыны ззяе ў Сусвеце” (Любанская раённая цэнтральная бібліятэка), літаратурна-паэтычная праграма “Адзінай маме на свеце”, святочная імпрэза “Шар земной на ладонях маминых” (Загальская сельская бібліятэка), літаратурна-музычная кампазіцыя “Самой лучшей на свете” (Малагарадзяціцкая сельская бібліятэка), круглы стол “Мама — какое тёплое слово” (Рачэнская сельская бібліятэка) і інш.

У справаздачным годзе працягвалася работа ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы” па рэалізацыі раённай праграмы сямейнага чытання “Войдём в этот мир вместе”, у рамках якой праводзіліся наступныя мерапрыемствы: літаратурнае шоу-спаборніцтва “Сям’я і кніга – чытаем разам”, сямейная гадзіна “Сям’я – гэта мы!” (Бобрская гарпасялковая бібліятэка); сустрэча

з шматдзетнай сям’ёй “Пад сямейным парасонам” (Коласаўская сельская бібліятэка); выстава малюнкаў “Самая вялікая каштоўнасць – сям’я” (Абчугская сельская бібліятэка-клуб); акцыя “Чытаем усёй сям’ёй” (Узнацкая сельская бібліятэка-клуб); круглы стол “Семья начало всех начал” (Ухвальская сельская бібліятэка).

У Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П.Труса працягвае сваю работу клуб “Мая сям’я”. Праводзіліся тэматычныя мерапрыемствы: вечар-віншаванне “З дабром, каханнем і вясной”, літаратурна-музычная кампазіцыя “Пяшчотнай, ласкавай самай”. Асноўныя ўдзельнікі мерапрыемстваў – бацькі, якія выхоўваюць прыёмных дзяцей. У Дзень маці для чытачоў цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса была праведзена акцыя-камплімент “Поздравим маму вместе”, у рамках якой была падрыхтавана кніжная выстава “За всё тебя благодарю”, афармлена імправізаванае дрэва з выказваннямі пісьменнікаў пра маці і кампліментамі ад чытачоў. У рамках рэспубліканскай прафілактычнай акцыі “Дом без насилия!” была афармлена выстава-прызыў “Семья без жестокости”.

Ва ўмовах пандэміі бібліятэкары зрабілі акцэнт на індывідуальнай рабоце з кожнай сям’ёй і выкарыстоўвалі любую магчымасць для таго, каб падкрэсліць значэнне кнігі для сямейнага выхавання. Фотаконкурс “Всей семьёй у книжной полки” правялі ў Слабадской бібліятэцы-клубе, літаратурную прышчэпку “Всё начинается с семьи” – у Хатлянскай сельскай бібліятэцы, конкурс малюнкаў “Семья – это важно! Семья – это сложно! Но счастливо жить одному невозможно!” – у Цепленскай сельскай бібліятэцы.

У рамках тыдня, прымеркаванага да Міжнароднага Дня сям’і “Чытанне ў фармаце сям’і” ў Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэцы прайшоў сямейны бібліякуфэрак “И чтоб семье огонь дарил тепло” разам з членамі клуба “Чытаем разам”. У Гародзькаўскай сельскай бібліятэцы (Валожынскі раён) сумесна з ДШМ прайшла акцыя “Чытаем разам “Мой дом – мая сям’я” на якой была прадстаўлена выстава сямейнай творчасці: вышыўкі, вязанне, разьба па дрэву.

У гарадской бібліятэцы-філіяле №1 ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча” прайшла акцыя “Шчасце быць разам”. Усім наведвальнікам бібліятэкі ў Міжнародны дзень сям'і прапаноўвалася на пялёстках папяровай рамонкі скончыць фразу “Сям'я – гэта ...”. Увазе чытачоў была прадстаўлена кніжная выстава “Сямейны калейдаскоп”, дзе

прапаноўваліся кнігі, брашуры, перыядычныя выданні па пытаннях сямейных адносін. Можна было азнаёміцца з літаратурай пра вядзенне хатняй гаспадаркі, выхаванне дзяцей, стварэнне ўтульнасці і гармоніі ў доме і пра многае іншае.

У справаздачным годзе ДУК "Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка" спрыяла зберажэнню сямейных традыцый, стварэнню вобраза паспяховай жанчыны ў статусе мацярынства. Раскрыццю гэтай тэмы спрыялі выставы-агляды "Вобраз жанчыны-маці ў беларускай мастацкай літаратуры" (Лешніцкая, Любушанская, Косаўская сельскія бібліятэкі). Міні-тэатр Бярэзінскай цэнтральнай раеннай бібліятэкі "Жывая кніга" прадставіў бярэзінскім жанчынам апавяданні М. Герчыка "Кубак малака", В. Кадзетавай "Пуховая хустка" і г.д.

У Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася шчырая размова да Міжнароднага дня сям'і "Семья – это…". Кожны з удзельнікаў сустрэчы падзяліўся асабістым, расказаў, што для яго азначае слова сям'я, каханне, чуласць. Да дня Маці прайшоў паэтычная гадзіна "Мир под названием "Мама".

Пастаянна дзеючая кніжная выстава "Каб не згасла сямейнае вогнішча" у Грабёнскай сельскай бібліятэцы карыстаецца добрым попытам у наведвальнікаў. Парад кніг "Читали ваши мамы, читали ваши папы, и бабушки ваши тоже читали. И книги прочесть эти вам завещали" быў сапраўдным адкрыццём. Дзеці з цікавасцю знаёміліся з кнігамі, якія ў дзяцінстве чыталі не толькі бацькі, а і дзядулі і бабулі. Многія з дзяцей узялі гэтыя кніжкі да дому пачытаць. Да Дня маці прайшла вечарына-віншаванне "От всей души с поклоном и любовью". Мерапрыемства прайшло сумесна з Домам культуры і сярэдняй школай.

Да Міжнародняга дня сям'і ў бібліятэках ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" таксама прайшлі разнастайныя мерапрыемствы: сямейны круіз "Родительский дом – начало начал" (Фаніпальская гарадская бібліятэка); дзень сямейнага чытання "Счастлива будет ваша семья, если чтением увлечена" (Забалацкая сельская бібліятэка); сустрэча чытаючых сямей "Шчасце – быць разам" (Путчынская сельская бібліятэка); урок дабрыні "Аб сям'і з любоўю" (Томкавіцкая сельская бібліятэка); гульнёвая праграма "Сям'я – гэта значыць мы разам" (Навасёлкаўская інтэграваная сельская бібліятэка Б).

ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік” таксама надае сямейнаму чытанню шмат увагі. Былі праведзены: конкурсна-забаўляльная праграма “Великое чудо – семья!” (аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай раеннай цэнтральнай бібліятэкі імя Г.Новік); спартыўнае свята “Папа, мама, я – дружная семья!” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка сумесна з Іжскім Домам культуры); бібліятэчныя пасядзелкі “Сям’я і кніга – чытаем разам!” (Мацькаўская сельская бібліятэка); конкурс на лепшы ліст да матулі “Мама – жизни начало” і выстава малюнкаў “Единственной маме на свете” (Бібіліятэка сямейнага чытання) і г.д.

Для папулярызацыі чытання сярод не толькі дзяцей, але і іх бацькоў ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” арганізоўвае шмат сямейных мерапрыемстваў. Напрыклад, да Дня жанчын прайшлі такія мерапрыемствы, як жаночы погляд “Счастливая и красивая” (Цэнтральная гарадская бібліятэка), кніжная араматэрапія “Ароматерапия – красота и удовольствие” (Цэнтральная гарадская бібліятэка), выстава-вернісаж “Наши мамы лучше всех!” (бібліятэка сямейнага чытання) і г.д.

## Краязнаўчая дзейнасць

Краязнаўчая дзейнасць працягвае заставацца адным з прыярытэтных напрамкаў у рабоце бібліятэк Мінскай вобласці.

У справаздачны год краязнаўчая дзейнасць бібліятэк вялася ў адпаведнасці з рэгіянальнымі і мясцовымі праграмамі і праектамі: спецыяльны краязнаўча-асветніцкі інавацыйна-творчы праект “Гісторыя раёна ў суквецці датаў і імёнаў”, краязнаўчы праект “Краязнаўчы лекторый на колах” (ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка”), літаратурна-краязнаўчы праект “Пад зоркай паэзіі” (ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”), раённая мэтавая праграма “Вяртанне да вытокаў” (Ракаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), віртуальны фотапраект “Малая радзіма на старых фотаздымках”, праекты “Бібліятэка – інфармацыйна-краязнаўчы цэнтр” і “Чытаем кнігі мясцовых аўтараў”, праграма “Жыве народ, пакуль жыве яго гістарычная памяць” (ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”), праект “Гісторыя малой радзімы ў асобах і падзеях” (Партызанская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), праект “Кросны” (Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), праграма “Мая зямля, мае землякі”, праекты

“На літаратурным небасхіле Дзяржыншчыны”, “Гісторыя Дзяржыншчыны ў асобах”, “Краязнаўчая палітра”, “Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем” (ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”), краязнаўчыя праекты “Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем”, “Гучыць напеўна, бы мелодыя, гаворка скірмунтаўская” (Скірмантаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), краязнаўчая праграма “І для мяне не было б Беларусі, без маленькай Радзімы маей” (ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”), раённая краязнаўчая праграма “Зямля бацькоў – майго жыцця крыніца” (ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”), краязнаўчая праграма “Жыву і дыхаю, мой Крупскі край, табой”, мультымедыйны праект “Унікальныя насельнікі жывельнага і расліннага свету Крупскага раёна” (ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”), мэтавая праграма “Святло малой радзімы” (сетка публічных бібліятэк Лагойскага раёна), рэгіянальны краязнаўчы праект “Наша спадчына” (ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”), праект “Мой край – Маладзечаншчына” ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча), “Пра цябе, мой родны горад, я з любоўю раскажу” (Бібліятэка сямейнага чытання “Верасок” г. Маладзечна), мэтавая праграма “Зямля мая, святая і адзіная. Адраджэнне…”, праект “Міншчына” (ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Спеў пра малую радзіму” (Шаршунская сельская інтэграваная бібліятэка Мінскага раёна), “Возращение к истокам” (Навасельская сельская бібліятэка Мінскага раёна), краязнаўча-асветніцкі праект “На гэтай зямлі нашы продкі жылі” (ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”), праект “Лёсам з Нясвіжчынай” (ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”), раённы бібліятэчны праект “Літаратурнае сузор’е Пухавіччыны” (ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка”), тэкстыльны арт-праект “Мягкая Родина”, праекты “Зямля, дзе ўтульна сэрцу”, “Культурный код Солигорска” (ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”), духоўна-краязнаўчы праект “Слуцк – валошка ў вянку Беларусі” (ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”), раённы бібліятэчны праект “Край мой – гонар мой” (сетка публічных бібліятэк Смалявіцкага раёна), “Свой родны край любі і знай” (Зялёнаборская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), праграмы “Спадчына”, “Памяць Міншчыны”, раённая мэтавая

праграма “Ён Радзімаю завецца – непаўторны мілы край” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), раённая мэтавая краязнаўчая праграма “Краязнаўчая прастора: імёны і час”, вэб-праект “Пісьменнікі Уздзеншчыны – дзецям” (ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”), праграма “Ведаць і любіць свой край” (ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”).

У жыцці кожнага чалавека асабліваe месца займае малая радзіма. Менавіта там, дзе мы нарадзіліся і выраслі, адбываюцца найважнейшыя падзеі, якія застаюцца ў памяці на ўсё жыццё.

Мінулае і сучаснасць горада, раёна, вёскі, вопыт папярэдніх пакаленняў, іх традыцыі, побыт, звычаі, прыродныя своеасаблівасці мясцовасці і многае іншае – усё гэта нярэдка становіцца тэмай шматлікіх бібліятэчных мерапрыемстваў.

У Барысаўскім раёне праходзіў Тыдзень, прысвечаны памяці заснавальніка горада Барысава – князя Барыса. У святочныя мерапрыемствы, што праходзілі на Тыдні ў г. Барысаве, унесла сваю лепту і Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева. У рамках Тыдня памяці ўстановай праводзіліся асветніцкія мерапрыемствы (інфармацыйная старонка “Этот город основал князь Борис”, тэматычная гутарка “Имя князя Бориса в истории нашего города”, прэзентацыя кнігі “Борисовская епархия. Прошлое и настоящее”), а таксама афармляліся кніжныя выставы (“Святой благоверный князь Борис: страницы истории Борисовского края”, “Имя в летописи: князь Борис и его время”, “…поставил град Борисов в своё имя”, “Князь Борис – основатель города Борисова”, “Князь-воитель, князь-градостроитель”).

У ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” працягваў работу спецыяльны краязнаўча-асветніцкі інавацыйна-творчы праект “Гісторыя раёна ў суквецці датаў і імёнаў” разлічаны на 2018–2020 гады з улікам знамянальных датаў – 95-годдзя Бярэзінскага раёна, 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 75-годдзя Перамогі. Праект спрыяе актуалізацыі краязнаўчага патрыятызму, дазваляе разбудзіць пазнавальную цікаўнасць і дапытлівасць сучаснікаў да гісторыі роднага краю, выбітных землякоў, якія з’яўляюцца духоўнай элітай грамадства, вызначаюць інтэлектуальны твар рэгіёна, з’яўляюцца для сучаснікам духоўным камертонам. За лёсам землякоў – лёс горада і раёна, багатая энцыклапедыя чалавеказнаўства.

Другі год рэалізацыі праекта ў гонар малой радзімы даў свае напрацоўкі. Зладжаны 11 акцый цыклаў “Вялікія імёны малой радзімы”, “На малую радзіму да земляка – з паклонам”, “Вядомыя бярэзінцы ў сталіцы”, “Горад у спадчыну”, “Імя на літаратурнай карце Бярэзіншчыны”, “Ветэраны – маякі памяці”, “Малая радзіма: месца добрых пачынаў”, “Сузор’е мужнасці”. Прайшлі мерапрыемствы-прысвячэнні землякам – звычайным у сваёй незвычайнасці людзям, мерапрыемствы, якія ствараюць духоўны партрэт землякоў і партрэт часу, малююць вясёлку лёсаў – маленькія хронікі бярэзінцаў. Такія мерапрыемствы нясуць высокую адлюстравальна-пазнавальную, выхаваўча-грамадскую, краязнаўча-зберагальную місію.

У Заастравецкай сельскай бібліятэцы-філіяле Клецкага раёна быў створаны этнаграфічны куток. Тут прадстаўлены інфармацыйны краязнаўчы матэрыял, а таксама рэчы сялянскага побыту мінулых часоў: бажніца, бойка, верацяно, гарлач, калаўрот, матавіла, пранік, прас, сукала, мужчынскае і жаночае адзенне пачатку ХХ стагоддзя, ткацкі станок, лапці, керасінавая лямпа, радыёла, шалі, барабан, кадушка, сявенька, ступа, скрыпка, калыска і шмат іншых прадметаў. Трэба сказаць, што куток пастаянна папаўняецца новымі экспанатамі.

Значнай падзеяй для Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі стала 95-годдзе ўтварэння Лагойскага раёна.. З гэтай нагоды была арганізавана дэкада краязнаўства “Мой непаўторны, родны край”. Бібліятэкі раёна правялі цікавыя і змястоўныя мерапрыемствы, якія знаёмілі з гісторыяй, мясцовымі традыцыямі і сучаснасцю краю, знакамітымі землякамі.

Шэраг цікавых і змястоўных мерапрыемстваў адбылося на працягу тыдня краязнаўства “Лагойшчына – мая радзіма” ў Плешчаніцкай гарпасялковай бібліятэцы Лагойскага раёна. Інфармацыйная гадзіна “Лагойскаму раёну – 95” праведзена ў выглядзе падарожжа па Лагойшчыне. Мерапрыемства суправаджалася прэзентацыяй “Лагойшчына: учора і сёння” у час якога прысутныя пазнаёміліся з прыгожымі мясцінамі нашага раёна, здзейснілі завочнае падарожжа ў купалаўскія мясціны, музей “Акопы”, гарналыжныя комплексы “Лагойск” і “Сілічы”, наведалі мемарыяльныя комплексы “Хатынь” і “Дальва”. Краязнаўчае падарожжа “Тут я нарадзіўся, тут я жыву” было прысвечана Плешчаніцам. Прагучаў цікавы аповед пра былое і сучаснае, пра

людзей, якія праславілі сваю маленькую радзіму. Прысутныя пазнаёміліся з выставай мясцовых паэтаў і пісьменнікаў, фотаздымкамі вядомых мясцін гарадскога пасёлка, краязнаўчымі папкамі “Мая малая радзіма”, “Плешчаніцы і вайна 1912 года”, “З легендаў і паданняў”. Гутарка-ўспамін “Людзьмі і памяццю жыве наш край” была прысвечана паэтам і пісьменнікам Лагойшчыны. Гучалі вершы Н. Гілевіча, С. Давідовіча, В. Максімовіча. Агляд краязнаўчых матэрыялаў “Мы ўспамінем пра вайну” пазнаёміў з артыкуламі, прысвечанымі Вялікай Айчыннай вайне, партызанскаму і падпольнаму руху на тэрыторыі Лагойшчыны. Адбылося знаёмства з краязнаўчымі папкамі-дасье: “Ведаць і памятаць”, “Плешчаніцкае падполле”, “Франтавымі дарогамі”, “Бой за пасёлак”.

Сустрэчы-экскурсіі па родным краі – гэта цэлы свет, разнастайны і цікавы, які прыносіць шэраг эмоцый і выдатны настрой. З мэтай арганізацыі вольнага часу і распаўсюджвання краязнаўчай інфармацыі ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” быў распрацаваны праект “Міншчына”, асноўнай задачай якога з’яўляецца азнакамленне з гістарычнымі і памятнымі месцамі Мінскага раёна праз стварэнне віртуальных экскурсій, якія распавядаюць аб краі і яго адметнасцях. Сацыяльная значнасць праекта – стварэнне аптымальных умоў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, з мэтай паўнавартаснага задавальнення інфармацыйных патрэб у краязнаўчай інфармацыі і знаёмства з прысталічным рэгіёнам. Мерапрыемствы праходзілі адзін раз у месяц у цёплай атмасферы, з душэўнай гутаркай.

У рамках праекта прайшлі вечары-сустрэчы: “Анопаль, на беразе ракі”, “Міханавічы. З любоўю да Радзімы”, “Ігнацічы – старадаўняя сядзіба Мінскага краю”, “Палац у Прылуках”, “Малы Трасцянец – лагер знішчэння”, “Лашаны. Лінія Сталіна”, “Строчыцы – музей народнай архітэктуры і побыту”, “Гісторыя сядзібы Сёмкава”, “Царква Спаса-Праабражэнская ў Астрашыцкім Гарадку”, “Заслаўе – старажытны горад Беларусі”, “Сядзібна-паркавы ансамбль у в. Новае Поле”, “Раўбічы. Гісторыя і сучаснасць”.

У гарпасялковай бібліятэцы-філіяле г. п. Радашковічы Маладзечанскага раёна прайшоў гістарычны бенефіс “Мой посёлок накануне юбилеев”, прысвечаны 470-годдзю першага ўспаміна Радашковіч як горада і 450-годдзю атрымання Радашковічамі Магдэбургскага права. На мерапрыемстве бібліятэкары распавядалі

аб новых фактаграфічных звестках, датах, імёнах. Расказалі пра нараджэнне горада, яго станаўленне, аб вяльможах і простых жыхарах, пачынаючы з XV стагоддзя і заканчваючы XX. Не маглі пакінуць без увагі і 40-годдзе аб’яднання “Белмастацкераміка” – аднаго з градаўтвараючых прадпрыемстваў. На мерапрыемства быў запрошаны былы яго загадчык Кладаў Мікалай Аляксандравіч. Мерапрыемства суправаджала выстава-інсталяцыя керамічных вырабаў “Ганчарны звон”, экспанаты для якой збіралі з дапамогай прадпрыемства і чытачоў.

На базе ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы” адбылася навукова-практычная канферэнцыя “Нясвіжчына: аб мінулым для будучага”, прысвечаная гісторыі і культуры Нясвіжчыны.

Году малой радзімы была прысвечана праца над праектам “Лёсам з Нясвіжчынай”. Дадзены праект накіраваны на фарміраванне пазнавальнай актыўнасці і цікавасці да гісторыі сваёй малой радзімы праз выяўленне і знаёмства з жыццём і дзейнасцю выдатных людзей, лёс якіх цесна пераплёўся з гісторыяй Нясвіжчыны. У рамках праекта былі праведзены партрэтныя інтэрв'ю “Лёс чалавека” са значнымі для Нясвіжа асобамі.

У Мар’інагорскай гарадской бібліятэцы ўзяў старт літаратурна-краязнаўчы марафон “Мне па сэрцу маленькая Радзіма, мне па сэрцу мой любімы край”, прысвечаны 95-годдзю з дня ўтварэння раёна.

Да Году малой радзімы і 95-годдзю ўтварэння Салігорскага раёна ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” быў распрацаваны і паспяхова рэалізоўваўся новы тэкстыльны арт-праект “Мягкая Родина” –вялікі пазл з прыбраных каляровых рэгіёнаў, пашыты рукамі бібліятэкараў, які ператвараецца ў інтэрактыўнае дзеянне.

На свяце, прысвечаным 95-годдзю Салігорскага раёна, Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка прадставіла літаратурную пляцоўку “Шчасце жыць на роднай зямлі”. Салігарчанам і гасцям свята бібліятэкары прапаноўвалі прыняць удзел у паэтычным марафоне “Салігоршчына ў вершах”, віктарыне “Моўныя скарбы роднага краю”, з дапамогай кубікаў-пазлаў скласці “Сімвалы роднага краю”, стварыць карту Беларусі з аб'ёмных частак мазаікі “Мягкая Родина”.

Актыўна працаваў радыёуніверсітэт “Зямля мая, любоў мая” у ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”. Радыёгутаркі

знаёмілі з юбілейнымі краязнаўчымі датамі, жыццём і дзейнасцю знакамітых землякоў, гістарычнымі падзеямі Случчыны. У 2019 годзе ўвазе радыёслухачоў прапанавана 31 радыёгутарка рознай тэматычнай накіраванасці.

Зямля Міншчыны заўсёды славілася сваімі таленавітымі людзьмі, таму вялікая ўвага надаецца папулярызацыі творчасці самадзейных мясцовых аўтараў.

У Год малой радзімы ў ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” правялі творчыя сустрэчы чытачоў з барысаўскім паэтам Андрэем Ніканчыкам, з членам Барысаўскага літаратурнага аб'яднання “Натхненне” Людмілай Валасевіч, з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Лёлей Багдановіч; з паэтам-песеннікам Уладзімірам Рудзікам, з барысаўскай паэткай, пісьменніцай і журналісткай Аленай Брыцкой, з таленавітым паэтам, выхадцам з г. Барысава Аляксандрам Быкавым, з сучасным беларускім пісьменнікам, ураджэнцам г. Барысаў Кірылам Стаселькам, Янкам Лайкавым і інш.

У Бярэзінскім раёне масштабна прайшоў месячнік літаратурнага краязнаўства “Літаратура з правінцыяльнай прапіскай” з цыклам бібліятэчных мерапрыемстваў, прысвечаных творчасці пісьменнікаў-землякоў. Цэлы месяц, на працягу лістапада, наведвальнікаў раённай бібліятэкі і цэнтра культуры радавала прадстаўленая ў фае ўстановы літаратурна-мастацкая экспазіцыя “Літаратурнае сузор’е Бярэзіншчыны”.

Аддзел абслугоўвання Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі прапанаваў літаратурны круіз па творчасці пісьменнікаў-землякоў, прэзентацыю кнігі бярэзінскага пісьменніка-фантаста А. Бычкоўскага “Ахвяры натхнення” цыкла “Пісьменнік жыве сярод нас”.

“Акрамя любімай Беларусі, мне зусім не трэба той Парнас…” – пад такой назвай у ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” адбылася літаратурная вечарына памяці да 105-годдзя з дня нараджэння Г. А. Новік.

Яркай падзеяй у ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” стала прэзентацыя паэтычнага зборніка Анатоля Прыстаўкі “Строка, прошедшая сквозь сердце”.

Завяршыўся Год малой радзімы ў ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” VIII Койданаўскімі чытаннямі. Для тых, хто вырашыў падзяліцца сваімі здабыткамі на ніве

даследчай работы, была прапанавана агульная тэма для паведамленняў – “Малая радзіма ў гістарычным вымярэнні”.

У ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі” была праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя “З мелодый вытканы радок” з нагоды 115-годдзя з дня нараджэння паэта-песенніка і музыканта Адама Русака.

Да 80-годдзя з дня нараджэння паэта-земляка В. Макарэвіча ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы” правяла літаратурную гадзіну “Малюю вершам родны край”, да 75-годдзя паэта-земляка П. Талкачова – вечар-партрэт “Адчуваю зайдрасць да жыцця”.

У Янушкавіцкай сельская бібліятэцы Лагойскага раёна адбылася прэзентацыя гісторыка-публіцыстычнай кнігі пісьменніцы Галіны Каржанеўскай “Лагойшчына. Голас памяці”.

На вечары паэзіі “Ты самы прыгожы мой краю, цябе гэтым вершам вітаю”, які адбыўся ў Завішынскай сельскаяй бібліятэцы Лагойскага раёна, прагучалі вершы нашых паэтаў-землякоў Я. Купалы, Н. Гілевіча, В. Максімовіча, М. Лешчуна, Г. Каржанеўскай, В. Бурага, Т. Крэнь пра Лагойшчыну.

“Жыццё, звязанае словам” – пад такой назвай на базе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” адбылася творчая сустрэча пісьменнікаў Мінскай вобласці. Дэлегацыю ўзначаліла старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Быкава Святлана Анатольеўна.

На творчую сустрэчу ў бібліятэку ДУ “Мінскі РЦК” Мінскага раёна і ў Гатаўскую сельскую бібліятэку-клуб Мінскага раёна завітала вядомая беларуская пісьменніца Кацярына Хадасевіч-Лісавая, якая пазнаёміла прысутных са сваімі творамі, што прасякнуты атмасферай казкі і чараўніцтва, з неверагоднымі прыгодамі, якія адбываюцца з героямі кніг.

У бібліятэках Мінскага раёна прайшлі сустрэчы з Ірынай Аляксандраўнай Карнаухавай, пісьменніцай, музыкантам, літаратарам, членам беларускага саюза музычных дзеячаў і Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Дзень памяці Максіма Багдановіча “Струменіцца Максімава крынічка” супрацоўнікі ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” правялі ў “Фальварку Ракуцёўшчына”,

Працягвала свае маршруты і акцыя "Маладзечаншчына літаратурная – 2019", якая прайшла праз вёску Выверы. На сустрэчу з вучнямі і настаўнікамі Выверскага вучебна-педагагічнага комплекса завіталі пісьменнікі Тамара Аўсяннікава, Лідзія Гардынец, Тамара Бярэзіна і Міхась Казлоўскі.

Літаратурная гадзіна "Я да цябе прапісаны, мой край" у Нарацкай сельскай бібліятэцы Мядзельскага раёна была прысвечана паэту-земляку Міколу Шабовічу.

У ДУ "Мядзельская раённая бібліятэка імя Максіма Танка" адбылася творчая сустрэча з паэтамі-землякамі Міколам Шабовіч і Аляксандрам Быкавым.

У Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ім. П. Пранузы адбыўся IV фестываль паэзіі імя П.Пранузы "Голасам свайго пакалення".

Дружненскай дзіцячай бібліятэкай Пухавіцкага раёна было арганізавана і праведзена літаратурнае свята пад назвай "Пухавіцкі край ў кнігах Алеся Карлюкевіча".

У ДУК "Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка" прайшоў літаратурны тыдзень "Максім Лужанін – талент ад роднай зямлі", прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння пісьменніка-земляка.

У Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з З. І. Падліпскай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтам, публіцыстам, перакладчыкам, даследчыкам сучаснай паэзіі, дырэктарам Цэнтра праваслаўнага краязнаўства і нацыянальнальнай культуры Сінадальнага аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Беларускага экзархата, ураджэнкай Случчыны.

У 2019 годзе адбыліся XII Віткаўскія чытанні "Па закліку сапраўднай любові", прымеркаваныя да 108-й гадавіны з дня нараджэння Васіля Віткі.

Ва ўрачыстым адкрыцці XII Віткаўскіх чытанняў прынялі ўдзел галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" Уладзімір Ліпскі і супрацоўнікі рэдакцыі Анастасія Радзікевіч, Радміла Казлякевіч і Вікторыя Ляйкоўская, якая друкуе свае творы пад псеўданімам Віка Трэнас. Да школьнікаў з прывітальным словам звярнуўся Уладзімір Ліпскі. Чытачы бібліятэкі ў сваю чаргу пачыталі гасцям вершы беларускіх паэтаў. Танцавальны падарунак усім прысутным падрыхтавалі вучні гімназіі №2, удзельнікі раённага конкурсу "Вясновы вальс".

У рамках чытанняў адбылося свята вуліцы Васіля Віткі, арганізаванае Дзяржаўнай установай "Слуцкая раённая цэнтральная

бібліятэка”і ДУА “Сярэдняя школа №11 г. Слуцк”. Для гасцей і жыхароў былі адрыхтаваны лялечна-гульнёвая праграма “Урокі Васі Вясёлкіна», кніжная выстава “Паэт. Казачнік. Настаўнік”, літаратурная сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Ганнай Міклашэвіч. А яшчэ ў госці да жыхароў мікрараёна завіталі вядомы віткаўскі персанаж Вася Вясёлкін і Васілінка, якія загадвалі дзецям загадкі, вялі дыялог пра творчасць пісьменніка. Школьнікі чыталі вершы, прадэманстравалі свае веды аб літаратурных персанажах паэта ў конкурсе малюнкаў на асфальце. Свята ўпрыгожылі шоу мыльных бурбалак, паказальныя выступленні байцоў клуба «Фенікс» і спартыўныя забавы.

У 2019 г. ва ўсіх бібліятэках вобласці адзначаліся наступныя падзеі:

Дзень роднай мовы: урок беларусазнаўства “Які гэта цуд, мова мая родная” (сельская бібліятэка № 24 в. Кішчана Слабада Барысаўскага раёна, тыдзень беларускай мовы “Час чытаць на роднай мове” (сельская бібліятэка № 39 в. Перасады Барысаўскага раёна), літаратурная гульня “Родная мова – цудоўная мова” (сельская бібліятэка № 41 в. Зорычы Барысаўскага раёна), тыдзень беларускай мовы “Прыгарніся да роднага слова” (ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка”), урок беларусазнаўства “Роднай мовы спадчына жывая” (Багушэвіцкая сельская інтэграваная бібліятэка-клуб Бярэзінскага раёна); акцыі для школьнікаў “Я размаўляю з бацькамі па-беларуску”, “Твае першыя кніжкі па-беларуску” (Брадзецкая сельская інтэграваная бібліятэка-клуб Бярэзінскага раёна), акцыя “Размаўляем па-беларуску” (ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”); віктарына “Мова нанова” (Даўгінаўская і Людвіноўская сельскія інтэграваныя бібліятэкі Вілейскага раёна); літаратурныя чытанні “Любі і ведай родную беларускую (Любанская сельская бібліятэка Вілейскага раёна); урок беларусазнаўства “Шануй роднае слова” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), гульнёва-пазнавальная праграма “Прыгарніся да роднага слова” (Валмянская інтэграваная сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), тыдзень беларускай мовы “Гаворым па-беларуску” (ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”), лінгвістычная гульня “Знаўцы роднай мовы” (Клецкая дзіцячая бібліятэка), дзень роднай мовы “Твае першыя кніжкі па-беларускі” (Сякерыцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), пазнавальная гадзіна “Беларус, роднай мовы сваёй

не цурайся” (Даматканавіцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), гульня-віктарына “Таямніца беларускіх слоў” (Ардзянская сельская бібліятэка-клуб Клецкага раёна), свята “Святло роднай мовы” (Зубкаўская сельская бібліятэка Клецкага раёна), гадзіна аховы роднай мовы“ Шануйце роднае слова” (Лагойская цэнтральная бібліятэка), дзень беларускай мовы “Святло роднай мовы” (Акцябрская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), Тыдзень беларускай мовы, турнір знаўцаў “Размаўляй са мной па-беларуску!” (Завішынская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), вусны часопіс “Шануйце родную мову” (Астрошыцкая сельская бібліятэка Лагойскага раёна), падарожжа ў гісторыю “Мова пявучая, родная мова, ты – уладарка нявызнанных скарбаў” (Гасцілавіцкая сельская бібліятэка Лайгоскага раёна), гадзіна роднай мовы “Наша мова жывая, як вада” (Калачаўская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), моўная скарбонка “Слова жывое, роднае, гаваркое” (Сямкоўская сельская бібліятэка Лайгойскага раёна), раённы конкурс-віктарына “Размаўляем па-беларуску” (ДУК “Любанская цэнтральная раённая бібліятэка”), літаратурна-музычная гасцёўня “Гучы, родная мова” (Бібліятэка ДУ “Мінскі РЦК” Мінскага раёна), гадзіна роднай мовы “Любім родную беларускую мову” (Вішнёўская інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна), свята “Любім і ведаем родную, беларускую мову” (Ждановіцкая сельская бібліятэка Мінскага раёна), флэш-моб “Сваёю моваю я ганаруся” (Баярская сельская бібліятэка-дом вольнага часу Мядзельскага раёна), літаратурная вітрына “І прыгожа льецца па прасторы слова беларускай мовы” (Пузыроўская сельская бібліятэка-дом вольнага часу Мядзельскага раёна), гульня-віктарына “Таямніцы беларускіх слоў” (Сваткаўская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна), акцыя “Размаўляй са мной па-беларуску” (Княгінінская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна), літаратурная замалёўка “Як званочак гучыць наша мова” (Нарацкая пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна), акцыя “Размаўляй са мной па-беларуску”, эрудыт-шоў “Мова цікавая і займальная” (ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”), дзень мовы “Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся” (Грыцкевіцкай інтэграванай сельскай бібліятэкай Нясвіжскага раёна), літаратурна-забаўляльная гульня “Не проста ў словы я гуляю – на роднай мове размаўляю” (Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), свята беларускага фальклора “Экскурс у родную мову” (Пухавіцкая

раённая дзіцячая бібліятэка), літаратурна-музычная кампазіцыя “Мелодыя роднага слова” (Дрычынская сельская інтэграваная бібліятэка Пухавіцкага раёна), урок беларусазнаўства “Які гэта цуд – мова мая родная” (Блонская сельская бібліятэка Пухавіцкага раёна), гадзіна паэзіі “Мове маёй не збяднець аніколі…” (Дружненская дзіцячая бібліятэка Пухавіцкага раёна), акцыя “Гаворыць сэрца мовай песняроў” (ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”), літаратурна-музыкальная кампазіцыя “Слова роднае – вечнасці след” (Старобінская гарпасялковая бібліятэка Салігорскага раёна), літаратурная кампазіцыя “Любім і ведаем родную беларускую мову” (Клянніцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), вечарына беларускай мовы “О, мова беларуская мая!” (Пятровіцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), інфармацыйная гадзіна “Святло роднай мовы” (Прылепская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), літаратурныя старонкі “Дала мне маці мову гэту” (Азярыцкаслабадская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), гадзіна паэзіі “Ручай крыштальны мовы роднай” (Забалоцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), інтэлектуальная гульня “Мова родная” (Драчкаўская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), Дзень роднай мовы “Мова мая – ты жывая крыніца”, конкурс знаўцаў беларускай мовы і літаратуры “Таямніцы беларускіх слоў” (Залужская сельская бібліяэка Стаўбцоўскага раёна), парад беларускіх пісьменнікаў “Мовы нашай вартавыя” (Каралёўская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), паэтычны флэшмоб “Дала мне маці гэту мову, як спадчыну і запавет” (Зенькавіцкая сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), паэтычны ланцужок “Мова – калыска мая…”, літаратурныя гонкі “Чытаем услых” (Нёманская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), гульня-крыжаванка “Любі, шануй і ведай роднае слова” (Азерская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), конкурс перакладчыкаў “Жывая спадчына” (Кухціцкая сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), гучныя чытанні “Роднаму слову – быць” (Камянкоўская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна).

Дзень беларускага пісьменства: гутарка “Не знікне цуд прыгожага пісьменства” (сельская бібліятэка-клуб № 8 в. Вялікая Ухалода Барысаўскага раёна), інфармацыйная гадзіна “Ад мінулага да сучаснага нас вядзе друкаванае слова” (сельская бібліятэка № 45 в. Стара-Барысаў Барысаўскага раёна), гадзіна гісторыі “Ад першадрукара Скарыны да сучаснай беларускай кнігі”

(Ільянская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), урок беларусазнаўства “Жыві, наша Слова!” (Вілейская раённая бібліятэка), свята “Дзень славянскай пісьменнасці і культуры” (Баравікоўская інтэграваная сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), інтэлектуальная віктарына “Ля вытокаў слова і кнігі” (Грычынская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), галерэя гістарычных асоб “Галасы з даўніх вякоў: Кірыла Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая, Сымон Будны” (Энергетыкаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), свята “Беларуская кніга: шляхам стагоддзяў” (ДУК “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”), Тыдзень беларускага пісьменства і друку (ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”), падарожжа ў гісторыю “Аз да буки – основа науки” (Коласаўская сельская бібліятэка Крупскага раёна), экскурс у гісторыю “Таямніцы выцвілых радкоў” (Ухвальская сельская бібліятэка Крупскага раёна), інфармацыйная гадзіна “Шлях да пісьменнасці”, прагляд літаратуры “Асветнікі беларускай зямлі”, віктарына “Ад Скарыны да нашых дзён” (Акцябрская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), гістарычны экскурс “Волаты слова народнага” (Сямкоўская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), свята “Духоўная кніга – крыніца вялікай мудрасці” (Завішынская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), гістарычная вандроўка “Адкуль да нас прыйшла кніга” (Каменская сельская бібліятэка Лайгоскага раёна), літаратурная арбіта “З кнігай праз стагоддзі” (Асавецкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), гутарка-разважанне “Давай ганарыцца, што мы беларусы” (Малагарадзяціцкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), дзень ведаў “Слова вылітае з бронзы” (Рачэнская сельская бібліятэка Любанскага раёна), літаратурны набат “Слова, што адкрыла свет” (Кузьміцкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), краязнаўчы ўрок “Ажываюць гісторыі старонкі” (Рэдкавіцкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), гадзіна краязнаўства “Светачы зямлі беларускай” (Вішнеўская інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна), Дзень беларускага пісьменства “Надрукаванае застаецца”, пазнавальны пазл “Гэты цудоўны свет кніг” (ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”), гістарычны віраж “Пісьменства – крыніца культуры і духоўнасці народа” (ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”), інфармацыйна-адукацыйную гадзіну “BOOK-дыліжанс. Падарожжа па краіне беларусаў”

(Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), літаратурная гадзіна “Мова нашага народа” (Рудзенская гарпасялковая бібліятэка Пухавіцкага раёна), віртуальнае падарожжа “Ля вытокаў пісьменства” (Пухавіцкая сельская бібліятэка), тыдзень беларускага пісьменства і друку “Каб стала вечным наша Слова!” (ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”), інфармацыйная гутарка “Пачынальнікі беларускага пісьменства” (Алесінская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), гадзіна пазнання “Веліч слова славянскага” (Забалоцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), тыдзень беларускага пісьменства і друку “Вечны голас роднага слова” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), віртуальнае падарожжа “Гісторыя беларускай кніжнасці” (Церабуцкая сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), храналагічны рэпартаж “На світанку кнігадрукавання”, гадзіна даследавання “Паслядоўнікі Скарыны” (Падарэская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), віртуальнае падарожжа “Белорусские первопечатники и просветители” (Залужская сельская бібліятэка-клуб Старадарожскага раёна), літаратурнае падарожжа “Адкуль да нас прыйшла кніга” (Горкаўская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), паэтычны лабірынт “Каб бацькоўская мова непаўторнаю кветкай цвіла” (Шапчыцкая сельская бібліятэка-клуб Старадарожскага раёна).

75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

У ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” быў праведзены Тыдзень мужнасці і памяці “Маладым ведаць – ветэранам памятаць”, які ўключаў акцыю гонару “Ветэраны – маякі памяці”, якую ўвянчала вечарына ажыўшых біяграфій “Лёсы, апаленыя вайной”. Ажылі маленькія хронікі лёсаў землякоў-ардэнаноснацаў Вялікай Айчыннай вайны, якія заплацілі даніну вайне сваімі лепшымі гадамі. Фатаграфіі часоў вайны былі прадстаўлены прэзентацыяй “Землякі – нашага жыцця маякі”.

Бібліятэкары ДУК “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” падрыхтавалі гісторыка-патрыятычную гадзіну “Подзвігу народа – жыць у вяках!”. Мерапрыемства суправаджала электронная прэзентацыя, з дапамогай якой прысутныя пазнаёміліся з гістарычнымі помнікамі, размешчанымі на тэрыторыі Валожынскага раёна.

У ДУК “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” быў прэзентаваны мультымедыйны расказ-рэквіем “Сёстры Хатыні”, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дню памяці трагедыі Хатыні. Удзельнікі сустрэчы пачулі і ўбачылі гісторыю знішчэння вёсак Дзяржыншчыны, якія раздзялілі лёс Хатыні: Глухое Пярхурава, Літавец, Любажанка, Садкаўшчына і Скірмантава, а таксама пазнаёміліся з гісторыяй стварэння мемарыяльнага комплексу “Літавец” – сімвала трагедыі і мужнасці, гісторыі малой радзімы.

Супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А. Астрэйкі праведзены героіка-патрыятычны час “Раўненне на Героя” – да 105-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, ураджэнца в. Доктаравічы А.Р. Таўпекі; урок памяці аб спаленых вёсках Капыльшчыны “Абпаленыя лёсы”.

Песачанская сельская бібліятэка Капыльскага раёна правяла краязнаўчую гадзіну “Вёска Пясочнае ў гады Вялікай Айчынай вайны”.

Тэме 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прысвечаны праведзеныя Бобрскай гарпасялковай бібліятэкай Крупскага раёна хвіліна мужнасці “Гісторыя вайны ў гісторыі маёй сям’і”, Крупскай сельскай бібліятэкай Крупскага раёна гадзіна памяці “Землякі: імёны і лёсы“, Дакудаўскай сельскай бібліятэкай-клубам Крупскага раёна гадзіна краязнаўства “Уклад нашых землякоў у вызваленне Беларусі”, Узнацкай сельскай бібліятэкай-клубам Крупскага раёна гадзіна краязнаўства “Лёсы, апалены вайной” .

Гістарычная гадзіна “Лагойшчына партызанская” адбылася ў Янушкавіцкай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна.

Краязнаўчы ўрок “Сталі героямі Лагойскай зямлі” бібліятэкар Завішынскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна прысвяціла Героям Савецкага Саюза – ураджэнцам Лагойшчыны.

Гадзіна гісторыі “Нашы землякі ў гісторыі вызвалення Беларусі” прайшла ў Акцябрскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна.

Краязнаўчая тэматыка нашла сваё адлюстраванне ў мерапрыемстваў прысвечаных 75-годдзю вызвалення Случчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: краязнаўчы маршрут “Легендарная улица имени маршала Жукова”, ганаровы літаратурны стэнд “Слава вызваліцелям Случчыны” (аддзел абслугоўвання

і інфармацыі чытачоў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі), патрыятычная хроніка “В боях за край слутчанский” (Гацукоўская сельская бібліятэка-філіял №12 Слуцкага раёна), аповед-хроніка ваенных гадоў “Нам жыць і помніць: Грэскае партыйна-камсамольскае падполле” (Грэская сельская бібліятэка-філіял №14 Слуцкага раёна), гадзіна гісторыі “Вогненыя гады на зямлі случчанскай” (Казловіцкая сельская бібліятэка-філіял №19 Слуцкага раёна), патрыятычная панарама “Нашы землякі – удзельнікі Слуцкага падполля” (Навадворцаўская сельская бібліятэка-філіял №30 Слуцкага раёна).

ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” быў праведзены ўрок краязнаўства “Іх імёнамі названы вуліцы г. Чэрвеня”.

Ва ўсіх бібліятэках Мінскай вобласці матэрыялы краязнаўчага характару накапліваюцца і сістэматычна папаўняюцца новымі звесткамі ў папках-дасье. Кнігі краязнаўчага характару, тэматычныя папкі і іншыя матэрыялы шырока прадстаўлены ў інфармацыйна-краязнаўчых кутках, на кніжных выставах і паліцах: “Родная зямліца – шчасця крыніца” (Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка), “Такая яна, зямля мая!”, “Люблю цябе, мая Радзіма!” (Людвіноўская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Зямля мая, край маляўнічы” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Куточак радзімы маёй” (Вязынская сельская бібліятэка Вілейскага раёна), “Наш край у мінулым” (Партызанская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Чурлёнскай зямлі адважныя сыны!” (Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Сэрца імкнецца да роднага краю”, “Навукоўцы зямлі валожынскай” (ДУК “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”), “Ад сучаснасці да мінулага” (Сугваздаўская бібліятэка-клуб Валожынскага раёна), “Валожыншчына – мой родны край”, “Родам з ракаўскага краю” (Ракаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Край мой – гонар мой” (Пяршайская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Слова аб родным краі” (Дорская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Веліч роднай зямлі” (Скірмантаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), “Вёска мая, я часцінка твая!” (Быстрыцкая сельская бібліятэка Капыльскага раёна), “Мой край беларускі, старонка мая!” (Браткаўская сельская бібліятэка-клуб Капыльскага раёна), “Люблю наш край, старонку гэту...” (Лясноўская сельская бібліятэка Капыльскага раёна),

“Таленты роднай зямлі” (Жаліхаўская сельская бібліятэка Капыльскага раёна), “Гісторыя шматгадовая і багатая” (Лагойская цэнтральная бібліятэка), “Люблю цябе, мой родны край” (Астрошыцкая сельская бібліятэка Лагойскага раёна), “Край мой, мае землякі” (Засоўеўская сельская бібліятэка-клуб Лагойскага раёна), “Край мой – зямля Лагойская” (Завішынская сельская бібліятэка), “Мой родны, непаўторны край” (Акцябрская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), “Жыву і дыхаю, мой родны край табою” (Обчынская сельская бібліятэка Любанскага раёна), “Знакамітыя землякі Любаншчыны” (Забалацкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), “Краем сваім ганарымся “, “Карані рода твайго”, “Дом там, где твоё сердце” (ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Тут Радзіма мая, тут жыву я”, “Зямля пад белымі крыламі” (Лескаўская сельская бібліятэка Мінскага раёна), “Зямля бацькоў – зямля святая" (Занарацкая сельская бібліятэка Мядзельскага раёна), “Зямля, што нам дадзеная лёсам” (Сваткаўская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна), “Людзьмі і памяццю жыве мой край”, “О, край мой родны, край прыгожы”, “Датуль завёмся мы народам, пакуль шануем карані”, “Былое і сучаснае Пухавіцкай зямлі”, “Беларусь – навекі маладая, ганарлівая адвагай даўніны”, “Пухавіччына – цудоўная старонка. Квітней, красуй пад дабрачынным небам” (Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), “Всему начало здесь – в краю родном” (Драчкаўская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), “Зямля, дзе ўтульна сэрцу” (Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча), “Зямля бацькоў” (Пятровіцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), “У тым краі, дзе ты жывеш”, “З малой радзімы пачынаецца краіна”, “Край мой – Старадарожчына” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Мой родны кут – мой клопат і мой лёс (Любкаўшчынская сельская бібліятэка Стаўбцоўскага раёна), “Ёсць на зямлі такі куток, мая радзіма Чэрвеньшчына” (ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”).

У справаздачным годзе шэраг сельскіх бібліятэк вобласці прынялі ўдзел у арганізацыі і правядзенні традыцыйных свят вёсак, забяспечваючы пошукавую і інфармацыйную частку мерапрыемства: свята вёсак Бакунькі, Кумельшчына “Песні, што кранаюць сэрца” (Сцешыцкая сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), свята вёскі Баранцы “Поклон селу и людям, в нём живущим” (Шылавіцкая сельская бібліятэка Вілейскага раёна), свята вёскі

Каралеўцы “Няма ў свеце месца прыгажэй”, святы вёскі Слабада “Мілы куточак радзімага краю”, свята аграгарадка Іжа “І роднай вёсцы пакланюся” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), свята вёскі Кляноўка “Новае жыццё на графскіх руінах” (Станькаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), свята вёсак Цюхаі і Дзянісаўшчына (Скірмантаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), свята вёскі Вароніна “Мая вёска – гонар мой” (Грыцэвіцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Заляшаны “Пусть радость приходит в каждый дом”, свята вёскі Жомайдзь “Деревенька моя, деревенька родная” (Кухчыцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Бабкі “И нет на свете милее края” (Галынкаўская сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Цецеравец “Старонка родная мая” (Лазавіцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята пасёлка Рассвет “Тут жыве майго сэрца часцінка…” (Рассветаўская сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Кукавічы (Вялікараёўская сельская бібліятэка-клуб Капыльскага раёна), свята вёскі Пясочнае (Песачанская сельская бібліятэка Капыльскага раёна), свята вёскі Янушкавічы “Жыве мая вёска” (Янушкавіцкая сельская бібліятэка Лагойскага раёна), свята вёскі “Вёсачка мая – мая чараўніца” (Вялікасліўская бібліятэка-клуб/філіял №11 Слуцкага раёна), свята вёскі “Мой родны кут, як ты мне мілы” (Церабуцкая сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), “Квітней мая вёска” (Горкаўская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), свята вёскі Іванаў Бор “Сэрцу мілая старонка, вёсачка любая мая” (Камянкоўская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), свята вескі Карпілаўка “Я тут жыву, і край мне гэты мілы” (Кліноцкая бібліятэка-клуб Чэрвеньскага раёна).

Для захавання і папулярызацыі культурнай і гістарычнай спадчыны роднага краю пры бібліятэках вобласці працягваюць дзейнічаць краязнаўчыя клубы, гурткі і аб’яднанні: “Землякі” (Багушэвіцкая сельская інтэграваная бібліятэка Бярэзінскага раёна), “Зямля пад белымі крыламі” (Івянецкая гарпасялковая бібліятэка Валожынскага раёна), “Сузор’е” (Ракаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Спадчына” (Дорская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Выток”, “Койданаўскія летапісцы” (ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”), “Вытокі” (Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я.Купалы), “Каласавічок” (Коранская сельская бібліятэка Лагойскага раёна),

“Купалінка” (Завішынская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), “Рунь” (Лагойская цэнтральная раённая бібліятэка), “Сябрына” (Плешчаніцкая гарпасялковая бібліятэка Лагойскага раёна), “Спадчына” (сельская бібліятэка аг. Краснае Маладзечанскага раёна), “Натхненне” (сельская бібліятэка аг. Лебедзева Маладзечанскага раёна), “Нашчадкі” (Навасельская сельская бібліятэка Мінскага раёна), “Крыніца” (Заслаўская дзіцячая бібліятэка Мінскага раёна), “Спадчына” (Круціцкая інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна), “Крыніца”, “Арэскія вытокі” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Краязнаўца” (ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”), “Нёманец” (ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”), “Спадчына” (Лашанская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), “Радзімічы” (Кухціцкая сельская бібліятэка Уздзенскага раёна).

У справаздачным годзе бібліятэкі вобласці працягвалі папаўняць свае бібліяграфічныя БД “Краязнаўства” электроннага каталога. На канец года агульная колькасць краязнаўчых запісаў складае: у ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” – 4827, ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” – 24335, ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка” – 5358, Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка — 2895, ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” – 5210, ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса” – 5502 і інш.

Працягваўся збор матэрыялаў для папаўнення мясцовых баз і банкаў дадзеных уласнай генерацыі: “Память Борисовщины”, “Слово краеведа”, “Вяртанне да вытокаў” (ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева”), “Жодиноведение” (ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”), “Капыльшчына” (ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”), “Пісьменнікі роднага краю”, “Прыродныя рэсурсы Клецкага раёна”, “Народныя традыцыі і абрады” (ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”), “Памяць Мядзельшчыны”,“М. Танк” (ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”), “Памятнымі мясцінамі Салігоршчыны”, “Солигорщина: вчера и сегодня” (ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Памяць Старадарожчыны” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Майстры

роднага краю” (Старадарожская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна).

У канцы справаздачнага года ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” была распачата работа над стварэннем БД “Таленты ад роднай зямлі: знакамітыя навукоўцы”.

Да 75-годдзя вызвалення г. Жодзіна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” сфарміравана электронная база дадзеных “Подпольное и партизанское движение в Жодино и Смолевичском районе”.

У 2019 годзе Вялікараёўская бібліятэка-клуб Капыльскага раёна стала працаваць па папаўненні электроннай базы дадзеных “Памяць Вялікай Раёўкі”.

ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” падрыхтавала электронныя базы дадзеных “Любаншчына літаратурная” і “Навукоўцы любанскай зямлі”.

ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” праведзена работа па напаўненні бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі матэрыяламі БД “Краязнаўства”, у т. л. “Максім Багдановіч у Ракуцёўшчыне”,“Вязынка – калыска Купалы”.

Электронная краязнаўчая фактаграфічная картатэка “Памяць Міншчыны. Персаналіі. Пухавіцкі раён” Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ўключае ў сябе 195 персаналій і 722 бібліяграфічных запісаў.

Бібліятэкарамі Лучнікоўскай сельскай бібліятэкі-філіяла №7 Слуцкага раёна прадоўжана праца па папаўненні поўнатэкставых баз дадзеных “Лучнікоўскі летапіс” і “Случчанская хроніка”.

Дзіцячым аддзелам Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі фарміруецца краязнаўчая поўнатэкставая база дадзеных “Горад дзевяці стагоддзяў”.

У 2019 годзе ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” былі падрыхтаваны віртуальныя выставы з размяшчэннем іх на сайце бібліятэкі: “Беларускі гістарычны кнігазбор”, “Жыцця загадкавы палёт. Да 70 годдзя з дня нараджэння Я. Янішчыц”, “Беларусь советская: 100 лет основания БССР”, “Жураўлі ляцяць... да 90-годдзя Алеся Ставера”, “Аляксандр Быкаў. Да 65-годдзя з дня нараджэння”.

ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” створаны 9 электронных прэзентацый з цыклу “ЖЗЛ горада Жодзіна”: “Жодзіна мастацкі” (М. М. Анруковіч, У. В. Гладкевіч); “Жодзіна

спартыўны” (М. І. Астапковіч, М. З. Элімелах, У. І. Тайнікаў); “Жодзіна музычны” (С. Э. Ждановіч); “Жодзіна навуковы” (І. М. Нікітчанка, А. І. Лаппо, А. А. Гайко).

Урэцкая гарпасялковая бібліятэка-філіял №1 Любанскага раёна падрыхтавала віртуальную выставу-агляд “Мой край, маё Урэчча”.

ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” распрацаваны банк дадзеных “Мой край родной, моя история живая”, у якім сабраны краязнаўчы матэрыял аб Мінскім раёне (гісторыя, сучаснасць, культура, адукацыя, прамысловасць і інш.).

У справаздачным годзе супрацоўнікамі ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка” падрыхтавана мультымедыйная прэзентацая “Салдаты Перамогі, ветэраны вайны – ураджэнцы і жыхары Мядзельшчыны”.

ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы” была створана мультымедыйная прэзентацыя, прысвечаная паэту-земляку С. Новіку-Пяюну пад назвай “Пясняр зямлі Нясвіжскай”.

На працягу года онлайн карыстальнікі ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” маглі пазнаёміцца з віртуальнымі выставамі: “Трагедия войны в памяти народной” (да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў), “Честь. Долг. Дерзость” (да 120-годдзя з дня нараджэння В. З. Каржа), “Солигорский район – жемчужина Полесья” (да 95-годдзя з дня заснавання Салігорскага раёна), “Вярнуся ветрам…” (да 110-годдзя з дня нараджэння М. Лужаніна).

У справаздачным годзе ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” падрыхтавала і выдала гісторыка-краязнаўчае выданне “Они проливали свою кровь и стояли насмерть за Родину”, навукова-папулярнае выданне ветэрана фізкультуры і спорту раёна Трусевіча Б.І. “Гісторыя фізкультуры і спорту Бярэзінскага раёна”, краязнаўчае выданне да 100-годдзя КПБ “Вместе с народом и в будни, и в праздники: коммунистическая партия Беларуси на Березинщине”, паэтычны зборнік Л. Ждамавай “Ранішняя раса”, “Каляндар знамянальных і памятных дат Бярэзіншчыны на 2020 год”.

У ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” у рамках праекта “Чытаем кнігі мясцовых аўтараў” выдадзены наступныя зборнікі твораў мясцовых аўтараў: К. І. Дубовік “Фальварак Багданава – тут жыве сама гісторыя”, Б. А. Мякчыла “З крыніц роднай зямлі: зборнік вершаў”, “Жыццё. Лёс. Памяць: да

105-годдзя з дня нараджэння Ганны Новік”, С. П. Мароз “Вяртанне да сябе”.

ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” быў састаўлены і выпушчаны бібліяграфічны паказальнік “Літаратура аб Валожынскім раёне за 2018 год”.

ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” падрыхтаваны і выдадзены тэматычны зборнік удзельнікаў літаратурнага клуба “Вытокˮ “В каждой строке голос памяти”, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У выдавецтве “Четыре четверти” выдадзена другая частка кнігі “Солдаты Победы”.

Распрацаваны і выдадзены шэраг метадычных матэрыялаў і рэкамендацый, прысвечаных вядомым асобам Дзяржыншчыны: “Вандроўнік па краіне Беларусь. Міхась Раманюк: метадычныя рэкамендацыі да 75-годдзя беларускага мастацтвазнаўцы і этнографа Міхася Раманюка”; “Гвардейский подвиг Николая Шарко: методические материалы к 95-летию со дня рождения Героя Советского Союза Н. Ф. Шарко”; “Жизнь и судьба Марата: методические материалы к 90-летию со дня рождения Героя Советского Союза М. И. Казея”; “Слово звало в бой: методические материалы к 105-летию Павла Никитича Хмелевского, одного из организаторов и руководителей Дзержинского патриотического подполья, комиссара партизанского отряда “Большевик”; “Неспокойное сердце Янины Бандак: материалы к 110-летию со дня рождения Героя Социалистического труда Янины Викентьевны Бандак” і г. д.

Распрацаваны і выдадзены шэраг інфармацыйных буклетаў, прысвечаных людзям навукі і мастацтва Дзяржыншчыны; матэрыялаў даследаванняў, закладак, лістовак, памятак, буклетаў і г. д.

За справаздачны год ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка ім. Я. Купалы” выдадзены буклеты: “У сімвалах нашы карані”(аб сімвалах Крупскага раёна); “Легенды і паданні Крупшчыны”; “Бібліятэкі Крупшчыны. Гісторыя і сучаснасць” (матэрыялы агляду-конкурсу на лепшы летапіс бібліятэкі); дапоўнены буклет “Цуды Крупшчыны”.

Працягвалася праца над стварэннем буклетаў з серыі “Знакамітыя людзі Крупшчыны”: “Руплівы сейбіт на ніве філалогіі”

(да 65-годдзя з дня нараджэння мовазнаўцы, літаратуразнаўцы Старычонка В. Д.)

З серыі “Знакамітыя землякі-героі вайны” выдадзены буклеты: “Не зарастае памяць забыццём”(да 95-годдзя з дня нараджэння Лукашэвіча А. С.); “Па слядам вялікай мужнасці” (прысвечаны герою вайны Лютаму А. С.); “Хай золатам ззяюць імёны герояў”(прысвечаны Лыціну А. С.); “Пусть помнят живые, пусть знают потомки” (прысвечаны герою Сурыну М. А.) і “Мужнасці і стойкасці – вечнае слава” (да 75-годдзя з часу здзяйснення подзвігу І. А. Мазгавым) і інш.

Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкай падрыхтаваны і выдадзены інфармацыйныя выданні: “Пашпарт Лагойскага раёна”, “Лагойшчына-2020: краязнаўчы каляндар”, “Каляндар знамянальных і памятных дат на 2020 год”, буклеты: з серыі “Землякі-юбіляры” – “Тышкевич Евстафий: к 195-летию со дня рождения”; з серыі “Пісьменнікі юбіляры” – “Абрысы лёсу: да 60-годдзя з дня нараджэння У. Мазго”, “Кругі надзеі і дабра: да 100-годдзя з дня нараджэння А. Асіпенкі”, “Люблю будзённы дзень: да 100-годдзя з дня нараджэння А. Дзеружынскага”, “ Паміж нябесным і зямным: да 70-годдзя з дня нараджэння Г. А. Каржанеўскай”,“Са шчырым пачуццём: да 90-годдзя з дня нараджэння Е. Лось”, “Святло зямных дарог: да 65-годдзя з дня нараджэння М. Мятліцкага”, “Творца ў часе і прасторы: да 75-годдзя з дня нараджэння З. Прыгодзіча”, “Я – акіяна жытняга калоссе: да 105-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова”, “Я беларускаму слову малюся: да 80-годдзя з дня нараджэння У. Скарынкіна”.

У ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” штоквартальна выдаваўся анатаваны спіс “Любаншчына на старонках рэспубліканскага друку”. Падрыхтаваны зборнікі вершаў “Любіць родны край” і “Натхненне малой радзімы” самабытнага паэта А. Вялічка.

ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” падрыхтавала рэкамендацыйны паказальнік “95 – год з дня нараджэння Хведара Бачылы, камандзіра дыверсійнай групы Мінскага раёна”, інфармацыйныя бюлетэні “Аннополь на берегу реки”, “Заславль – древний город Беларуси”, “Игнатичи – старинная усадьба”, “Линия Сталина”, “Я эту землю Родиной зову. Михановичи”, “Новое Поле. Усадебно-парковый ансамбль”, “Спасо-Преображенская церковь”,

“Дворец в Прилуках”, “История усадьбы в Сёмково”, “Лагерь смерти – Тростенец”.

ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” падрыхтаваны і выдадзены матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі да 85-годдзя А. Ліса, пісьменніка, фальклярыста, доктара філалагічных навук “Песня ў спадчыну”, краязнаўчы даведнік “Славутыя людзі Маладзечаншчыны” і інш.

Да юбілея народнага мастака Беларусі Васіля Пятровіча Шаранговіча, ураджэнца Мядзельшчыны ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка” выдадзены буклет “З народу, з народам, народны…”.

ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы” былі падрыхтавана брашура “Нясвіж – горад з гісторыяй”.

ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” падрыхтаваны рэкамендацыйныя спісы літаратуры, прысвечаныя ўстановам і арганізацыям Салігорска і Салігорскага раёна: “ОАО “Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции”, “Хоккейный клуб “Шахтер”, “Волейбольный клуб “Шахтер”, “Футбольный клуб “Шахтер”.

У ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” былі падрыхтаваны інфармацыйна-бібліяграфічныя краязнаўчыя выданні: “Витольд Цераский – известный ученый-астроном и педагог: к 170-летию со дня рождения”, “Нясцерпны боль на ўсё жыццё: з гісторыі Слуцкага канцлагера”, “Слуцкі пояс – нацыянальная рэліквія Беларусі”.

ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” выдала паказальнік літаратуры да 200-годдзя ўраджэнца Чэрвеньскага раёна, знакамітага кампазітара Станіслава Манюшкі “Славутая зямля славутых продкаў”.

## Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду

Бібліятэчны фонд – упарадкаваная сукупнасць дакументаў, якія адпавядаюць задачам і профілю бібліятэкі і прызначаны для выкарыстання і захоўвання.

Фонд публічных бібліятэк Мінскай вобласці на 01.01.2021 складае 5 845 603 экз. дакументаў. За 2020 год ён паменшыўся на 108 393 экз.

У 2020 г. значная ўвага надавалася даручэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па накіраванні на камплектаванне фондаў бібліятэк не менш 12% грашовых сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне дадзеных устаноў. Так з бюджэту вобласці на камплектаванне бібліятэчных фондаў і набыццё правоў доступу да электронных інфармацыйных рэсурсаў выкарыстана 1,9 млн. рублеў (+ 0,1 млн. руб. да вынікаў 2019 г.), што складае 12,8% (-0,5 % да вынікаў 2019г.) ад бягучага фінансавання бібліятэк. Даручэнне выканана ва ўсіх сетках публічных бібліятэк.

Пры гэтым (у сярэднім па вобласці) 63,0% ад сукупнага аб'ёму фінансавання было накіравана на аплату падпіскі на перыядычныя выданні. Прытрымліваюцца рэкамендацый Міністэрства культуры аб накіраванні на падпіску не болей 60 % грашовых сродкаў, якія выкарыстоўваюцца на камплектаванне фондаў, сеткі публічных бібліятэк Барысаўскага, Бярэзінскага, Валожынскага, Любанскага, Мінскага, Пухавіцкага, Слуцкага, Чэрвеньскага раёна і г. Жодзіна. У той жа час у некаторых сетках публічных бібліятэк аплата падпіскі перавышае 95,8% ад агульнага памеру фінансавання. Рэпертуар перыядычных выданняў які атрымліваюць бібліятэкі вобласці, ў сярэднім складае 93 назвы часопісаў і 25 назваў газет.

З мясцовага бюджэту на набыццё кніг і другіх дакументаў (за выключэннем перыёдыкі) было выкарыстана 665,7 тыс. рублей (+43,1 тыс. рублей да вынікаў 2019г.). Сеткі публічных бібліятэк г. Жодзіна, Барысаўскага, Бярэзінскага, Валожынскага, Любанскага, Мінскага, Пухавіцкага, Слуцкага, Уздзенскага, Чэрвеньскага раёнаў атрымалі на куплю кніг і другіх дакументаў ад 56,9% да 40,3% ад агульнага аб'ёму бюджэтнага фінансавання накіраванага на камплектованне бібліятэчных фондаў. Сеткам публічных бібліятэк Салігорскага, Капыльскага, Вілейскага, Клецкага, Мядзельскага і Дзяржынскага раёнаў было выдзелена ад 39,0% да 32,2%; публічныя бібліятэкі Маладзечанскага, Крупскага, Старадарожскага, Смалявічскага і Нясвіжскага раёнаў асвоілі ад 26,4% да 13,1%. Толькі ў сетцы публічных бібліятэках Стаўбцоўскага і Лагойскага раёна на набыцце кніг за кошт мясцовага бюджэту было выдзелена 3,6% ад агульнага фінансавання накіраванага на папаўненне фонду. Так у выніку за кошт мясцовага бюджэту было набыта 69 969 экз. кніг(+ 2 066 экз. да вынікаў 2019 г.), у тым ліку 19 411 экз. сацыяльна значных выданняў.

Штогод бібліятэкі вобласці выкарыстоўваюць розныя крыніцы камплектавання. Так, дзякуючы падарункам карыстальнікаў і юрыдычных асоб, фонды бібліятэк папоўніліся на 21 495 экз. кніг на агульную суму 85,4 тыс. рублей. За кошт рэспубліканскага бюджэту фонды бібліятэк папоўніліся на 1 949 экз. дакументаў на суму 76,1 тыс. рублёў.

У выніку за 2020 г. праз розныя крыніцы камплектавання ў фонды публічных бібліятэк вобласці паступіла 228,6 экз. дакументаў. Большая частка новых паступленняў застаецца ў цэнтральных бібліятэках.

Ва ўсіх сетках публічных бібліятэк вобласці ў сярэднім адзін сельскі філіял (без уліку бібліятэк аграгарадкоў) атрымліваў каля 117 экз. кніг (у 2019 г.– 97 экз.). У той жа час адзін сельскі філіял сеткі публічных бібліятэк Дзяржынскага раёна ў сярэднім атрымаў 207 экз. кніг, а Стаўбцоўскага раёна – 29 экз. кніг. Рэпертуар перыядычных выданняў па вобласці ў сярэднім складае 14 назваў часопісаў і 6 назваў газет.

Па ранейшаму значная ўвага надавалася камплектаванню бібліятэк аграгарадкоў. У сярэднім адна бібліятэка аграгарадка атрымала каля 137 экз. кніг (у 2019 г. – 135 экз.), 16 назваў часопісаў і 7 назваў газет.

Неабходнай умовай для аптымізацыі якасці бібліятэчных фондаў з'яўляецца своечасовае выяўленне і выключэнне састарэлых па змесце, зношаных і дублетных дакументаў. За 2020 г. з фонду публічных бібліятэк вобласці выключана 337,0 тыс. экз. дакументаў, у тым ліку кніг – 167,9 тыс. экз., перыядычных выданняў – 167,0 тыс. экз., іншых дакументаў – 2,1 тыс. экз. Дакументы выключаліся па наступных прычынах: зношаныя – 42,9%, састарэлыя па змесце – 2,5 %, дублетныя, страчаныя і іншыя прычыны – 5,0%, па прычыне заканчэння тэрміну захоўвання – 49,6%.

Пытанні стану і выкарыстання фондаў абмяркоўваюцца на нарадах пры дырэктары, работа з фондам адлюстроўваецца ў планах работы і справаздачах бібліятэк.

## Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ажыццяўляецца на аснове даведачна-бібліяграфічнага фонду, традыцыйнага даведачна-бібліяграфічнага апарата, а таксама электронных рэсурсаў.

На працягу года бібліятэкі вобласці працягвалі працу па выкананні бібліяграфічных даведак. У 2020 годдзе ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева” было выканана 2057 даведак, ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” – 1022 даведкі, ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” – 1021, ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса” – 103 даведкі, ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка” – 518 даведак, ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” – 6982 бібліяграфічныя даведкі. Найбольш цікавыя сярод іх: “Творческие реализации в изготовлении ювелирных изделий”, “Эверэст ці Джамалунгма? Самая высокая вяршыня”, “Черепаха красноухая”, “Великие князья ВКЛ”, “Драгоценные камни на Беларуси: месторождение и свойства” і інш.

Бібліятэкі вобласці праводзяць актыўную работу па ўдасканаленні сістэмы каталогаў і картатэк. У мінулым годзе СКА былі дапоўнены новымі тэматычнымі рубрыкамі. Для зручнасці і аператыўнасці выканання тэматычных запытаў чытачоў, а таксама ў сувязі са знамянальнымі датамі ў грамадскім і палітычным жыцці рэспублікі у сістэматычнай картатэцы газетных і часопісных артыкулаў уведзены новыя прадметныя рубрыкі, такія як: “Правы непаўналетніх”, “Новае ў пенсійным заканадаўстве”, “Жыллё для маладых сямей”. (ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”), “75 год вялікай Перамогі”, “COVID-19”, “ВЫБАРЫ-2020” (ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”), “75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне”, “550-годдзе з’яўлення цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці”, “100 год БРСМ” (ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы”), “Табе, абітурыент”, “Руплівай гаспадыні”, “Народны доктар”, “Кветкі для Вас”, “Азбука здароўя і прыгажосці”, “Словы аб роднай прыродзе”, “Пра што спявае ганчарны круг”, “COVID-19”, “Беларусь выбірае” (ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”), “2020 – Год малой радзімы”, “Выбары – 2020”, “75-годдзе Перамогі” (ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”), “Прэзідэнцкія выбары”; “Інтэграцыя” (ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”), “Да 75-годдзя Вялікай Перамогі”, “Выбары – 2020”, ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка”), “2020 – Год малой радімы” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная

бібліятэка”), “75 Вялікай Перамогі”, “Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь”, “500-годдзе заснавання Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра” (ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”).

Бібліятэкі фарміруюць даведачана-бібліяграфічны апарат праз папаўненне электроннага каталога артыкулаў аналітычнымі бібліяграфічнымі запісамі.

БД “Аналітыка” ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” папоўнілася на 140 адзінак і сёння ўтрымлівае 6716 запісаў. БД “Аналітыка” Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х.Каладзеева папоўнілася на 413 запісаў, а БД «Консорциум” на 5439 запісы. Бібліяграфічная БД “Сістэматычная картатэка артыкулаў” ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка” налічвае 4784 запісы, за мінулы год было уведзена 712 запісаў. База даных “Артыкулы” электроннага каталога ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” папоўнілася 4247 запісамі і на 01.01.2021 года склала 51409 запісаў. БД “Аналітыка” Лучнікоўскай сельскай бібліятэкі-філіяла № 7 Слуцкага раёна папоўнілася на 200 і сёння налічвае 49160 запісаў. Электронная прадбаза “Аналітыка” ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса” папоунілася на 826 і на канец 2020 года налічвала адпаведна 9745 запісаў. ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” працягвала папаўненне электроннай базы дадзеных “ALIS-Аналітыка” новымі бібліяграфічнымі запісамі. За мінулы год уведзена 154 запісы. БД “Аналітыка”. ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы” папоўнілася на 562 бібліяграфічныя запісы.

Ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці працуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ), якія ўяўляюць сабой пункты свабоднага доступу грамадзян да афіцыйнай прававой інфармацыі. Усе цэнтральныя бібліятэкі прадастаўляюць карыстальнікам доступ да прававой БД “Эталон”, якая з’яўляецца дзяржаўным інфармацыйна-прававым рэсурсам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

На пачатак 2021 г. у Мінскай вобласці дзейнічае 96 публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ), у тым ліку на базе абласной бібліятэкі (1), раённых і гарадскіх бібліятэк (32), гарпасялковых і сельскіх бібліятэк – 63.

Агульны фонд ПЦПІ складае 43 035 экзэмпляраў, у тым ліку 22 125 кніжных і 19 458 перыядычных выданняў. На працягу 2020 года ў цэнтры ПЦПІ звярнуліся 4 880 карыстальнікаў а колькасць наведванняў склала

14 244. Па іх запытах выканана 8 786 даведак, выдадзена 39 409 дакументаў прававой тэматыкі. У рамках ПЦПІ праведзена 551 мерапрыемства.

У 2020 года ў рамках супрацоўніцтва з натарыяльнай канторай Барысаўскага раёна і Юрыдычнай кансультацыяй г. Барысава на базе ПЦПІ Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева для карыстальнікаў бібліятэкі было праведзена 41 кансультацыя натарыусаў і адвакатаў на бясплатнай аснове.

Актыўна супрацоўнічае з калегіямі адвакатаў і прадстаўнікамі праваахоўных органаў ДУК "Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік". Гэтаму спрыяе і дамоўленасць паміж Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі і Беларускай натарыяльнай палатай па арганізацыі і правядзенню на базе ПЦПІ кожны першы і трэці чацвер месяца на бязвыплатнай аснове кансультацый, семінараў і іншых мерапрыемстваў па прававой адукацыі насельніцтва, якія праводзяць супрацоўнікі натарыяльнай канторы. Усяго работнікамі натарыяльнай канторы непасрэдна ў ПЦПІ праведзена 7 кансультацый па наступных пытаннях: "Аўтарскае права: як яго абараніць", "Падлік працоўнага стажу пры выхадзе на пенсію", "Сацыяльная рэнта: як правільна аформіць", "Ремесленничество и предпринимательство: плюсы и минусы", "Государственное арендное жилье: кто имеет право и что для этого нужно", "Выплаты при заболевании COVID-19: кому и сколько положено", "Самоизоляция и сохранение зарплаты". Фарміраванню юрыдычных ведаў і прававой культуры насельніцтва садзейнічалі наступныя мерапрыемствы, арганізаваныя цэнтрам ПЦПІ аддзела абслугоўвання і інфармацыі: гутарка-дыялог "Па лабірынтах права", кніжная выстава да Дня Канстытуцыі РБ "Закон для ўсіх і кожнага", выстава-вернісаж "Дзяржаўная сімволіка Беларусі і гісторыя яе развіцця, урок прававых ведаў "Бібліятэка і правы асобы", прававая гадзіна "Эталон – проводник в мире правовой информации".

У рамках дзейнасці ПЦПІ ў ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" ў трэці чацвер кожнага месяца праводзіліся індывідуальныя кансультацыі спецыялістаў

Натарыяльнай канторы Дзяржынскага раёна. Большасць зваротаў да натарыуса было звязана з пытаннямі афармлення спадчыны, падзелу маёмасці, права ўласнасці і т.п.

Праводзіліліся прыёмы натарыусамі і бясплатныя прыёмы адвакатамі сацыльна-неабароненных катэгорый насельніцтва ў рамках дзйнасці ПЦПІ ДУК "Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка".

Бібліятэкі Міншчыны праводзяць працу па абслугоўванні абанентаў калектыўнага і індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання. Бібліяграфічнай службай ДУК "Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка" састаўлены інфармацыйна-бібліяграфічныя спісы літаратуры для педагогаў школ горада па тэмах: "Пазашкольная выхаваўчая работа", "Сцэнарныя матэрыялы па прапагадзе здаровага ладу жыцця сярод школьнікаў", "Непакораная Беларусь" да 75-годдзя Вялікай Перамогі. Настаўнікам вясковых школ былі адрасаваны Дні інфармацыі "Класнаму кіраўніку на заметку", "Педагагічная капілка", "Навінкі сучаснай беларускай прозы ". Індывідуальным інфармаваннем была забяспечана 5 абанентаў па тэмах: "Здаровы лад жыцця", "Бяспека жыццядзейнасці, краязнаўства і гісторыя краю", "Пчалярства, інавацыйныя метады работы ў школе".

На індывідуальным інфармаванні ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" састаяла 34 абаненты, якія былі праінфармаваны аб 1003 выданнях markedрознай тэматыкі: "Працоўнае заканадаўства", "Народная культура Беларусі", "Сацыяльныя аспекты рыначнай эканомікі", "Сацыяльная работа ў школе", "Музеі. Музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь" і інш. Групавой інфармацыяй было забяспечана 33 абаненты. Ім рэкамендавана 528 выданняў па тэмах: "Выхаваўчая сістэма сучаснай сельскай школы", "Развіццё сельскай гаспадаркі на сучасным этапе", "Дзейнасць органаў мясцовай улады на сучасным этапе", "Сучасная сістэма дашкольнага выхавання" і інш.

ДУК "Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна" праводзіла інфармаванне па тэмах: "Новыя імёны ў мастацкай літаратуры і літаратурна-мастацкіх часопісах", "Літаратура па здаровым ладзе жыцця", "Астраномія, фізіка: сучасны стан, перспектывы, абмен вопытам", "Пенсіённае заканадаўства", "Кадравая праца", "Літаратура праваслаўнага зместу", "Літаратура па грамадзянскім,

зямельным праве. База ЭТАЛОН”. Індывідуальныя абаненты былі праінфармаваны 72 разы, ім выдадзены 191 дакумент.

Бібліятэкі Клецкага раёна ў 2020 годзе абслужылі 33 калектывы па 33 тэмах, ім даслана 130 інфармацый. Калектыўную інфармацыю атрымлівалі жывёлагадоўчыя комплексы, малочна-таварныя фермы, рамонтныя майстэрні, дзіцячыя сады, сельскія Саветы, ФАПы, школы і інш. Індывідуальную інфармацыю па розных пытаннях прафесійнай дзейнасці атрымлівалі 56 абанентаў, якія інфармуюцца па 56 тэмах. Ім паслана 625 інфармацый аб новых паступленнях літаратуры.

Абаненты індывідуальнага інфармавання ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі” атрымлівалі інфармацыю па тэмах: “Навінкі краязнаўства”, “Музейная справа”, “Паўнамоцтвы прафесійных саюзаў”, “Развіццё культуры Беларусі: традыцыйнае і сучаснае, “Інавацыйныя формы работы ў дашкольным выхаванні”, “Капыльшчына: яе мінулае, сучаснае і будучае”, “Камп’ютары, камплектуючыя і іншае апаратнае забеспячэнне, “МНС Рэспублікі Беларусь: учора, сёння , заўтра. Новае ў заканадаўстве”, “Пчалярства: развядзенне і догляд. Хатняя гаспадарка”. Абанентамі групавога інфармавання былі калектывы школ, дзіцячых садоў, аддзела адукацыі, спорту і турызму, раённага тэрытарыяльнага медыцынскага аб’яднання, Спаса-Узнясенская царквы г. Капыля.

Паслугамі індывідуальнага інфармавання ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы” карысталіся 5 абанентаў, ім прадастаўлены 23 спісы літаратуры. Калектыўную інфармацыю атрымлівалі сельскія Саветы, школы, дзіцячыя сады, дома культуры.

Для інфармавання чытачоў аб новай літаратуры ў дапамогу прафесійнаму чытанню, ДУК “Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка” ажыццяўлялася групавое інфармаванне 38 калектываў па тэмах: “Воспитательный процесс: теория и практика”, “Физическое воспитание и здоровье школьников”, “Медыцына на службе здароўя”, “Новая літаратура ў дапамогу выхаванню дашкольнікаў”, “Новая літаратура ў дапамогу вучэбнаму працэсу ў школе і самаадукацыі настаўнікаў”, “Тэхналагічная бяспека птушкафабрыкі. Кацельныя ўстаноўкі і абсталяванне памяшканняў. “Обучение. Воспитание. Развлечения”, “Краски и ноты”, “Радуга идей”, “Праздники, сценарии, затеи”, “У дапамогу пазакласнаму

чытанню”, “У свеце дзіцячай літаратуры”, “Будьте здоровы”, “Новое в сельском хозяйстве”, “Будзе вольны час – пачытай ты нас”, “Крытыка і літаратуразнаўства”, “На ахове вашых праў”, “На ўсе выпадкі жыцця”, “Скарбонка дачніка” і інш. Было складзена 93 інфармацыйныя спісы. Індывідуальную інфармацыю атрымлівалі 76 абанентаў па тэмах: “У дапамогу вывучэнню беларускай літаратуры”, “Дидактические игры”, “Необычные изобретения”, “Чудеса природы”, “Рукоделие”, “Сам сабе псіхатэрапеўт”, “Методыка і вопыт навучання прадмету: гісторыя”, “Лекі без аптэкі: дыябет”, “Кветкі ў інтэр’еры”, “Магія творчасці”, “Зялёны дызайн”, “Любознайке на заметку”, “Рассказы деда Природоведа” і інш. Усяго было складзена 212 інфармацыйных спісаў.

ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” праводзіла індывідуальнае інфармаванне для 77 абанентаў па тэмах: “Домашняя физиотерапия”, “COVID-19: зберажы сябе сам”, “Абрадавая дзейнасць і фальклор Любаншчыны”, “Дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Прыёмныя і патранажныя сем’і”, “Свет веры, свет духоўнасці”, “Старасць – у радасць!”, “Уречье на страницах газет”, “Стройная постаць”, “Беларускі вінаград”, “Рукоделье не безделье” і інш. Групавое інфармаванне вялося для 68 абанентаў, сярод якіх: тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, школа рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладной творчасці, цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, дзіцячая школа мастацтваў, Цэнтр дзіцячай творчасці, установы аховы здароўя, дамы культуры, калектывы навучальных устаноў раёна, а таксама калектывы мастацкай самадзейнасці, фальклорныя ансамблі, гурткі, аматарскія клубы і аб’яднанні. Яны атрымалі інфармацыю па такіх тэмах, як: “Народны лячэбнік”, “Здаровы лад жыцця”, “Экалагічнае выхаванне”, “Клопат. Дабрыня. Міласэрнасць”, “Калі спявае душа”, “Тым, хто не жадае старэць”, “Выпускнікам і абітурыентам”, “Фальклор. Этнаграфія. Народныя звычаі”, “Сацыяльнае абслугоўванне. Састарэлыя людзі. Інваліды”, “Любаншчына на старонках рэспубліканскага друку” і інш.

На індывідуальнае інфармаванне бібліятэкамі Мінскага раёна было ўзята 45 абанентаў, якія атрымлівалі інфармацыю па тэмах “Цветы – смысл жизни”, “Автослесарные работы”,“Воспитание детей в дошкольных учреждениях”, “Новае ў заканадаўстве ў галіне культуры IV кв. 2019г. – пачатак 2020 г.”, “Беларуская спадчына – край Заслаўскі”, “Поделки своими руками”, “Изделия из фетра,

фаомирана”, “Гісторыя Айчыны”, “Цветоводство”, “Мой агарод”, “Белорусский фольклор”, “Современная белорусская проза”, “Беларусь: учора, сёння, заўтра”, “Гісторыя сусветнай культуры і культуры Беларусі”, “Кнігі для маленькіх прафесароў”, “Экологическое воспитание учащихся начальных классов”, “Званы Хатыні”, “Сябруем са спортам”, “Вусная народная творчасць” і інш. На групавое інфармаванне ўзята 42 абаненты па тэмах: “История: имена, события, факты”, “Галерея новых поступлений”, “Здоровье – драгоценность твоей жизни”, “Творы літаратуры і мастацтва – дзецям”, “Школа – ведущее звено воспитания современного человека”, “Я жыву на зямле Заслаўскай”, “Мир вокруг нас”, “Воспитание и обучение детей дошкольного возраста”, “Дашкольная асвета, дашкольнае выхаванне”, “Прафесійная адукацыя”, “Музычная адукацыя ў выхаванні школьнікаў”, “Новыя паступленні ў бібліятэку”, “Секреты здоровья и долголетия” і інш.

ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка” адпраўлялі для абанентаў спісы новых паступленняў па тэмах: ”Новая літаратура ў дапамогу навучальнаму працэсу”, “Добрыя парады для вашага здароўя” і інш.

На працягу года сетка публічных бібліятэк Смалявіцкага раёна інфармавала індывідуальных і групавых абанентаў па тэмах: “Работа с кадрами.”, “Новое в библиотечном деле”, “Охрана труда в библиотеке”, “Новые формы обслуживания читателей”, “Формирование и развитие мелкой моторики у детей”, “Ветеранское движение. Волонтерство. Патриотическое воспитание”, “Развитие туризма в районе”, “Методы работы на уроках белорусского языка и литературы”, “ Шестой школьный день”, “Выращивание цветов и овощей на приусадебном участке”, “Инновации в библиотечном деле” і інш.

На індывідуальнае інфармаванне ДУК “Салігорская цэнтральная раённая бібліятэка” ўзята 78 абанентаў па 71 тэме: “Выхаванне дзяцей. Псіхалагічныя аспекты”, “Кветкаводства”, “Рукадзелле”, “Дапамажы сабе сам”, “Садовы дызайн”, “Вадаёмы: тэхналогія, расліны, дызайн”, “Новае ў беларускай паэзіі і прозе”, "Нетрадыцыйныя метады аздараўлення”, “Каб стаў утульным дом”, “На заметку садоўніку і агародніку”, “Зямецтва”, “Сусветная мастацкая культура”, “Новыя дакументы па пытаннях развіцця клубных устаноў” і інш. Прадастаўлена 293 інфармацыі. На калектыўнае інфармаванне ўзята 113 абанентаў па 44 тэмах:

“Новая літаратура ў дапамогу навучальнаму працэсу”, “Кулінарыя. Грамадскае харчаванне”, “Служба быту ў Беларусі”, “Гандаль. Камерцыйная дзейнасць”, “У дапамогу медыцынскаму работніку”, “Новая літаратура ў дапамогу эканамісту і бухгалтару”, “Новая літаратура па сельскай гаспадарцы”, “У дапамогу жывёлаводам” і інш. Прадастаўлена 390 інфармацый.

ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка” праводзіць інфармаванне насельніцтва праз выставы новых паступленняў, гадзіны інфармацыі, групавое і індывідуальнае інфармаванне. Абанентамі групавога інфармавання звычайна з’яўляюцца школы, дзіцячыя сады, групы спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Тэмы групавога інфармавання адпавядаюць напрамку дзейнасці ўстаноў: “Новая літаратура па культуры і мастацтву”, “Турызм”, “Озеленение приусадебных участков”, “Декоративно-прикладное искусство”, “Мастацтва”, “Псіхалогія”, “Этнаграфія”, “Праца з кадрамі”.

Абаненты групавога і індывідуальнага інфармавання ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка” атрымлівалі інфармацыю па тэмах: “Давайце чытаць разам”, “SMS: События. Мнения. Сообщения.” “Профессиональное самоопределение – условие успешной социализации личности!”, “Выхаванне культуры ва ўсіх яе праявах”, “Новыя ідэі для хатняй гаспадыні.”, “Роль семьи в правильном профессиональном самоопределении ребёнка”, “Псіхалагічная дапамога дзецям “групы рызыкі”, “Псіхалагічны дабрабыт першакласніка”, “Роля школьнага музея ў фарміраванні грамадзянскай і патрыятычнай самарэалізацыі на прыкладзе дзейнасці школьнага музея”, “Стварэнне віртуальнага музея”.

На індывідуальным інфармаванні ў ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса знаходзяцца 6 абанентаў па тэмах: “Сучасная беларуская літаратура”, “Беларусь на сучасным этапе”, “Дашкольная педагогіка”, “Літаратуразнаўства”, “Сусветная мастацкая культура”, “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”, “Заканадаўства РБ”, “Сямейнае права”. Абанентамі індывідуальнага інфармавання з’яўляюцца кіруючыя работнікі, спецыялісты ў галіне культуры, аматары чытання. Групавое інфармаванне ажыццяўлялася праз складанне штоквартальных спісаў для 4 абанентаў па 13 тэмах: “Дашкольная педагогіка”, “Дашкольнае выхаванне”, “Дзіцячая псіхалогія”, “Школьная педагогіка”, “Псіхалогія школьніка”, “Арганізацыя вольнага часу”,

“Методыкі выкладання асобных прадметаў, “Мастацтва: жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, музыка, харэаграфія”, “Методыка выкладання мастацтва”, “Арганізацыя вольнага часу”, “Краязнаўства”, “Музейная справа”, “Гісторыя Беларусі”.

ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” мае на індывідуальным інфармаванні 22 абанента па 18 тэмах. Даслана 140 інфармацый па тэмах: “Мастацтва відовішчаў. Масавыя забавы, гульні”, “Хатняя ферма”, “Картофелеводство”, “Работа з дзецьмі па ўсебаковаму развіццю” і інш. На групавым інфармаванні знаходзілася 6 калектываў па 7 тэмах, даслана 59 інфармацый. У ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” на індывідуальнае інфармаванне ўзята 10 абанентаў па 10 тэмах. Даслана 170 інфармацый.

Бібліятэкі вобласці працягваюць дзейнасць па прапагандзе бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў. У Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х. Каладзеева традыцыйная форма бібліяграфічнага агляда сёлета змянілася. Быў выпушчаны цыкл відэаааглядаў: «Путешествие на диване, или Дома лучше”, «Про усатых и хвостатых”, «Путешествие со вкусом” і інш.

Сельскімі інтэграванымі бібліятэкамі аграгарадкоў Бярэзінскага раёна у рамках асветніцка-інфармацыйнай работы са школьнікамі былі праведзены мерапрыемствы да 75-годдзя Перамогі: бібліяграфічныя агляды “Вялікая Айчынная вайна ў творах сучасных беларускіх пісьменнікаў”, “Напісана вайной – увекавечана літаратурай”, “Вайну абвінавачвае пісьменнік-франтавік”, “Кнігі – манументы памяці. Для школьнікаў горада Беразіно праведзены ўрокі ББВ, “Даведачна-энцыклапедычная літаратура”, “Структура кнігі і выкарыстанне яе даведачнага апарата”, “Перыядычныя выданні для моладзі і падлеткаў”, дзень адчыненых дзвярэй для 9-х класаў горада “Гэта твая бібліятэка”.

ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” з мэтай прапаганды бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў праводзіліся Дні інфармацыі: “Абитуриенту-2020, “По новым поступлениям литературы”, урокі бібліятэчна-інфармацыйнай пісьменнасці “СБА библиотеки – ключ к информации”, “Роль каталогов и картотек в многоаспектном раскрытии фонда библиотеки и выборе литературы”, “Самостоятельный поиск в информационных ресурсах библиотеки”, “Книга и компьютер. Ресурсы Интернет”.

ДУ "Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка" было праведзена 37 Дзён бібліяграфіі: "Клецкая зямля гісторыяй багата. Краязнаўчая картатэка", "Пісьменнікі Клецкага раёна", "Добро пожаловать, в книжную Вселенную", "Искусство быть читателем", "Твае першыя кнігі", "Говорит и показывает библиотека", "Тысячи мудрых страниц", "В книжном царстве очутиться, да чтоб там не заблудиться", "Асветнікі Беларусі", "Знаёмства з бібліятэкай", "Газеты і часопісы для разумовага развіцця", "Разговор со словарями" і інш. Бібліятэкі раёна на працягу года вялі прапаганду бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў сярод навучэнцаў школ. Праведзена 19 аглядаў бібліяграфічных дапаможнікаў, 82 урокі бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў: "Почемучкины книги", «Волшебный мир библиотек", «Компас в мире литературы", «Асновы інфармацыйнай культуры", "Я ведаю усё!", «Что такое библиография?" і інш. На працягу года складаліся буклеты, інфармацыйныя і рэкамендацыйныя спісы: "Арсенал", "Беларусь помнит", "Библиотечный навигатор", "В огне написанное слово" і інш.

З мэтай прапаганды бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў ДУК "Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі" былі распрацаваны бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі «О книге и библиотеке", «Что такое библиотечный каталог", «Словари, справочники, энциклопедии", інтэлектуальная гульня, прысвечаная кнігам і бібліятэкам "Бібліятэчны калейдаскоп".

Для фарміравання інфармацыйнай культуры ў сістэме публічных бібліятэк Мінскага раёну праводзіліся экскурсіі, бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі, гутаркі пра культуру чытання. Тэматыка такіх мерапрыемстваў: "Откроем бережно страницы", "Как стать настоящим читателем", "Удивительный мир библиотеки", "Как обращаться с книгой", "Стань читателем, дружок", "В каждой избушке – свои игрушки", "Путешествие в Читай-город", "Есть такое в свете чудо", "Приглашаем записаться в читатели", "Библиотека – окно в мир", "Книги бывают разные: из истории книги и библиотеки", "С книгой будем мы дружить – в библиотеку приходить", "Твае першыя энцыклапедыі", "Профессия вечная – библиотечная", "У гасцях у вечнасці", "Бібліятэка – храм ведаў", "Первые шаги в библиотеке", "Даведачная літаратура", "В царстве книжном очутиться, да чтоб там не заблудиться", "Почемучкины книжки", "Счастье быть читателем", "Читающее королевство", "Твае

дапаможнікі ў выбары кніг", "Нам всегда здесь рады", "Бібліятэка сустракае сяброў", "Учимся библиотечно-библиографической грамотности", і інш.

У ДУК "Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча" праведзена 128 бібліяграфічных аглядаў, 78 тэматычных праглядаў і праглядаў новай літаратуры: "Мая вёска – мае карані", "Разам з кнігамі – да новых ведаў", "Для вас, ребятишки, новые книжки", "Да вас прыйшла новая кніга", "Паклон беларускаму слову", "Время читать!", "Книги на любой вкус" і інш. Праводзіліся прэзентацыя рэкамендацыйнага бібліяграфічнага паказальніка "7 цудаў Маладзечаншчыны" і бібліяграфічныя гульні "Кто много читает, тот много знает", "На крутых виражах СБА", лабірынт-знаёмства "Где живёт ИНФОРМАЦИЯ?", кактэйль-агляд "Сколько б книг не прочитал, нет новее, чем журнал", бібліяграфічная гульня-квэст "Ключи к фонду библиотеки: каталоги и картотеки", часопісны бібліяфрэш "Журнальная карусель", кубік цудаў "БиблиоЦарство", школа будучага чытача "Читай-компания". Прайшло 19 Дзён бібліяграфіі: "Памятные даты в военной истории", "Район в потоке информации", "В мире книг", "Библиотека и читатель", "Справочное царство – мудрое государство", "Книга как источник знаний", "Краіна "Бібліяграфія", "Ужасно интересно всё то, что неизвестно!", "Промні асветніцтва", "Библиографический лабиринт", "На ваши "Что?" и "Когда?" умные книги ответят всегда", "Экологические лабиринты фонда" і інш.

ДУ "Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка" было праведзена 203 бібліятэчныя заняткі і 43 дні бібліяграфіі: "Інфармацыйны арыентыр", "На бібліятэчнай хвалі", "Шукайце мудрасць у слоўніках", "Ориентир: библиотечное порстранство читателям: СБА библиотеки", "Встреча на лесной полянке", "От поиска к познанию: СБА библиотеки", "Справочная литература – копилка знаний", "Незаменимые помощники – энциклопедии, словари", "Каталог – корабль в мире книг", "Книги эти обо всём на свете", "Путешествие по литературным улицам библиотеки, "Тысячи мудрых страниц", "У свет інфармацыі праз бібліятэку", "Библиографический калейдоскоп", "Вселенная от А до Я", "Что такое СБА и зачем он нужен", "Ты вучыся, а мы дапаможам!", "Главный спутник любознательных", "В мир библиографии с библиотекой", "Мир открывает тайны", "Твой сябар – кніга: правілы карыстання кнігай", "Во глубине веков: з гісторыі

бібліятэк", "Па старонках даведачнай літаратуры", "Бібліятэчныя каталогі як інфармацыйна пошукавая сістэма", "Полезные книги для умников и умниц", "Каталоги и картотеки – твои друзья и помощники", "Листайте нас, читайте нас, и мы всему научим вас", "В книжном царстве – каталожном государстве", "Информация и знания – здесь и сейчас", "Каталоги и картотеки в нашей библиотеке" і інш.

Традыцыйнымі формамі распаўсюджвання бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў ДУК "Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка" раёна былі экскурсіі, бібліятэчна-бібліяграфічныя ўрокі на тэмы: "Кніжныя навінкі для ўсіх і кожнага" , "Твае арыентыры ў бібліятэцы", "Библиотека – молодым читателям: ресурсы, услуги"; дзень адчыненых дзвярэй "Библиотека – место, где чтение уместно".

Супрацоўнікі ДУК "Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка" ўсё часцей уключаюць у праграму бібліятэчных урокаў комплексныя, інтэрактыўныя формы: Дні бібліяграфіі, бібліяграфічныя агляды, прэзентацыі бібліяграфічных дапаможнікаў: "Стаўбцоўскі раён у патоку інфармацыі", кніжнае кафэ "Дэгустацыя літаратурных навінак", пошукавая экспедыцыя "Человек читающий – человек успешный". У мэтах прапаганды бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў праводзіліся індывідуальныя кансультацыі каля каталогаў і картатэк: бібліятэчны ўрок "Чудесный лекарь наших душ", "Из журналов этих узнаем всё на свете", "Путешествие по страницам детских журналов", "Чытанне у падарунак маме", "Ты і твая бібліятэка", "Вы яшчэ не чытаеце – тады мы ідзем да вас", "Открываем книгу – открываем мир", "Хождение в книжное царство", "Особенности работы со справочными изданиями".

У мінулым годзе працягвалася праца бібліятэк па падрыхтоўцы бібліяграфічных выданняў. Бібліятэкарамі ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" складзена 3 тэматычныя бібліяграфічныя спісы: "Книга тоже воевала" – рэкамендацыйны спіс літаратуры да 75-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (Фаніпальская гарадская бібліятэка Дзяржынскага раёна), "О, труженик библиотечный! Ты превращаешь в вечность миг!", "Прочитайте книжки дочке и сынишке" – рекомендательный список литературы (ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма).

У ДУК "Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна" падрыхтаваны рэкамендацыйны бібліяграфічны спісак літаратуры

«Імя і справа Скарыны” да 530-годдзя з дня нараджэння першадрукара, асветніка-гуманіста, пісьменніка, грамадскага дзеяча Францыска Скарыны.

ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Я. Купалы” складзены рэкамендыцыйны спіс літаратуры “Дакраніся сэрцам да подзвігу: новая літаратура пра Вялікую Айчынную вайну”.

ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” была падрыхтавана бібліяграфічная і інфармацыйна-бібліяграфічная прадукцыя: рэкамендацыйныя спісы, спісы-агляды: “Юбілейны калейдаскоп кніг 2020”, “Кнігі-юбіляры – 2020” “Увага! Новыя паступленні!”, цыкл “Імёны, якія жывуць у вяках” да юбілеяў беларускіх асветнікаў, “Выдавецтва “Беларуская навука” прапануе…”, “Аматарам беларускай мастацкай літаратуры”, “Дзецям на роднай мове”, біябібліяграфічныя даведкі і спісы з серыі “Пісьменнікі-юбіляры”.

Выдавецкая дзейнасць ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” прадстаўлена бібліяграфічным спісам літаратуры “Бюлетэнь новых паступленняў”, рэкамендацыйным паказальнікам “В пламени Афганистана”, рэкамендацыйным спісам “15 топ лучших книг для молодёжи”, бібліяграфічным паказальнікам “Што чытаць аб Мінскім раёне ў друку 2020 года”.

Бібліятэкамі Нясвіжскага раёну падрыхтаваны рэкамендацыйныя спісы літаратуры: краязнаўчыя бібліяграфічныя спісы “Гісторыя Нясвіжа на старонках кніг” і “Рамантык нерамантычнай эпохі”: бібліяграфічны агляд жыцця і творчасці Уладзіміра Жылкі да 120-годдзя з дня нараджэння; анатаваны рэкамендацыйны спіс “Паэтычны свет Людмілы Рублеўскай”, анатаваны рэкамендацыйны спіс літаратуры “Мышкомания”, рэкамендацыйны спіс літаратуры да Дня сталага чалавека “О бабушках и дедушках на страницах книг”, рэкамендацыйны спіс-падарожжа па кнігах К. Хадасевіч-Лісавой “Смак роднай мовы”, рэкамендацыйныя спісы для бацькоў: “Опять учиться?!?: книги для тех, кто не хочет учиться” і “Семь причин записать ребёнка в библиотеку”.

За мінулы год ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка” былі выдадзены такія бібліяграфічныя выданні як: “Курение зло – откажись от него” – памятка-папярэджанне для тых хто курыць, “Знай правду живи трезво” – інфармацыйны буклет да Дня прафілактыкі алкагалізму, “Не дай себя убить” –

інфармацыйны буклет да Міжнароднага дня барацьбы з наркотыкамі.

ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” былі падрыхтаваны рэкамендацыйныя спісы літаратуры: “Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь”, “Вялікае княства Літоўскае: погляд праз стагоддзі: да 780-годдзя ўтварэння ВКЛ. ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” створаны бібліяграфічныя дапаможнікі малых форм: рэкамендацыйныя спісы, кніжныя закладкі: “Вехи памяти и славы”, “Ён жыў Беларуссю”, “Рамантычны рыцар чалавечнасці” (да 90-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча), “У кніжнай памяці – імгненні вайны” (да юбілею кнігі С. Алексіевіч “У вайны не жаночы твар”). Супрацоўнікі ўсіх бібліятэк-філіялаў падрыхтавалі біліяграфічныя цацкі да раённага агляду-конкурсу “Бібліяграфія з фантазіяй і выдумкай” на лепшы бібліяграфічны дапаможнік малых формаў, прысвечанага Году малой радзімы.

Сеткай публічных бібліятэк Смалявіцкага раёна складзены рэкамендацыйны спіс літаратуры “Вялікая Перамога ў іменах і датах”, інфармацыйнае выданне “Яны пісалі пра вайну”.

ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” падрыхтаваны інфармацыйна-бібліяграфічны дапаможнік серыі “Предприятия Солигорска”, інфармацыйны рэкамендацыйны паказальнік “Што чытаць аб Салігорску і Салігорскім раёне ў 2020 годзе”.

## Метадычная дзейнасць

Дзейнасць аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк вобласці ў 2020 годзе была накіравана на вывучэнне, распрацоўку і падтрымку сучасных перадавых напрамкаў у рабоце, павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў, умацаванне сувязей з грамадскасцю, стварэнне пазітыўнага іміджу бібліятэк.

У мінулым годзе публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці вялася работа па рэалізацыі праграм і праектаў, якія распрацаваны ў дапамогу павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў: міжнародны праект “Псковщина – Борисовщина: грани сотрудничества” (Барысаўскі раён); праграма “Мастерство и качество – путь к успеху” (Капыльскі раён); праграма “Ступені майстэрства” (Любанскі, Маладзечанскі раёны); праграма

“Библиолестница” (Мінскі раён); праект “Мастерство – путь к успеху” (Смалявіцкі раён).

Узровень прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў вызначае якасць і эффектыўнасць дзейнасці бібліятэк. Сістэматычна праводзяцца семінары, вэбінары, практыкумы, нарады, круглыя сталы, дні метадычнай дапамогі і інш. Так, у 2020 годзе былі праведзены семінары: “Общественная значимость и формы организации работы библиотек Борисовского региона как просветительского и социокультурного центра для жителей Борисовщины” (Барысаўскі раён); “Сучасныя інтэрактыўныя формы работы з непаўналетнімі па арганізацыі іх вольнага часу з арыентырам на здаровы лад жыцця і фарміраванне актыўных жыццёвых установак” (Бярэзінскі раён); “Адкрытая бібліятэка: новыя праекты і праграмы асваення сацыякультурнай прасторы” (Вілейскі раён); “Бібліятэчнае краязнаўства: тэрыторыя вялікіх магчымасцей і перспектыў” (Валожынскі раён); “Бібліяграфія – працэс творчы” (Дзяржынскі раён); “Песняры Беларусі сінявокай: работа бібліятэк па папулярызацыі беларускай літаратуры” (Клецкі раён); “Вольны час з карысцю: аматарскія аб’яднанні ў бібліятэцы як адна з форм арганізацыі вольнага часу” (Крупскі раён); “Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк на сучасным этапе: новыя задачы і новыя магчымасці” (Маладзечанскі раён); “Патрыятычнае выхаванне як частка дзяржаўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь” (Мінскі раён); “Планирование на 2021 год. Библиотеки и интернет-пространство” (Салігорскі раён); “Роль семейного чтения в жизни современной семьи и ребенка” (Старадарожскі раён); “Бібліятэрапія – іннавацыя ў дзейнасці бібліятэк” (Стаўбцоўскі раён); “Арганізацыя вольнага часу непаўналетніх ва ўстановах культуры” (Уздзенскі раён).

Адбыліся круглыя сталы: “Летняе чытанне для дзяцей і падлеткаў: праблемы, вопыт, перспектывы” (Клецкі раён); “Бібліятэка і царква ў сістэме духоўна-маральнага выхавання насельніцтва” (Крупскі раён), “Вынікі спаборніцтва бібліятэк раёна за 2019 год” (Любанскі раён); “Подросток и библиотека: профилактика безнадзорности и правонарушений среди несовершеннолетних” (Салігорскі раён); “Сацыяльнае партнёрства ў сучаснай бібліятэцы” (Стаўбцоўскі раён); “Летнее чтение: развитие и поддержка” (г. Жодзіна).

Наладжваліся практыкумы, у тым ліку і ў онлайн рэжыме: “Работа библиотек Борисовского региона по Государственной

программе “Здоровье народа и демографическая безопасность Республики Беларусь” (Барысаўскі раён); “Падтрымка і развіццё дзіцячага чытання” (Валожынскі раён); “Картатэкі як самастойная частка інфармацыйна-пошукавай сістэмы” (Клецкі раён); “Сервисы для онлайн-встреч – платформа Zoom” (Маладзечанскі раён); “Организация работы юношеского абонемента районной центральной библиотеки” (Салігорскі раён); “Работа бібліятэк па адраджэнні сямейнага чытання” (Стаўбцоўскі раён); “Вядзенне ўліковых дакументаў: фармуляр чытача, дзённікі работы” (Узденскі раён).

Сярод іншых форм павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў – кансультацыі, метадычныя парады, канферэнцыі, вэбінары і інш.

Павышэнню прафесійнага майстэрства маладых супрацоўнікаў і супрацоўнікаў без спецыяльнай адукацыі спрыяюць разнастайныя па тэматыцы адаптацыйныя заняткі, практыкумы, пасяджэнні ў “Школе пачынаючага бібліятэкара”, “Школе маладога бібліятэкара”, “Ступені майстэрства”, “Школе камп’ютарных ведаў”, “Школе маладога спецыяліста”, “Альтэрнатыўнай школе бібліятэкара”, на “Факультэце бібліятэчных ведаў”.

З мэтай вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў і ўдасканальвання іх абслугоўвання ў бібліятэках вобласці на працягу справаздачнага года праводзіліся сацыялагічныя і маркетынгавыя даследаванні, анкетаванні і апытанні: “Бібліятэка – погляд моладзі” (Валожынскі раён); “Жыццёвыя прыярытэты і чытанне моладзі”, (Крупскі раён); “Моладзь і мастацкая літаратура” (Маладзечанскі раён).

Пазітыўны ўплыў на стан бібліятэчнай справы ў раёне аказвае выдавецкая дзейнасць. У дапамогу бібліятэкарам складаюцца метадычныя рэкамендацыі, парады і дапаможнікі, сцэнарыі да юбілеяў пісьменнікаў і г.д. Так, у 2020 годзе былі выдадзены наступныя метадычныя рэкамендацыі: “Інтэрактыўныя формы і метады ў рабоце бібліятэкі” (Валожынскі раён); “Бібліятэка – тэрыторыя моладзі” (Крупскі раён); “Бібліятэка і сям’я: формы ўзаемадзеяння” (Лагойскі раён); “У дапамогу складання справаздачы і гадавых планаў работы бібліятэк” (Мінскі раён); “Библиотеки в виртуальном пространстве” (Салігорскі раён). На працягу мінулага года ажыццяўляўся выпуск прафесійных інфармацыйных зборнікаў: “Бібліятэчны калейдаскоп” (Валожынскі раён); “Бібліякалейдаскоп: жыццё бібліятэк Пухавіччыны” (Пухавіцкі раён); “Бібліядайджэст”

(Смалявіцкі раён); “Біблія-навіны” (Старадарожскі раён); “Справы бібліятэчныя” (Стаўбцоўскі раён); “Библиотека – проводник правовой культуры” (Уздзенскі раён).

Былі распрацаваны і выдадзены сцэнарыі да юбілеяў пісьменнікаў і дзеячаў культуры і навукі: да 80-годдзя народнай артысткі БССР, спявачкі І.С. Шыкуновай “Музыка – мая любоў” (Дзяржынскі раён); да 70-годдзя з дня нараджэння А Дударава “Галоўнае – сказаць праўду” (Лагойскі раён); да 80-годдзя з дня нараджэння паэта і празаіка Леаніда Дайнекі “Майстар беларускай гістарычнай прозы” (Маладзечанскі раён); да 100-годдзя з дня нараджэння А. Пысіна “Пяшчотаю прасветленае слова” (Старадарожскі раён).

Вялікая ўвага надаецца выпуску буклетаў, брашур, закладак, памятак і лістовак для чытачоў бібліятэк: буклет “Меры профилактики детского травматизма в зимнее время”, памятка “Венец всех ценностей – семья” (Вілейскі раён); буклеты “Профилактика игровой зависимости у несовершеннолетних”, “Польза “вредных” продуктов” (Дзяржынскі раён); памятка “Безопасность в Интернете”, закладка “Добрая дорога детства” (г. Жодзіна); памятка “Выбери жизнь, свободную от вредных привычек” (Крупскі раён); буклет “Опасно, снюс!” (Лагойскі раён); буклет “Советы родителям”, лістоўкі “Правила поведения при пожаре в лесу”, “Коронавирус. Что надо знать” (Любанскі раён); буклет “Безопасный интернет-детям”, памятка “Как предотвратить детско-подростковый суицид” (Мінскі раён); буклет “Алкоголю скажем “Нет”!!!” (Мядзельскі раён); брашура “Что вы читаете”, буклет “Наркотики? Скажи – НЕТ!” (Несвіжскі раён); буклет “Решай сегодня, каким ты будешь завтра!” (Пухавіцкі раён); буклет “Дорога в храм здоровья” (Смалявіцкі раён); буклет “7 способов избавиться от компьютерной зависимости” (Салігорскі раён); лістоўка “Безопасный интернет”, буклет “Красная ленточка – международный символ борьбы со СПИДоМ” (Стаўбцоўскі раён); буклет “Бесконфликтное общение родителей с подростком”, памятка “Здоровая семья – залог успеха в жизни!” (Узденскі раён).

Станоўчую ролю ў стымуляванні работы бібліятэк адыгрывае штогодні рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”. Прызёрамі XXVIII конкурсу сталі: у намінацыі “За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем” – ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”

(дыплом трэцяй ступені); у намінацыі “За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы” – ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” (дыплом другой ступені), Грабянецкая бібліятэка-клуб ДУ “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” (дыплом трэцяй ступені); у намінацыі “За падтрымку і развіцце чытання” – ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы” (дыплом першай ступені).

Публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці таксама адзначаны на VI Рэспубліканскім конкурсе “Библиотека – центр духовно-нравственного просвещения и воспитания”: праца ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” заняла другое месца ў намінацыі “Духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі”.

Станоўчую ролю ў стымуляванні работы бібліятэк адыгрываюць штогадовыя раённыя прафесійныя агляды-конкурсы. У 2020 годзе былі арганізаваны і праведзены: агляд-конкурс кніжных выстаў “В книжной памяти мгновения войны” (Бырысаўскі раён); агляд-конкурс “Бібліятэка, дружалюбная дзецям” (Бярэзінскі раён); агляд-конкурс на лепшую кніжную выставу, выставу-экспазіцыю “Памяць, увекавечаная ў кнігах” (Валожынскі раён); агляд-конкурс на лепшую кніжную выставу ў рамках Года малой радзімы “Якой я бачу Беларусь” (Крупскі раён); конкурс на лепшую работу аматарскіх аб’яднанняў “Любительское объединение в библиотеке – территория увлечения” (Любанскі раён); агляд-конкурс на лепшую рэкламу сваёй бібліятэкі (Маладзечанскі раён); конкурс на лепшае расказванне казак “Путешествие в страну детства” (Нясвіжскі раён); агляд-конкурс на лепшы бібліяграфічны дапаможнік малых формаў “Бібліяграфія з фантазіяй і выдумкай” (Слуцкі раён); конкурс на лепшае аматарскае аб’яднанне “Привлекая, увлекать” (Смалявіцкі раён); конкурс-агляд на лепшае краязнаўчае мерапрыемства аб выдатнай асобе свайго краю “Нам есць кім ганарыцца” (Старадарожскі раён); конкурс на лепшую пастаноўку работы аматарскіх клубаў для дзяцей “Дзяцінства – зона асаблівай увагі” (Узденскі раён).

Такім чынам трэба адзначыць, што метадычная дзейнасць, накіраваная на аказанне тэарэтычнай і практычнай дапамогі бібліятэкам Міншчыны, шматбаковая і эфектыўная, а таму формы работы дзеля дасягнення станоўчых вынікаў штогод удасканальваюцца і пашыраюцца.

**Бібліятэкі Міншчыны ў 2020 годзе: агляд дзейнасці**

**Складальнікі:** Анацка В.Л.
Барахоўская М.В
Вярхоўская К.Д.
Гіль В.М.
Лазарава І.П.
Несцярэнка А.Г.
Усцінаў П.А.

Падпісана да друку: 18.03.2021 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 3

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»